# СПАДЧЫНА
# № 4/2002

## Тэма нумару: **Прыватная ўласнасьць**

У НУМАРЫ


"Дай мне булку на паўзлоты, ды прыпраў мне селядца...". Сьціплая рыбка таксама можа быць сымбалем беларускай культуры, сьцвярджае Алесь Белы ў кароткім нарысе гісторыі селядцоў у Беларусі.

Граф зь піўной этыкеткі, або Пераўтваральнік Менску. Захар Шыбека аналізуе дзейнасьць самага славутага з выбарных кіраўнікоў менскай гарадской адміністрацыі графа Караля Чапскага.

Прыбытак ці ўратаваньне душы? Ігар Марзалюк - пра крэдыт і ліхвярства ў Беларусі XVI-XVII стст.

"Панамі будзеце, панамі!"... Андранік Антанян і Алесь Белы спрабуюць узнавіць маршрут дзядзькі Антося па Вільні, а таксама высьветліць, навошта ён туды езьдзіў і ці езьдзіў увогуле.

Беларусь на вузкай каляіне. Андрэй Кіштымаў вяртае з нябыту імя інжынера Баляслава Ялавецкага, будаўніка чыгункі Сьвянцяны-Беразьвеч.

Сьвянцянская вузкакалейка ў Інтэрнэце

Казімір Шафнагель і ягоны зварот "Да нашай краёвай інтэлігенцыі". Алесь Смалянчук - пра спробу аднаго з "краёўцаў" знайсьці сваё месца ў беларускім руху ў 1918 г.

"За вольнасьць і больш заплацяць..." Ірына Кітурка - пра супярэчнасьць рэформаў Тызэнгаўза і пра магчымыя альтэрнатывы ім.

Арганізацыя найманых аддзелаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV-XVI стст. рэканструяваная Юрасём Боханам.

Над дахамі Віцебска. Захар Шыбека спрабуе ўбачыць віцебскія цэхі канца XIX ст. вачыма Марка Шагала.

Пад патранатам Сьвятога Мікалая. Анатоль Цітоў - пра віцебскія цэхі ў дарасейскі перыяд.

Дзе маліліся віцебскія майстры? Ігар Цішкін лакалізуе віцебскую царкву Сьвятога Мікалая "у рынку".

Новыя кнгігі

Рэцэнзіі і анатацыі

Слова рэдактара


Спадчына 4/2002. Новы, хаця і запозьнены, нумар "Спадчыны", новага фармату і стылістыкі, надзвычай багаты на ілюстрацыі, мае тэму "Прыватная ўласнасьць". Большасьць матэрыялаў спрабуюць змадэляваць "буржуазную Беларусь" і зрэвізаваць апошняе стагодзьдзе гісторыі краю, абраўшы за пункт адліку 1902 г. - год заснаваньня Грамады і меркаванае сьмерці Міхала Мацкевіча, прататыпа Міхала з "Новае зямлі". 96 с.

# Прыватная ўласнасць

100 гадоў таму, амаль адначасова і нібыта без аніякай вонкавай сувязі паміж сабой, адбыліся дзве падзеі. У лютым 1902 г. (паводле іншых звестак, 1903 г.) памёр Міхал Міцкевіч, бацька Якуба Коласа і прататып Міхала з "Новай Зямлі". Узімку 1902–1903 гг. з некалькіх студэнцкіх гурткоў Вільні, Менска і Пецярбурга ўтварылася арганізацыя, якая паспрабавала канкрэтна аформіць малаакрэсленую дагэтуль беларускую нацыянальную ідэю. Першая беларуская палітычная партыя, паводле ўласнага вызначэння, партыя "беларускага працавітага народа" мела сваёй канчатковай мэтай знішчэнне капіталістычнага ладу і пераход ў грамадскую ўласнасць зямлі, сродкаў вытворчасці і камунікацыяў.

Ці можна сказаць, што ўтварэнне Беларускай Рэвалюцыйнай (пазней паслядоўна Сацыялістычнай, Народнай, Сялянска-Рабочай, Сацыял-Дэмакратычнай 5 розных гатункаў) Грамады ў 1902 невыпадкова супадае па часе са смерцю Міхала Міцкевіча і зруйнаваннем ягонае мары дамагчыся для сябе прыватнаўладальніцкага дробнабуржуазнага шчасця? Што гэтая акцыя, па сутнасці, была менавіта адказам на смерць Міхала: "Мы пойдзем іншым шляхам !" Здаецца, мы дагэтуль крочым шляхам, абраным 100 гадоў таму. Таму ў гэтым нумары падзеям 100-гадовай даўніны нададзеная найбольшая ўвага. Магчыма, 1902 год, бедны на яскравыя падзеі – адзін з ключавых у гісторыі Беларусі?

Прагрэсіўныя інтэлектуалы пачатку XX ст. мелі шырокую эрудыцыю. Ніводная найноўшая гуманітарная тэорыя не мінала іхняе ўвагі. Малаверагодна, каб хто-небудзь з іх асабіста ведаў Міхала Міцкевіча. Але, безумоўна, яны ведалі многіх іншых, такіх як ён, хто спрабаваў выбіцца з нястачы і татальнай залежнасці ад моцных гэтага свету, набыўшы ўласную зямлю. Ведалі, але катэгарычна не прымалі іх спробы дабіцца асабістага дабрабыту і асабістай годнасці незалежна ад грамады.

Прыватная ўласнасць – гэта не сукупнасць запісаў на паперы. Гэта структура свядомасці, ідэя, якае матэрыялізуецца толькі тады, калі ў яе верыць крытычная маса людзей. Людзей, гатовых бараніць сваё і ў той жа час паважаць чужое. Інстытут прыватнай уласнасці заходнееўрапейскага тыпу, якая перадаецца легітымным шляхам – праз куплю-продаж, падарунак, але перадусім у спадчыну, выпрацоўваўся ў нашым краі павольна і балюча, пачынаючы ад аўтарытарных зямельных наданняў Вітаўта і пазнейшых прывілеяў, якія замацавалі за паўнапраўнымі грамадзянамі невядомы азіяцкім краінам імунітэт. Цягам некалькіх стагоддзяў, праз канфіскацыі, эксдывізіі і секвестры, рэформу 1861 г. і яе мясцовыя мураўёўскія "ўдакладненні" пасля падаўлення авантурнага паўстання, праз шматлікія абмежаванні праў уласнасці для розных саслоўяў і канфесіяў, ідэя ўласнасці да пачатку Першай сусветнай вайны пашырылася па ўсёй краіне, на выхадцаў з розных сацыяльных пластоў і моўна-канфесійных групаў.

На жаль, фарміраванне сучаснай беларускай культуры, беларускай "парадыгмы" ў 1902–2002 гг. адбылося пад сцягам бязлітаснага змагання з паняццем прыватнай уласнасці і, аўтаматычна, з аўтаноміяй асобы. Кананічны герой беларускіх Літаратуры і Мастацтва апошняга стагоддзя – гэта ні ў якім разе не ўласнік, не чалавек, які прадае і купляе, які ўступае з навакольным светам у раўнапраўныя рынкавыя адносіны і нясе адказнасць за ўласныя ўчынкі. Уласцівыя класічнай заходняй цывілізацыі кампетэнтнасць адміністрацыі, павага да права, трываласць працэдураў – далёка не прыярытэт у сістэме каардынатаў, выпрацаванай беларускай свядомасцю за апошняе

стагодзе. Але ці заўжды рэальныя беларусы адпавядалі гэтым канонам? Ці заўжды будуць адпавядаць?

Гэты нумар – не толькі зварот да мінулага, але і спроба ўявіць, як магла бы выглядаць Беларусь, калі б ідэёлагі яе Адраджэння 100 гадоў таму былі больш разважлівымі і дакладнымі, фармулюючы нацыянальную сістэму каштоўнасцяў. Наколькі нас звязваюць выпрацаваныя імі культурныя правілы ды стэрэатыпы свядомасці?

***Алесь БЕЛЫ***

# “Дай мне булку на паўзлоты, ды прыпраў мне селядца...”

***Алесь БЕЛЫ***

***(Менск)***

Кажучы пра “адраджэнне беларускай культуры”, звычайна маюць на ўвазе нейкія “вялікія рэчы” і “вялікія справы”. Але ці ж не ёсць прыкметамі нармальнай нацыі менавіта рэчы простыя, звычайныя? Непрыкметныя, несвядомыя ці падсвядомыя дробязі, якія сваімі традыцыямі сягаюць у часы нашай дзяржаўнай самастойнасці, калі наша культура не была ўніфікаваная з расейшчынай і “саўком”? Далягляды некалькіх “карэнных пераломаў” аддзяляюць ад нас гэтыя незваротныя часы, але, магчыма, яшчэ ў нашых сілах уваскрасіць годныя традыцыі?

Ці існуюць нейкія асаблівыя “беларускія” селядцы? З гледзішча дыетолага ці іхтыёлага, “нашыя” селядцы нічым не розняцца ад тых, якіх ядуць жыхары Расеі, Польшчы ці Прыбалтыкі. На іхныя і нашыя сталы, як і 5 ці нават 7 стагоддзяў таму, селядцы трапляюць з Балтыкі ці Паўночнай Атлантыкі. Па “нацыянальнасці” нашы селядцы заўжды былі рачэй нямецкімі, галандскімі, шведскімі ці шатландскімі. Рэч у іншым: доўгі час гэтая сціплая рыба займала знакавае, сімвалічнае месца ў нашай кулінарыі а нават у эканоміцы. Гэтая сімвалічнасць пакінула сляды і ў выяўленчым мастацтве, і ў літаратуры. Вось у гэтым сэнсе і можна казаць пра “беларускага селядца” – не як пра біялагічнае паняцце, а як пра культурны феномен.

> Мой дзед не знайшоў нічога лепшага, як з самога дзяцінства ўладкаваць свайго старэйшага сына рассыльным да гандляра селядцамі... Канешне, ў рассыльных бацька не застаўся, але за трыццаць два гады не пайшоў далей за рабочага. Ён перацягваў аграмадныя бочкі, і маё сэрца трэскалася, калі бачыў, як ён варушыць гэты цяжар ці дастае селядцы з лёку адубелымі рукамі. А тлусты гаспадар стаіць побач як пудзіла. Вопратка бацькі была вечна запырсканая лёкам. Бліскучыя лускавінкі так і сыпаліся ва ўсе бакі. Калі-некалі ж ягоны твар, то змярцвела, то жаўтавата-бледны, асвятляўся слабой усмешкай. Марк Шагал, “Маё жыццё”

Селядзец з алеем і цыбуляй, які і сёння, як 200 ці 300 гадоў таму, застаецца ці не самай даступнай закускай нашых “корчмаў” – спрошчаны, калі не сказаць прафанаваны, варыянт “культавых” польскіх ды літоўскіх страваў. Можна сказаць, калі мы ямо – у рэстаране ці дома – такі селядзец, мы несвядома працягваем традыцыю, закладзеную яшчэ ў часы Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай. Але ці існуе агульнапрызнаны стандарт “беларускага селядца”? Асацыяцыя беларускіх кулінараў, чыста адміністратыўнае падраздзяленне Міністэрства гандлю, якое выдае абавязковыя для кожнага рэстарану ды кавярні “Сборники рецептур белорусских блюд” (без гэтага прадпісанага рэверансу “нацыянальнаму” чыноўнікі наўрад ці дазволяць адчыніць у нас які-кольвечы “пункт грамадскага харчавання”), не бярэ да галавы такія дробязі. Хто б мог сачыць за захаваннем сапраўдных нацыянальных традыцый? Акадэмічны Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, які справядлівей было б назваць Міністэрствам Марксісцкай Этнаграфіі? Яшчэ меней рэканструкцыя нацыянальнай кулінарыі абыходзіць энтузіястаў гэтак званага “трэцяга сектару” – у якіх зусім іншыя інтарэсы, чые кафкіянскія арганізацыі ствараюцца для рэалізацыі праграмаў,

распрацаваных немаведама як далёка ад Беларусі, ананімнымі і таму неаспрэчнымі аўтарытэтамі з колаў хай міжнароднага, але таксама чынавенства.

> Каб зразумець, што такое “нацыянальны селядзец”, дастаткова прайсціся па польскіх “кнайпах”. “Селядзец па-польску” – з адмысловым соўсам з цыбулі, смятанкі і лімоннага соку – адна з фірмовых страваў польскай кухні, своеасаблівая візітоўка краіны. *Herring* – сусветна вядомая страва. Яшчэ адны нашы суседзі, літоўцы, таксама імкнуцца да таго, каб слова *silkė* было зразумелае замежным турыстам без перакладу і азначала не “селядзец увогуле”, а “традыцыйны літоўскі селядзец”. Самая папулярная страва ў літоўскім грамадскім харчаванні - *Silkė káimiškai* (селядзец па-вясковаму: салёны, з тушанай морквай ды цыбуляй). Ці проста селядзец з варанай бульбай. Ці хатняга марынаду: шмат цыбулі, перац гарошкам, яблычны воцат і бабкі (лаўровае лісце).
> Дзе крыніцы традыцыяў беларускай кулінарыі ды гастранаміі? Ці сапраўды *каўбаскі па-магілёўску* былі вынайдзеныя менавіта ў Магілёве, а *фаршыраваная пячонка па-гомельску* ў Гомелі? Калі гэта сапраўды традыцыі, дык хто і калі іх зафіксаваў? Сумневы непазбежныя, бо “нацыянальная” кухня – як, зрэшты, балет, кінематограф і шмат яшчэ якія з'явы культуры, на працягу апошняга стагоддзя стваралася ў нас пераважна адміністратыўным спосабам, на загад “згары”, каб адбыць нумар, каб паны-таварышы адчапіліся і пакінулі ў спакоі.

Часта бывае вельмі цяжка аддзяліць беларускую кулінарыю ад польскай, літоўскай ці яўрэйскай. Традыцыі ўсіх гэтых кухняў цесна пераплеценыя. Калі хтосьці з народаў былой Рэчы Паспалітай рабіў нейкае вынаходніцтва ў кулінарыі, яно праз пэўны час амаль непазбежна трапляла і да іншых. Так адбылося, напрыклад, з халаднікам – стравай, вынайдзенай у ВКЛ, недзе на беларуска-літоўскім памежжы. Спачатку палякі кпілі з яго, лічачы стравай варварскай, “хлопскай”. Але недзе з XVIII ст. *chłodnik litewski* стала прапісаўся і ў польскай кулінарыі. Селядзец таксама “агульнапольская” з’ява – маючы на ўвазе не вялікапольскі шавінізм, а агульныя традыцыі тых сучасных народаў, якія выйшлі з Рэчы Паспалітай. Якая са старадаўніх страваў з селядца “самая нашая” – селядзец з цяляцінай, селядзец смажаны ды паніраваны, бульба, фаршыраваная селядцом, катлеты з селядца, яешня з селядцом? Адказ на гэтае пытанне не мусіць быць адвольны – каб адказаць аргументавана, патрэбная вялікая даследніцкая праца.

Мода на селядцоў найперш апанавала палякаў, бо яны мелі выхад да мора. Але і нашыя продкі пазнаёміліся са смакам балтыйскага селядца таксама досыць рана – яшчэ ў паганскія часы. Пэўны час фактычную манаполію на прамысловы лоў і гандаль селядцамі на Балтыцы мела нямецкая Ганза, якая трымала сваю факторыю і ў нашым Полацку. Дзвіна і была тым першым шляхам, па якім селядцы праз Рыгу траплялі на Беларусь. А пазней таксама і па Нёмане, з Усходняй Прусіі. Адзінае, што два стагоддзі, XIII і XIV, падчас амаль бесперапынных войнаў з крыжакамі, гэты імпарт быў нестабільны. Толькі пасля перамогі пад Грунвальдам, калі вайна з немцамі на доўгі час саступіла месца міру, імпарт селядцоў набыў стабільны характар. Нездарма М. Улашчык адзначае, як у 1916 г., калі немцы перарэзалі ўсе выхады да балтыйскага гандлю, селядцы ў беларускай вёсцы звяліся. І дагэтуль селядцы трапляюць да нас галоўным чынам з былога Кёнігсберга–Караляўца, Рыгі ды Лібавы–Ліепаі.

Чаму менавіта селядзец, а не якая-небудзь іншая рыба, набыў такую вялікую папулярнасць? Проста таму, што гэта самая распаўсюджаная на Балтыцы і ў Паўночным моры і досыць лёгкая ў здабычы рыба. Легенда прыпісвае пэўнаму галандцу Вілему Бейкельсзону вынаходніцтва, каля 1350 г., спосабу хуткага патрашэння селядцоў, іх засолкі і вельмі шчыльнай укладкі ў бочкі проста на караблі. Адсюль і паходзіць выраз: "набіцца, як селядцы ў бочку". Такі спосаб рэзка зменшыў выдаткі на прамысловую здабычу, засолку і транспартаванне і зрабіў селядца рыбай надзвычай таннай, даступнай ледзь не кожнаму бедняку на Поўначы і Усходзе Еўропы. Таннасць селядцоў у нейкія даўнія, мо дарасейскія, часы падкрэслівае Дунін-Марцінкевіч:

А дзешавізна – усё ніпачом
Бывала, купіш селядца за шаг, –
Ледзь яго зможаш, аж вочы суздром…

У 1697 г., калі мінімальны штодзённы заробак наёмнага працаўніка ў Магілёве складаў 12–15 "асмакоў" – польскіх грошаў, самы танны селядзец каштаваў 2 "асмакі". То за штодзённы заробак некваліфікаванага гараджаніна можна было купіць 6–7 селядцоў (1.5–2 кілаграмы) – наўрад ці меней, чым сёння. Мясцовы, вылаўлены тут жа пад Магілёвам, акунь каштаваў 2.5 асмакі, 1 лешч – 24 асмакі, 1 шчупак – 20 асмакоў. У пераліку на кілаграмы, акунь атрымліваўся разы ў два танней, але селядзец ўсё ж заставаўся вельмі даступным – адзінай марской рыбай, на працягу стагоддзяў вядомай сярэдняму беларусу.

Гэтыя самыя танныя, па 20 асмакоў за дзесятак у цэнах 1697-га, селядцы, называліся "простымі". Г.зн. вылаўленыя недзе побач, ля Караляўца, Рыгі ці Торуні. "Галяндэрскія" (галандскія) ці "шкоцкія" (шатландскія) каштавалі ў 1.5 разы даражэй, 30 асмакаў ці адзін залаты за дзесятак. Бо іх жа і лавілі, як правіла, у Атлантыцы, на якой-небудзь Догер-банцы. Самымі дарагімі, па 40 асмакоў за дзесятак, былі ў 1697-м нейкія "казінцовыя" селядцы.

> "вынаходлівыя гандляры ды кулінары заўжды ведалі спосабы, як палепшыць радавод самаму "простаму" селядцу. Вось хоць бы рэцэпт з "Літоўскай гаспадыні", нашага вядомага трактату для хатніх гаспадыняў XIX ст. Як прыгатаваць просты селядзец, каб ён быў гэткі ж далікатны, як і галандскі". *Выпатрашаны селядзец заліваюць халоднай вадой і выносяць у склеп на 24 гадзіны. Да пайгарца воцату дадаюць 5 цыбулін, адзін лот англійскага перцу, паўлота простага, дзесяць лаўровых лістоў і дзесяць гваздзікаў. Усё 3 разы кіпяцяць, кладуць туды вымачаны селядзец і ставяць у склеп. Праз тыдзень можна ўжо ўжываць. Такая колькасць воцату разлічана на 10 селядцоў.*

Попыт на селядцоў стымуляваўся традыцыямі хрысціянскага посту. Селядзец – тыпова посная страва. У Польшчы (магчыма, дзе-нідзе і ў нас) існаваў звычай "Пахаванне журу і селядца": у Перадвялікодную пятніцу моладзь разбівала гліняны гаршчок з журам, а селядца вешалі на дрэве ў пакаранне за тое, што "шэсць тыдняў прыгнятаў ён мяса і марыў людзей голадам". У нас, як і ў суседзяў, палякаў ды літоўцаў, селядзец быў адной з 12 абавязковых посных страваў на Куццю. Як сведчыць Ю. Крачкоўскі (1874), "на першую куццю (напярэдадні Нараджэння Хрыстовага) гатуюць прыкладна наступныя стравы: селядзец, верашчака з селядца з цыбуляй і поліўкай (юшкай), аладкі, крупнік кіслы, аўсяны кісель… Куцця складае заключныя стравы і ў вялікія святы".

Селядзец быў надзвычай важным не толькі для нашай кулінарыі, але і эканомікі. На працягу XVI–XVIII ст. гэты тавар быў ці не асноўным артыкулам нашага імпарту ўвогуле, а ў структуры імпарту з "Прусаў" дакладна займаў першае месца. Ужо і ў Расейскай імперыі, у 1830-я гг., сярод імпартаваных у Беларусь тавараў селядцы займалі другое месца па вартасці пасля французскіх вінаў. Хай сабе, віно – чыста артыкул раскошы, прыклад таго, як марнаваўся нацыянальны даход. А вось селядцы – сапраўды "стратэгічны імпарт". Праўда, у гэты час істотна пераважалі ўжо не "простыя" і не "галяндэрскія" селядцы, а шведскія (а рачэй нарвежскія, бо Нарвегія тады была ў уніі са Швецыяй), якія складалі больш за 90 % ад усяго імпарту. На пачатку 1880-х гг., як сведчыць П. Сямёнаў у "Живописной Росии", 3 літоўскія губерні – Віленская, Ковенская і Гарадзенская – г.зн. Літва і Заходняя Беларусь з іх тагачаснымі 3.5 млн. жыхароў – завозілі штогод 1,400,000 пудоў селядцоў на суму 1,800,000 рублёў, якія амаль усе спажываліся на месцы. Шэсць з паловай кілаграмаў селядцоў штогод былі ці не найбольшым артыкулам выдаткаў для парэформавага селяніна.

> Увозіліся не толькі самі селядцы, але нават і *лёк* – селядцовы расол. Вядомы этнограф П. Шэйн ужо на пачатку XX ст. занатаваў: *З гораду, мястэчка, ці мясцовай карчмы атрымліваецца селядцовая жыжка ці ляк. Брудная каламутная селядцовая жыжка, ставіцца ў місцы на стол і складае мачанне для хлеба, сачнёў, рэдка — бліноў. Вядома, што пасля спажывання ляку кожны, пакутуючы ад смагі, увесь час п'е — не нап'ецца.*

Атрымліваецца, што як курыца – "не птушка", так і звыклы і масавы селядзец – "не рыба". Вядома, з гледзішча больш-менш заможных пластоў грамадства. Ці не таму славуты Караль Радзівіл "Пане Каханку" вельмі любіў хваліцца сваім уяўным раманам, які аднойчы меў з сірэнай на Адрыятычным моры і ад якога нібыта нарадзіліся 100 тыс. селядцоў – ускосна падкрэсліваючы іх таннасць і звыкласць? Аднак для прыгоннага селяніна селядзец – гэта сапраўдны ласунак, дарма што адносна даступны. Амаль усё, што спажываў прыгонны, ён вырошчваў сам, значна менш купляў у мясцовых вытворцаў. Але дзе ж было ўзяць марскую рыбу, хоць бы на вялікае свята? І якая гэта мусіла быць рыба, калі не селядзец? Сотні гадоў менавіта селядзец заставаўся ці не адзіным "крамным" таварам, а таксама самай традыцыйнай закускай да піва ці гарэлкі ў корчмах, як, напрыклад, у Коласавай паэме "Сымон-музыка":

> Удоўж сцен стаялі лавы;
> За сталом – гурткі людцоў,
> На сталах – сляды патравы:
> Хлеб, агрызкі селядцоў.

> У кожным малым мястэчку, пачынаючы ледзь не з XV ст., абавязкова былі яткі з селядцамі, якія, як правіла, трымаў мясцовы яўрэй. Знешні выгляд гэтых ятак і іх уладальнікаў мала змяніўся на працягу стагоддзяў. Вось якімі убачыў іх у сярэдзіне XIX ст. П. Шпілеўскі: *Што такое Нізкі рынак у старым Менску?... З чацвёртага боку, "шкапікі" рынку застаўленыя бачулкамі з селядцамі і селядцовай юшкай (яўрэйскім ласункам); большая частка селядцоў разрэзаная на дробныя кавалачкі, які прадаюцца па шэлягах; каля селядцоў, на драўляных колцах, валяюцца скрылі сыру і пячонай рыбы...*

Толькі на кароткі час у XVII ст. канкурэнцыю яўрэям спрабавалі скласці аселыя ў нас *шкоты* – шатландцы, але яўрэі вельмі хутка аднавілі сваю манаполію. Менавіта яны і

паспрыялі глыбокаму ўкараненню селядца ў нашай кулінарыі. Напрыклад, славуты яўрэйскі *фаршмак з селядца* як традыцыйная страва склаўся менавіта ў яўрэяў Літвы і Беларусі. Словам *Vorschmack*, якое па-нямецку і на мове ідыш азначае "закуска", "страва перад асноўнай ежай", ва Ўсходняй Прусіі, адкуль у асноўным і траплялі да нас селядцы, спачатку называлі страву са смажанага селядца, якую таксама спажывалі як закуску. Гэта ўжо ў нашых яўрэяў *фаршмак* пераўтварыўся ў халодную закуску з рубленага селядца.

З часам сувязь селядца з яўрэям у людовай свядомасці зрабілася амаль непарушнай. Вось анекдатычны, але зусім праўдзівы выпадак з 1820-х гг., пра які потым яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў памятала ўся Менская губерня. Дунін-Марцінкевіч апісвае яго ў паэме "Вечарніцы". Лянівы і дурнаваты селянін Зміцер з Лошыцы, маёнтку графа Прушынскага, прадаўшы ў Менску на рынку цялушку і атрымаўшы за яе 5-рублёвую асігнацыю – *сіненькую*, купіў у дарогу селядца "за шэляг" і не знайшоў нічога лепшага, як пакласці яго ў тую самую кішэню, дзе ўжо ляжала *сіненькая*. Па дарозе дадому ў Лошыцу, завітаўшы ў карчму ў Серабранцы, Зміцер вырашае падсілкавацца селядцом, ну і, вядома, абмыць удалы гешэфт з цялушкай.

Зміцер за цялушку як сіню ўзяў,
Рад з торгу, ў кішэню зараз улажыў,
Пасля селядца як за шэляг купіў,
Здуру, гдзе бумажка, туды ж яго ўклаў.
Сіня да мокрага селядца прыстала
Дый між зубоў Змітра разам з ім папала,
А баш як квацеркай мазгі задурэў,
Не глядзя, з селядцом бумажку ён з'еў.
Скора звінуўся! – галоўка, хвасток
Ад селядца, баш, толькі асталіся;
Вочы працёр, рэштку павярнуў рабром
Ад страху воласы дыбам падняліся!
Баш, ля галоўкі бумажкі кусочак
Прыліп, маўляў, дубовы лісточак.
Галавой аб сцену б'ецъ
Воласы на сабе рвець,
Рукі ломіць ды галосіць,
Рэштку сіняныкай к карчмару падносіць:
"Мой жа ты бацячка! Мой ты селязенька!
Да дай жа ж раду, што мне тут рабіць?
Хоць ідзі тапіся – нельга далей жыць.
На што карчмар адказвае:
Хоць казуць людзі, сто Зміцер',
Дар'ма, сто музык, да на р'озум хіцер',
А я казу: ён дур'ань, і вялікі дур'ань!
Вот, не р'аўнуючы, як р'абін нас Ур'энь.
Як зэ табе, свінцюху, гр'ос не санаваць
Як з селядцом бумаску у кісэнь хаваць?

Яшчэ адзін анекдот пра яўрэяў ды селядцоў, з Вільні міжваенных часоў, ад Галіны Войцік, дачкі Зоські Верас: "На рынку Гале гандляркі практычна ўсе былі жыдоўкі. Я яшчэ памятаю, хадзілі мы там неяк з мамай, нечага шукалі. Прадае гандлярка-жыдоўка селядцы з бочкі. Ведаеце, такія вялікія бочкі, селядцы там плаваюць у лёку. Ну, а

селянін, які там побач нешта прадаваў, узяўся закусваць, бярэ хлеб, цыбулю, і так у бочку гэтую макае. Дык яна яму: "Ой, ласун, ласун!"

Своеасаблівым сімвалам беларускага *штэтла* (яўрэйскага мястэчка) увайшоў селядзец і ў гісторыю сусветнага мастацтва, увекавечаны Хаімам Суціным са Смалявічаў і асабліва Маркам Шагалам, сынам беднага разносчыка селядцоў з Віцебска. Селядцы літаральна рассыпаныя па ягоных творах. З аднаго боку, яны служаць напамінам пра мізэрнае правінцыйнае дзяцінства, але вельмі часта ў Шагала сімвалізуюць няўмольны час, які выслізгвае з рук, як селядзец.

Развітваючыся з родным Віцебскам, Шагал напісаў у дзённіку: “Бывай, Віцебск! Заставайцеся са сваймі селядцамі, землякі!”. Але да канца развітацца з мінулым так і не ўдалося. Здаецца, і Шагала, і Суціна ўсё жыццё праследавалі селядцовыя кашмары… То, хоць Шагал і сказаў селядцам “бывайце!”, мы зусім неабавязкова мусім браць з яго прыклад. Таму можна пажадаць чытачам, калі яны ў чарговы раз будуць есці звычайны селядзец, прыгадаць, што гэта таксама своеасаблівы сімвал нашай гісторыі. Адродзім культ(уру) селядца?

***Алесь БЕЛЫ (Менск)***
***bely@infonet.by***

**Шчырая падзяка за карысныя заўвагі Андраніку Антаняну (Вільня)**

# Граф з піўной этыкеткі, або Пераўтваральнік Менска

***Захар ШЫБЕКА***
***(Менск)***

Здаецца, найлепш гэтае імя вядомае аматарам піва. “Граф Чапскі” – чытаюць яны кожны раз, калі адкаркоўваюць піўную бутэльку. Адны лічаць графа аматарам піва ці нават ледзь не прапойцам. Іншыя ведаюць, што гэта былы гаспадар старажоўскага бровару “Багемія”, які доўгі час называўся “Беларусь”, а цяпер мае назву “Аліварыя”. І толькі асобныя гісторыкі могуць расказаць пра графа значна больш. Урэшце, гэтая асоба нібыта і вядомая, але ж вядомая зусім мала.

**Візітоўка**

Дык хто ж ён, граф Караль (Карл Эмерыкавіч) Чапскі? Напаўміфічны півавар, менскі гарадскі галава, самазадаволены буржуй-вусач, з абавязковым куфлем у руках і пенай на вусах? Караль Ян Аляксандр Гутэн-Чапскі нарадзіўся 15 жніўня (ст.ст.) 1860 г. у маёнтку Станькава (за 40км ад Менска). Быў рыма-каталіцкай веры. Род Чапскіх вядомы ў Польшчы (Гданьскае Памор’е) ад XVI ст., ад XVIII ст. таксама і ў ВКЛ, праз шлюбы пароднены ледзь не з усёй Еўропай, асабліва з курляндскімі і чэшскімі родамі. Бацька Караля Эмерык Захары Мікалай Севярын (1828—1896), з ліку вядомых царскіх вяльможаў, займаў паслядоўна пасады наўгародскага губернатара, пецярбургскага віцэ-губернатара і дырэктара Ляснога дэпартаменту Расеі. Шлюб з Лізаветай з роду баронаў Маендорфаў (1833—1916) даў Эмерыку Чапскаму доступ у самыя высокія колы расейскай арыстакратыі, улучна сямейнікаў царскай фаміліі. Прычым давер да яго быў нагэтулькі вялікі, што наўгародскім губернатарам ён прызначаны ў крывавым 1863 г. – амаль неверагодна для паляка! Акрамя таго, Эмерык Чапскі меў славу вядомага нумізмата і археолага, валодаў унікальнымі калекцыямі даўніны, сабранымі ў Станькаве. Напрыклад, тутэйшая картаграфічная калекцыя была найлепшай не тое што ў Беларусі, але ўва ўсёй былой Рэчы Паспалітай. Цяпер значная частка станькаўскіх скарбаў знаходзіцца ў музеі Чапскіх у Кракаве, уфундаваным Эмерыкам Гутэн-Чапскім перад самай смерцю. (Гл. напр.: **http://www.muzeum.krakow.pl/prawe/oddzial-08.htm** ды **http://www3.uj.edu.pl/alma/05/53.html**)

Замілаванасць старажытнымі помнікамі перадалася і сыну. З волі маці Караль вучыўся ў нямецкай гімназіі Санкт-Анэн-Шуле ў Санкт-Пецярбургу. У 1882 г. скончыў Дэрпцкі ўніверсітэт са ступенню кандыдата палітэканоміі і статыстыкі.

Па завяршэнні вучобы вярнуўся ў Станькава, каб кіраваць бацькавай гаспадаркай. Велізарная латыфундыя Чапскіх займала 34 545 дзесяцінаў зямлі. Акрамя Станькава, ў яе ўваходзілі фальваркі Каралёва, Прылукі, Скарынічы, Негарэлае, Прусінава, Стукаціцкая лясная дача і тры засценкі ў Менскім павеце, а таксама фальварак Самуілава і 5 засценкаў – у Ігуменскім павеце). У 1894 г. бацька падзяліў сваю маёмасць: Станькава дасталося ў спадчыну Каралю, Прылукі сталі маёнткам малодшага брата Ежы (1861—1930). Караль быў жанаты з Марыяй Пуслоўскай (1870—1968), прадстаўніцай не менш знакамітага шляхоцкага роду. Меў чатырох дзяцей.

З 12-гадовага ўзросту (1872 г.) ягонае жыццё, паводле ўласнага прызнання, звязана з Менскам. Ён уваходзіў у лік самых багатых менчукоў. Валодаў амаль 10-цю самымі лепшымі ў горадзе будынкамі. У 1897 г. маёмасны цэнз перавышаў 86 тыс. руб.

Сувымернымі багаццямі валодалі ў горадзе ўсяго дзве-тры асобы. Ягоныя дамы месціліся на вул. Захар'еўскай, Падгорнай, Праабражэнскай, Скобелеўскай і на Прывакзальным пляцы (рог Бабруйскай і Пецярбургскай). На Скобелеўскай меўся ўласны сад. Высокі маёмасны цэнз і выдатная адукацыя спрыялі таму, што ў 1890 г. у 30-гадовым узросце ён абіраецца на пасаду гарадскога галавы г. Менска. І з таго часу пачынаецца самы адметны, але і самы цяжкі перыяд у жыцці графа.

**Папярэднікі**

> На жаль, пакуль не складзены поўны спіс выбарных кіраўнікоў нашай сталіцы, пачынаючы ад увядзення магдэбургскага права і да нашых дзён. Нават звесткі з недалёкага XIX ст. на гэты конт няпоўныя. У 1836—1839 гг. гарадскім галавой Мінска быў Леапольд Дэльпацэ, мясцовы купец італьянскага паходжання (з г. Верона) і рыма-каталіцкага веравызнання. Пазней, у 1851—1854 гг. ён перавыбіраўся на гэтую пасаду, бо карыстаўся вялікай павагай сярод мінчукоў за дэмакратызм і сумленнае стаўленне да абавязкаў.

Пасля паўстання 1863 г. гарадское самакіраванне, і дагэтуль значна абмежаванае, яшчэ больш падпала пад кантроль царскай адміністрацыі. Закон ад 22 траўня 1864 г. забараняў "палякам", дакладней каталікам, займаць дзяржаўныя пасады ў заходніх губернях. Прэтэндэнтаў на кіраванне ў тых губернях пачаў зацвярджаць сам міністр унутраных спраў.

У 1880 г. на пасаду гарадскога галавы Мінска заступіў М.Галіневіч, які выконваў абавязкі муніцыпальнага лідэра да сваёй смерці ў 1889 г. Расійскі чыноўнік, прадстаўнік праваслаўнага дваранства Мінскай губерні, ён карыстаўся вялікай падтрымкай і даверам з боку мясцовай царскай адміністрацыі. Аднак пачатая Л.Дэльпацэ мадэрнізацыя гарадской гаспадаркі працягвалася і пры ім. Ужо ў 1886 г. Менск меў найбуйнейшую сярод губернскіх гарадоў Беларускага краю даходную частку бюджэту.

**Першая кадэнцыя 1890—1893 гг.**

Пасля смерці М.Галіневіча царскія ўлады доўга не маглі падабраць годнага пераемніка. Прэтэндэнтаў сярод праваслаўных, якія б валодалі маёмасным цэнзам, было мала. Ды і сярод выбаршчыкаў пераважалі домаўладальнікі-каталікі, якія пасля забароны пашырэння сваіх землеўладанняў у сельскай мясцовасці (1865) паспешліва набывалі маёмасць у Менску. Яны і забяспечылі абранне маладога і энэргічнага Караля Чапскага на пасаду гарадскога галавы. Пецярбург зацвердзіў кандыдатуру. Царскі ўрад у той час змякчаў дыскрымінацыю каталікоў, каб не ўскладняць дачыненні з мясцовымі землеўласнікамі і не абцяжарваць фармаванне муніцыпальных органаў на захадзе імперыі.

Абранне графа на пасаду гарадскога галавы Менска не ўсім падабалася. Прадстаўнікі праваслаўных колаў (пераважна чынавенства) адразу ж напісалі губернатару данос: не дапускае праваслаўных у гарадскую думу, ганьбіць годнасць гарадскога галавы тым, што прыкрывае сваім імем "жыдоўскія кабакі" (прыгадалі графскія шынкі, дзе працавалі гэбраі). Але і гэбрайскія камерсанты сустрэлі новага кіраўніка насцярожана. Ім не надта падабалася, што нейкі амбітны малады пан пачаў муніцыпалізаваць даходныя артыкулы гарадской гаспадаркі – бойню для жывёлы,

гандлёвыя крамы на Нізкім рынку. Ды і адзіная ў горадзе недзяржаўная газета "Минский листок" спачатку з недаверам паставілася да планаў К.Чапскага, назваўшы яго ў 1890 г. чалавекам *увлекающимся*. Але новы гарадскі галава дзейнічаў рашуча і паслядоўна. Вось толькі некаторыя яго здзяйсненні на адказнай пасадзе:

**1890 год.** Завяршылася будаўніцтва тэатру і выкуплены будынак летняга тэатру ў Губернскім парку. Гараджане пачалі карыстацца тэлефонам. Муніцыпальнай уласнасцю стала частка Нізкага рынку, што дагэтуль знаходзілася ва ўладанні прыватных асобаў.

**1891 год.** Праведзена ўладкаванне гарадской бойні для жывёлы, пачаў дзейнічаць ламбард, пабудаваныя 172 гарадскія крамы і распачата ўмацаванне набярэжнай Свіслачы, якая прыносіла менчукам шмат клопатаў падчас вялікіх дажджоў і паводак. Надбудаваны трэці паверх над гарадскім домам на рагу вул. Губернатарскай і Юр'еўскай (цяпер на гэтым месцы знаходзіцца аддзяленне "Беларусбанку", вул. Леніна, 3).

**1892 год.** Адбылося ўрачыстае адкрыццё руху на конна-чыгуначнай дарозе ("конці"). Гэта быў той жа трамвай, толькі цяглавай сілай служыла пара запрэжаных коней.

Пасля ўсталявання новай вадапомпавай машыны, значна павялічылася магутнасць водаправоду. Менскія "бамжы" атрымалі дом прытулку. Ламбард перамясціўся ў нанава адбудаваны гарадскі дом. Забрукаваная Койданаўская шаша, якая злучала горад з урадлівымі землямі паўднёва-заходніх паветаў губерні і маёнткам графа Чапскага. Гарадское самакіраванне арганізавала чарцёжнае бюро і ўзялося за планамерны кантроль за гарадской забудовай. Пачалося санітарнае аздараўленне гораду: адкрыўся гарадскі санітарны камітэт, праведзены антыхалерныя мерапрыемствы. Санітарны камітэт месціўся ў адным з дамоў К.Чапскага. Арэндная плата была мінімальная – 375 руб. у год.

**1893 год.** Эпідэмія халеры падштурхнула да заснавання аналітычнай станцыі і дэзінфекцыйнай камеры. На гарадскія сродкі адчынілася 2-я прыходская вучэльня. Праведзена значнае добраўпарадкаванне гораду. Забрукаваны некаторыя галоўныя вуліцы і Ракаўская шаша, па якой Менск атрымліваў большую частку дроваў. Пабудаваны новы Нізка-Базарны мост (сучасны мост праз Свіслач, які злучае вул. Нямігу і Багдановіча), каб працягнуць лінію "конкі" ў бок Траецкага рынку і піваварнага бровару графа Чапскага. Сем'і пажарнікаў атрымалі асобныя казармы. У гарадскую рысу ўвайшлі землі вёсак Пятроўшчына і Сеніца.

### Другая кадэнцыя 1893—1897 гг.

У **1893 г.** К.Чапскі лёгка перавыбіраецца на другі тэрмін. Пасада дазваляла паводле статусу атрымаць годнасць калежскага асэсара. У 1894г. граф адмаўляецца ад дзяржаўнага жалавання і надалей працуе бясплатна.

**1894 год.** У Менску ўведзена электрычнае асвятленне. Гарадская ўправа ўзяла пад кантроль выдаленне з гораду выкідаў, выкупіўшы ў прыватнай асобы асенізацыйны абоз. У сувязі з будаўнічым бумам праведзена інвентарызацыя муніцыпальных земляў, складзены іх план.

**1895 год.** Адчынена рамесная вучэльня, для якой горад набыў асобны дом, а таксама 3-я прыходская вучэльня. У доме графа Чапскага на вул. Захар'еўскай пачаў дзейнічаць радзільны прытулак, які атрымліваў з гарадскіх сродкаў штогадовае фінансаванне. Зацверджаны новы план гораду.

**1896 год.** Пачало дзейнічаць крэдытнае таварыства, якое выдавала іпатэчны крэдыт для рамонту і будаўніцтва новых дамоў, пераважна камяніцаў. Тады ж горад выдзеліў спецыяльны пакой для правядзення аўкцыёнаў і набыў новую электрамашыну.

**1897 год.** Пабудаваны новы Ляхаўскі мост, што злучыў скарбовы вінны склад з цэнтрам. Пры гарадской бойні ўпарадкаваны загонны двор для жывёлы. Праведзеныя антыдэзінтэрыйныя мерапрыемствы.

### Трэцяя кадэнцыя 1897—1901 гг.

Чарговыя выбары гарадскога галавы адбыліся ў 1897 г. І на гэты раз К.Чапскі лёгка перамог. Ніхто не рызыкнуў нават выставіць альтэрнатыўную кандыдатуру. Бурлівая дзейнасць ужо знакамітага гарадскога галавы працягвалася.

**1898 год.** З'явіўся шпіталь для прастытутак. Горад выкупіў у прыватных асобаў Юбілейны пляц і набыў зямельны надзел для Вольнага пажарнага таварыства.

**1899 год.** Адчынена 2-я жаночая гімназія. Пачала дзейнічаць бясплатная амбулаторыя. Атрымана права на выпуск аблігацыйнай пазыкі. Працягвалася землеўпарадкаванне: складзены новы план гораду, набытая зямля для Малочнага рынку, у гарадскую рысу ўлучаныя 145 дзесяцінаў з прыгараднага маёнтка Лошыца Яўстаха Любанскага.

**1900 год.** Менск займеў публічную бібліятэку. Для гарадской электрастанцыі набыта новая дынама-машына. Пры рамеснай вучэльні заснаваная медналіцейная майстэрня. Траецкі рынкавы пляц забрукавалі. У Саборным скверы ўзведзены помнік Аляксандру II.

Вуліцы брукаваліся ўвесь час. К.Чапскі добра разумеў цану брукаванак. Ягоны бровар, як і іншыя прадпрыемствы, патрабавалі шмат паліва. Ад перавозу дроваў і іншых цяжкіх грузаў хутка псаваліся грунтавыя дарогі, на якіх з'яўляліся выбоіны, што выклікала незадаволенасць гараджанаў.

Напружаная праца падарвала здароўе графа. Ён захварэў на сухоты. У 1900 г. гарадскі галава два месяцы адпачываў і лячыўся ў санаторыі пад Бадэнам. На пасадзе яго часова замяняў надзейны сябра Тэафіль Гольцберг, прадстаўнік менскіх лютэранаў.

### Чацвёртае перавыбранне

На выбарах 1901 г. становішча К.Чапскага аказалася хісткім. Для пачатку неабходна было трапіць у склад менскай гарадской думы, распарадчага органу гарадскога самакіравання. Гэтага ўдалося дасягнуць, але цаной вялікіх намаганняў. У 90-тысячным Менску выбарнае права меў тады толькі 101 гараджанін. Дык вось, з гэтага ліку выбаршчыкаў 48 галасавалі супраць. А калі дума выбірала сябраў гарадской управы (выканаўчы орган), паплечнікі графа Станіслаў Дабравольскі і Тэафіль

Гольцберг – людзі дасведчаныя, з вышэйшай адукацыяй — былі забалатаваныя. Граф прайшоў у склад управы. Ён прасіў абраць яго галавой Менска, каб упарадкаваць справы, пасля чаго абяцаў падаць у адстаўку. У выніку дамогся свайго даволі значнай большасцю галасоў (25 – за, 10 – супраць).

Аднак умоў для працы не было. Абвастрыліся дачыненні з губернскімі ўладамі. Гарадскую касу ў чарговы раз рэвізавала адмысловая камісія. Ужо 29 траўня 1901 г. К.Чапскі падае прашэнне аб адстаўцы, "бо хвароба і доктар таго патрабуюць". У верасні адстаўка прымаецца. Дума маўчаннем выявіла на тое сваю згоду.

**Пераемнікі**

Пасля адстаўкі К. Чапскага былі выпадкі, калі ў гарадской касе не заставалася ані капейкі. Гарадская маёмасць апісвалася за няплату тэрміновых ратаў у Маскоўскі зямельны банк, а гарадскія служачыя не атрымлівалі зарплату. Новае кіраўніцтва на чале з Мечыславам Райкевічам узялося за павелічэнне падаткаабкладання гараджанаў. "Вестэрнізацыя" гораду прыпынілася. Сродкі, што паступалі ў гарадскую касу, выкарыстоўваліся на ўтрыманне шматлікіх камісіяў і падвышэнне акладаў сябрам гарадской управы. Многія гараджане і асобныя лаўнікі (сябры думы), што прывыклі да самаахвярнай дзейнасці папярэдняга гарадскога галавы, выказвалі незадаволенасць. Новыя муніцыпальныя лідэры, хоць і крытыкавалі К.Чапскага, мусілі ў пэўнай ступені працягваць ягоныя пачынанні. Праўда, ажыццяўленне графскіх планаў пераемнікам было не пад сілу.

**Сакрэт поспеху**

Чаму ж так шмат удавалася К.Чапскаму? Найперш, безумоўна, дзякуючы высокай адукаванасці, ініцыятыўнасці і дзелавітасці. Былому гарадскому галаве пашчасціла ўзначаліць гарадское самакіраванне Менска ў досыць спрыяльную эпоху, калі дасягненні цывілізацыі імкліва ўваходзілі ў жыццё. Немалую ролю адыграла і рэпутацыя бацькі, аднаго з найвышэйшых царскіх саноўнікаў. Пэўны ўклад ўнеслі і папярэднікі. Дзейнасць Чапскага разгортвалася не на голым месцы. І ўсё ж, адкуль ў правінцыйным Менску браліся сродкі?

Караль Чапскі пачынаў з таго, што ў 1890—1891 гг. набраў крэдытаў на 225 тыс. руб. і пачаў добраўпарадкоўваць гарадскую гаспадарку. Але плаціць працэнты і вяртаць даўгі гораду не было чым. Тады граф пайшоў на неардынарны крок – выклаў з уласнай кішэні больш за 28 тыс. руб. на аплату працэнтаў і нядоімкі. Гарадскі галава быў перадавым для свайго часу эканамістам – разглядаў гарадскую гаспадарку як спрыяльную сферу для прадпрымальніцтва, разумеў важнасць крэдыту і інвестыцыяў для яе развіцця. А таму сістэматычна браў кароткатэрміновыя крэдыты для гораду ў Менскім і Маскоўскім зямельных банках, Азова-Данскім банку, Менскім камерцыйным банку, Дзяржаўным банку, Менскім таварыстве ўзаемнага крэдыту, але зноў жа – за ўласнымі зарукай і подпісам. У 1892 г. ягоная пазыка гораду склала ўжо больш як 48 тыс.руб., у 1893 г. – больш за 27 тыс. руб. , у 1894 г. – каля 16 тыс. руб., у 1898 г. – 38,6 тыс. руб. На 1 студзеня 1899 г. горад быў вінаваты крэдыторам 803,948 руб. З гэтай сумы 37,468 руб. належала вярнуць гарадскому галаве.

К.Чапскі адзін з першых у Расейскай імперыі ў 1899 г. дамогся дазволу на паўтарамільённую муніцыпальную пазыку для Менска на 50 гадоў. Рэалізацыя гарадскіх аблігацыяў адбывалася ў 1899—1907 гг. па ўсёй Расеі. Праўда, неспрыяльная

кан'юнктура пачатку XX ст. хутка абясцэньвала аблігацыі і тым руйнавала амбітныя планы гарадскога галавы. Не чакаючы рэалізацыі аблігацыйнай пазыкі, ён ўсё ж праводзіў пашырэнне водаправоду, брукаванне Траецкага рынку, менскіх вуліцаў ўласным коштам. У сувязі з рэалізацыяй аблігацыяў горад завінаваціўся К.Чапскаму да пачатку 1901 г. больш чым 200 тыс. руб.

> Такім чынам, на працягу 90-х гг. адзіная надзейная крыніца фінансавання гарадской гаспадаркі Менска – беспрацэнтныя пазыкі з уласных сродкаў гарадскога галавы ды яшчэ кароткачасовыя пазыкі банкаў пад ягоную ж заруку. Гэтыя пазыкі потым пагашаліся па меры паступлення даходаў. Відавочна, што горад трапляў у пэўную эканамічную залежнасць ад графа, але ж і Чапскі быў асабіста зацікаўлены ў пашырэнні прыбытковасці гарадской гаспадаркі, каб вярнуць свае грошы. Газета “Минский листок” не без гонару за менскага галаву ў 1900 г. пісала, што і ў Адэсе з'явіўся “свой Чапскі” – гарадскі галава Дзмітрыеў, які будаваў шпіталь уласным коштам.

### Граф Чапскі і князь Трубяцкой

На ўзроўні кожнай расейскай губерні існавала своеасаблівая “вертыкаль” у асобе губернатара і ягонай адміністрацыі. У сувязі з гэтым здзіўляе, як Чапскі пераадольваў яе супраціў на шляху да ажыццяўлення сваіх мэтаў? Ці мо з боку мясцовых уладаў былі разуменне і падтрымка?

Менскі губернатар князь Мікалай Трубяцкой правіў губерняй прыкладна ў тыя ж гады, што і Караль Чапскі горадам. Менск звязаў гэтых двух арыстакратаў і адміністратараў. Заслону канфідэнцыйнасці іхных дачыненняў прыўзнімае ліставанне Мікалая Трубяцкога з дырэктарам Дзяржаўнага дэпартаменту МУС Дзмітрыем Сіпягіным з нагоды чарговага перавыбрання Чапскага ў 1901 г. на пасаду гарадскога галавы. Менскі губернатар пісаў, што не лічыць зацвярджэнне яго на той пасадзе “карысным для справы”, што нежаданне гарадскога галавы падпарадкоўвацца думе і губернскай адміністрацыі прывядзе да заняпаду гарадской гаспадаркі. Заганаў у графа князь адшукаў шмат — не толькі, маўляў, дрэнны выканаўца, але і няўмелы нібыта адміністратар, даверлівы да падначаленых. Жыве ў маёнтку, дзе вядзе гаспадарку, і толькі два разы на тыдзень наведвае гарадскую ўправу, раз'язджае ў Пецярбург і за мяжу, адкрытыя ім установы працуюць не заўсёды добра, ягоная хвароба патрабуе пражывання ў цёплым клімаце, у замежнай краіне. (А сябры Чапскага, між іншым, захапляліся, што ён часам вершнікам пераадольваў 40 км паміж горадам і ўласным маёнткам у любое надвор'е і любую пару года.)

Высокі царскі чыноўнік з Пецярбурга шкадаваў, што супраць К.Чапскага не былі ўжыты належныя меры. М.Трубяцкому прыйшлося апраўдвацца. Аказваецца, стрымаць графа было не так проста. Ён мог прыцягнуць на свой бок грамадскасць, настроіць яе супраць губернскай адміністрацыі. Як чалавек юрыдычна дасведчаны, мог і абараніць правы гарадскага самакіравання ў законным парадку. На ўсялякі ўціск скардзіўся ў сенат.

І тут губернатар успамінаў, як у 1898 г. гэты сенат стаў на бок менскага гарадскога галавы, пацвердзіўшы ягонае права займацца гаспадарчымі справамі незалежна ад губернскіх уладаў. Гэта значыць, што з таго часу менскі муніцыпалітэт меў магчымасць будаваць, скажам, прыбіральню, без дазволу на тое губернатара. Да таго ж К.Чапскі

быў неблагім дыпламатам. Паводле словаў М.Трубяцкога ўсе заўвагі прымаў, але працягваў рабіць свае справы.

Як бачым, князь Мікалай Трубяцкой доўгі час цярпеў эканамічную незалежнасць гарадскога галавы. І толькі напрыканцы трэцяй кадэнцыі (1900) ягонае цярпенне скончылася. Слава К.Чапскага выклікала асцярогу ў Пецярбургу, а таксама зайздрасць асобных менчукоў, самога губернатара. Губернскае начальства пачало трактаваць пазыкі К.Чапскага незаконнымі, здзейсненымі без адпаведнага дазволу. Так што ідыліі супрацоўніцтва і ўзаемаразумення паміж М.Трубяцкім і К.Чапскім, на жаль, не было. Паміж імі рачэй пралягала бездань. Прадстаўнік еўразійскай імперыі цяжка разумеў прадстаўніка еўрапейскай культуры. Усё, што рабілася няўрымслівым гарадскім галавой, рабілася на свой страх і рызыку, а часам і насуперак волі губернатара.

І ўсё ж Пецярбург у чарговы раз зацвердзіў К.Чапскага на пасадзе. Граф сам прасіў міністра зрабіць гэта з тым, каб пасля навядзення ў гарадскіх справах належнага парадку, добраахвотна сысці ў адстаўку. Шляхоцкаму слову, *verbum nobile*, прынамсі ў выпадку Чапскага, можна было давяраць. Да просьбы ён прыклаў спіс сваіх справаў. За 11 гадоў, якія з поўным правам можна назваць эпохай Чапскага, іх набралося 57. Спіс уражваў. Да таго ж становішча ў Менску было не вельмі спакойнае. Горад уцягваўся ў нарастаючы рэвалюцыйны рух, і з гэтай нагоды было б неразумна абвастраць там сітуацыю. К.Чапскі меў шмат прыхільнікаў.

### Пазіцыя гарадской думы

Дума, якая складалася пераважна з гараджанаў-каталікоў, большую частку эпохі Чапскага падтрымлівала гарадскога галаву. У той жа час нейкая яе частка была незадаволеная ростам падаткаў, якія выкарыстоўваліся і для фінансавання бясконцых праектаў. Апазіцыю ў гарадской думе ўзначальваў Віктар Янчэўскі, будучы дэпутат І Дзяржаўнай думы. Ягонымі намаганнямі 26 кастрычніка 1898 г. менская дума зацвердзіла інструкцыю для рэвізійнай камісіі. Меркавалася ўвядзенне папярэдняй рэвізіі ўсёй дзейнасці гарадской управы. К.Чапскі рашуча пратэставаў, бо гэта, на ягоную думку, перашкаджала ўправе аператыўна і эфектыўна дзейнічаць. Прапанова К.Чапскага думе выпрацаваць сумесную з управай інструкцыю не была прынятая. Губернатар М.Трубяцкой не зацвердзіў інструкцыі – ані складзенай думай, ані складзенай управай. Ён сам устанаўліваў правілы кантролю за кіраўніцтвам гораду. Гарадская дума палічыла, што К.Чапскі занадта далёка пайшоў у сваіх пераўтварэннях, прыняла бок губернскіх уладаў і пачала правальваць усе прапановы гарадскога галавы, што вельмі негатыўна адбілася на ягоным здароўі.

> Водгулле некалі зацятай барацьбы партыяў Чапскага і Янчэўскага дайшло да нашых дзён. Некаторыя распавядаюць, што прыбіральня ў Цэнтральным скверы Менска, ля сённяшняга Нацыянальнага тэатру, пабудаваная як дакладная копія палацу К.Чапскага, каб дапячы яму. Нібыта лагічна і прыгожа. Толькі факты пярэчаць таму. Цяперашняя прыбіральня пабудаваная ў 1912 г. паводле праекту менскага гарадскага архітэктара Эдуарда Генэлія. А ў той час змаганне ўжо ішло паміж іншымі партыямі і людзьмі — муніцыпальнымі ліберaламі і чарнасоценцамі на чале з Густавам Шмітам. Магчыма, што згаданы шэдэўр архітэктурнай пародыі і ёсць копія менскага дома скандальнага чарнасоценца, — тонкая помста муніцыпальных дзеячоў свайму палітычнаму апаненту.

### Навядзенне парадку ў гарадскіх справах

Ціск на К.Чапскага ў 1900 г. узмацніўся. Каб спыніць нястомнага мадэрнізатара, і губернская адміністрацыя, і дума гатовыя былі абвесціць яго злачынцам. Рэвізійная камісія на чале з магістрам фізіка-матэматычных навук Г.Румбовічам з Вільні (карцела, відаць, віленчукам дапячы гораду-канкурэнту!) ў 1900 г. правярала справаздачы гораду за 1898—1899 гг. У яе складзе быў і прадстаўнік з Пецярбурга. Крыміналу не выявілі. Але вынікам рэвізіі стала забарона ўсіх фінансавых аперацыяў гарадской управы без адпаведнага рашэння гарадской думы. Чакаць даводзілася доўга, а гэта паніжала эфектыўнасць будучых капіталаўкладанняў.

К.Чапскі таксама заяўляў, што перавыбіраецца ў 1901 г., каб навесці парадак у гарадскіх справах. Сілы змагацца за завяршэнне сваіх праектаў ён ужо не меў, а таму навядзенне парадку звялося да спробы вяртання выдадзеных гораду даўгоў. Тым больш што грошы патрабаваліся на лячэнне. Але гарадская каса была пустая. У 1901 г. на паседжаннях гарадской думы даходзіла да адкрытых сутычак К.Чапскага з лаўнікам В.Янчэўскім, за плячыма якога стаяла губернская адміністрацыя. Напачатку бальшыня думы падтрымлівала права хворага графа на вяртанне доўгу. Але потым пад адміністрацыйным ціскам думцы пакінулі свайго кіраўніка ў адзіноце. Думская рэвізійная камісія прызнала ў 1902 г. несапраўднымі шэраг крэдытаў, узятых для гораду сябрамі гарадской управы, ды абавязала іх унесці ў гарадскую касу больш як 44 тыс. руб., пагражаючы крымінальным пераследам. Раней дума ўсе расходы ўхваляла, але пад ціскам зверху пачала кваліфікаваць іх няправільнымі.

К.Чапскі не прызнаваў сябе вінаватым і пісаў губернатару доўгія тлумачэнні. Нічога не дапамагала. Тады ён, каб атрымаць даўгі, заклаў у Дзяржаўным банку 400 тыс. гарадскіх аблігацыяў і атрымаў крэдыт у 200 тыс. руб. Вярнуўшы сваё, пакінуў пасаду. Але губернатар прызнаў у 1902 г. такую “ракіроўку” незаконнай і прымусіў графа выкупіць аблігацыі ў банку і вярнуць іх. Узаемныя прэтэнзіі гораду і былога гарадскога галавы абвастрыліся. Прызначаная для вывучэння справаздачы гарадской управы за 1898–1900 гг. рэвізійная камісія наўмысна зацягвала працу. Граф так і не дачакаўся вяртання ўласных грошай.

### Смерць

Уночы з 17 на 18 студзеня 1904 г. К.Чапскі памёр у Франкфурце над Майнам ад сухотаў на 44-м годзе жыцця. Дума ўшанавала памяць былога гарадскога галавы ўставаннем. А доктар Рычард Яноўскі выступіў з чуллівай прамовай, што выклікала незадаволенасць партыі В.Янчэўскага. 4 траўня цела нябожчыка, прывезенае з-за мяжы, хавалі ў Станькаве. Сябры К.Чапскага – Эдвард Вайніловіч, Аляксандр Ельскі (аўтар некралогу ў пецярбургскім “Краі”) — вельмі высока ацэньвалі яго арганізацыйныя здольнасці і стваральную працу.

> **З успамінаў Эдварда Вайніловіча:** ***Чалавек непаспалітых здольнасцей, энэргіі, ініцыятывы, шырокіх поглядаў, чалавек працы і незвычайнай моцы. Пасля весела праведзенай у клубе ночы, на досвітку сядаў на каня і гнаў у роднае Станькава за 5 міль ад Менска, каб даць разгон эканому і вярнуцца ў горад, каб паспець на паседжанне гарадской управы і абмеркаваць праекты, якія мусілі ў будучыні запэўніць развіццё дабрабыту гораду. Магла дарога ад вакзалу да гораду быць завузкай, але ён яе выбрукаваў; мог электрычны генератар ці водаправодная помпа быць занадта***

***слабымі, магла конка функцыянаваць дрэнна – але горад ужо ніколі не вярнуўся да дарогі сланай фашынамі, газавага асвятлення, да ваджэння вады бочкамі і разбітых амнібусаў.***

**Няздзейсненыя праекты**

Газета “Голос провинции” пісала ў 1906 г.: “Паслужы граф яшчэ пару гадоў – і Менск стаў бы Парыжам”. І сапраўды, для такога меркавання былі пэўныя падставы.

У 1893 г. гарадскі галава займаўся праблемай забеспячэння горада таннымі дровамі і лесаматэрыяламі. Каб выціснуць з дравянога гандлю пасярэднікаў, меў намер стварыць пры Менскім таварыстве сельскай гаспадаркі лясны двор. Гэтую ж ідэю імкнуўся правесці і праз гарадскую думу. Але стыхія рынку аказалася мацнейшай за жаданне графа хоць неяк урэгуляваць яго.

У тым жа годзе ён прапанаваў Менскаму таварыству сельскай гаспадаркі стварыць таварыства сухой асенізацыі з мэтай перапрацоўкі гарадскіх выкідаў ва ўгнаенне для сельскай гаспадаркі. Ідэя К.Чапскага дагэтуль не рэалізаваная.

У 1896 г. пачалася распрацоўка праектнай дакументацыі на пабудову каналізацыі. Дума большасцю галасоў адмовілася выдзеліць неабходныя сродкі. Тады К.Чапскі з ўласнай ініцыятывы звярнуўся да інжынера Дроса з просьбай распрацаваць адпаведны праект. У 1898 г. праца была завершана. Але і тады дума не згадзілася аплаціць заказаны праект, як ні пераконваў яе гарадскі галава. Расчараваны граф з прыкрасцю заўважыў, што менчукі баяцца нават слова “каналізацыя”, як тая бабулька слова “граматыка”. Грошы давялося плаціць з уласнай кішэні. У Вільні ж першыя 5 км падземнай каналізацыі з’явіліся ўжо ў 1899 г. Як жа непрыемна было графу прайграваць у гэтай гонцы !

У канцы 1898 г. менская гарадская дума на чале з гарадскім галавой падрыхтавала праект усеагульнага абавязковага і бясплатнага навучання дзяцей ад 7 да 12 гадоў, які Мікалай II проста высмеяў. Менск на 10 гадоў апярэдзіў падзеі, звязаныя з такой жа ініцыятывай расейскага земства ў 1908 г.

У 1901 г. К.Чапскі ўзнавіў ініцыятыву аб адкрыцці ў Менску ўніверсітэту.

Своеасаблівай “лебядзінай песняй” гарадскога галавы стала падрыхтоўка да Менскай сельскагаспадарчай выставы 1901 г. Сам граф прадстаўляў на ёй калекцыю лясных флянсаў, кароў і быкоў шведскай, тырольскай і галандскай пародаў, пародзістых коней і сабак, а таксама керамічныя вырабы (дрэнажныя трубы, дахоўку і цэглу) з уласнага маёнтку Станькава Менскага павету. Дрэнажныя трубы, пэўна, прызначаліся для няздзейсненага праекту каналізацыі Менска…

Увогуле, усё сведчыць пра тое, што К.Чапскі меў грандыёзны праект паэтапнай “вестэрнізацыі” Менска. Ажыццявіць яго цалкам не ўдалося. Перашкаджалі губернскія ўлады, зайздроснікі з муніцыпальных служачых, стан здароўя.

**Прадпрымальніцтва**

Дзейнасць К.Чапскага не абмяжоўвалася гарадскімі справамі. У сваім улюбёным Станькаве ён змог наладзіць узорную для таго часу гаспадарку. Найбольш

прыбытковым было броварства. Гаспадар не толькі выробляў спірт, але і паспяхова гандляваў ім. Меў у Менску гуртовыя склады і шынкі. Пасля ўвядзення ў 1896 г. дзяржаўнай манаполіі на продаж спіртных напояў, стаў адным з заснавальнікаў Менскага таварыства броварных заводчыкаў, якое збывала спірт па ўсёй Расеі. Сядзіба Таварыства знаходзілася ў доме графа Чапскага на вул. Падгорнай. На заводзе ў Станькаве спірт ачышчаўся халодным спосабам, разліваўся ў бутэлькі і пастаўляўся дзяржаўнаму скарбу. Вялікую ўвагу граф надаваў сяброўству ў Менскім сельскагаспадарчым таварыстве. Ягоная дзейнасць у гэтай славутай арганізацыі, што гуртавала абшарнікаў-каталікоў не толькі Менскай, але і суседніх губерніяў, і сталася галоўным асяродкам эканамічнай самаарганізацыі і тэхналагічнага пераўзбраення *краёўцаў***,** рабіла Чапскага дзеячом краёвага маштабу.

Даволі часта ён выступаў у Таварыстве з навуковымі рэфератамі. Дамогся для яго права выконваць ролю галоўнага агента маскоўскага Паўночнага страхавога таварыства ў так званым Паўночна-Заходнім краі, а ў далейшым сканцэнтраваў гэтую справу ў адмысловым Менскім таварыстве ўзаемнага страхавання землябробаў. Шмат зрабіў К.Чапскі і для таго, каб зацікавіць упраўленне Лібава-Роменскай чыгункі застацца ў Менску. Ён нейкім чынам яшчэ знаходзіў час і для працы ў рэвізійнай камісіі акцыянернага таварыства запалкавай фабрыкі “Маланка” ў Мазыры.

> Самы вядомы сучаснаму сярэднестатыстычнаму беларусу з усіх аспектаў дзейнасці К. Чапскага – гэта, безумоўна, ягоная спроба заняцца піваварствам. Выкуплены яшчэ ягоным бацькам на пачатку 1890-х гг. у мяшчанаў Фрумкіных драўляны бровар (заснаваны ў 1864 г.) быў пераўтвораны ў буйное акцыянернае таварыства “Багемія”, а ў 1893 г. узведзены мураваны будынак новага бровару, які, на шчасце, захаваўся да нашых дзён. Аднак захапленне Чапскага піваварствам працягвалася не так і доўга. Каля 1897 г. ён прадаў “Багемію” самым спрактыкаваным півáварам краю – братам Лекертам, якія ўжо валодалі значнымі броварамі ў Гомелі і Магілёве, і такім чынам утварылася самая буйная піваварная група Беларусі, якая праіснавала да 1918 г.

**Разлік гораду са спадкаемцамі Чапскага**

Нябожчык К.Чапскі быў выдатным прадпрымальнікам і муніцыпальным дзеячом. Аднак пасля смерці на ім ляжаў цень злачынцы. Толькі ў канцы 1904 г. камісія, якая амаль чатыры гады вывучала справу памерлага графа, прадставіла гарадской думе сваю справаздачу. Чапскага абвінавацілі ў спекуляцыі гарадской зямлёй і зрабілі налік у памеры 243 тыс. руб. Пасля тлумачэнняў апекуноў некаторыя налікі думай былі адменены. У выніку рэвізійная камісія не змагла задаволіць ніводны бок канфлікту і была распушчаная. Крыху пазней, 14 снежня 1904 г., дума ўвогуле прызнала неабгрунтаванасць усіх налікаў на былога гарадскога галаву. Больш за тое, яна пагадзілася выплаціць спадкаемцам К.Чапскага доўг гораду, выбрала камісію для канчатковага разліку з імі і выказала пажаданне завяршыць гэты разлік палюбоўна. Новая камісія працавала два гады. На гэты раз яе высновы былі зусім іншыя. 30 кастрычніка 1906 г. дума на падставе справаздачы камісіі вырашыла выплаціць Чапскім каля 105 тыс. руб. пасля рэалізацыі гарадскіх аблігацыяў, бо гэтыя грошы граф выклаў на патрэбы, якія планавалася пакрыць праз аблігацыйную пазыку (пашырэнне водаправоду, брукаванне Траецкага рынку, іншых вуліцаў). Прадстаўнікі графскай сям'і пагадзіліся прыняць і гэтую, у два разы меншую, суму, каб больш не звязваць добрае імя нябожчыка з судовай справай да гораду, якому ён прысвяціў сваё жыццё. Тым не менш менскі губернатар рашэнне думы прыпыніў. Міхал Валовіч, апякун над

малалетнімі дзецьмі К.Чапскага, мусіў скардзіцца міністру ўнутраных справаў. І толькі ўмяшальніцтва Пецярбурга пакінула рашэнне думы ў сіле. У шматгадовых судовых справах нарэшце ставілася кропка.

Губернская адміністрацыя тройчы (1900, 1906, 1910) рэвізавала муніцыпальную дзейнасць К.Чапскага, але ніякага крыміналу так і не знайшла. Адсутнасць калегіяльнасці ў дзеянні управы, заблытанасць справаводства, разбэшчанасць служачых. Так, усё гэта было. Але не больш за тое. Урэшце, пасля чарговай рэвізіі гарадскага самакіравання ў сакавіку 1910 г. губернская камісія не магла не адзначыць, што дзякуючы “шырокай ініцыятыве і дзейнасці нябожчыка графа” гарадская гаспадарка Менска набыла значны размах. Недарэчнае абвінавачанне ў прысваенні К.Чапскім гарадскіх грошай даказаць было немагчыма. Насамрэч гарадскі галава фактычна займаўся дабрачыннасцю — цярпліва чакаў, пакуль напоўніцца гарадская каса, а ў 1894 г., як вядома, увогуле адмовіўся ад дзяржаўнага жалавання, — а гэта 3000 руб. штогод. Граф і ў сваім маёнтку пабудаваў уласным коштам шпіталь для лячэння заразных хваробаў у навакольных жыхароў.

**Эпілог**

З гадамі жарсці ўляглiся. Значнасць справаў К.Чапскага станавілася ўсё больш відавочнай. Нават былыя крытыкі прызнавалі графа выдатным муніцыпальным дзеячом, які мае велізарныя заслугі перад горадам. 11 гадоў на пасадзе *мэра* нашай сталіцы — перыяд ці не самых ініцыятыўных рэформаў гаспадаркі і культуры гораду за ўсю гісторыю. Такіх тэмпаў развіцця ён, бадай, ніколі не ведаў. Чапскі інстынктыўна адчуваў будучы сталічны статус Менска, імкнуўся надаць яму еўрапейскі выгляд, бляск і саліднасць не меншыя, чым мелі калі не Пецярбург з Масквой ды Варшавай, дык, прынамсі, Вільня з Кіевам: задача не з лёгкіх. Можна сказаць, пры ім за адно дзесяцігоддзе Менск з правінцыйнага губернскага гарадка зрабіўся сапраўдным сучасным еўрапейскім горадам. Яшчэ пры жыцці К.Чапскага называлі *пераўтваральнікам Менска*. У 1909 г. гарадская дума абмяркоўвала хадайніцтва аб перайменаванні вул. Міхайлаўскай (цяпер Камуністычная) у вул. К.Чапскага, але, на жаль, далей абмеркавання справа не пайшла. Не ўганараваны граф і званнем пачэснага жыхара Менска. Наўрад ці робіць гонар і нам, менчукам XXI ст., што памяць самага энэргічнага, адукаванага і бескарыслівага з выбарных кіраўнікоў нашага гораду дагэтуль ніяк не ўшанаваная. Толькі сціплы стэнд у экспазіцыі “Старажытная геральдыка Беларусі” Нацыянальнага музею нагадвае пра слаўнае мінулае роду Чапскіх. Жыццё з цяжкасцю мяняе нас. У пачатку 1960-х гадоў удава былога знакамітага гарадскога галавы, якая яшчэ жыла тады ў Рыме, прыслала ўраду БССР ліст з прапановай прыняць на захаванне асабісты архіў К.Чапскага, але камуністычны ўрад адмовіў ёй.

***Захар ШЫБЕКА*** **zachar@urbis.lingvo.minsk.by**

**Крыніцы:**

НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі): Ф.1, воп. 1, спр. 2375, 3159. (Ацэначныя ведамасці нерухомасці Менска за 1891 і 1897 гг.); спр. 2916. (Гарадскія выбары 1897 г.); спр. 3411. (Каштарыс горада на 1897 г.); спр. 3783. (Матэрыялы рэвізійнай камісіі 1900 г.); спр. 4525. Матэрыялы рэвізійнай камісіі 1906 г.; спр. 5730. Матэрыялы рэвізійнай камісіі 1910 г.; Ф. 24, воп.1, спр.3447. (Рэалізацыя гарадской аблігацыйнай пазыкі. 1898—1907 гг.) Ф. 295, воп. 1, спр. 5169. (Данос губернатару на К.Чапскага. 1890 г.).

РДГА (Расейскі дзяржаўны гістарычны архіў): Ф. 567, воп. 11, спр. 5231. (Хадайніцтва менскага гарадскога галавы К.Чапскага аб увядзенні ў горадзе абавязковага бясплатнага навучання дзяцей); Ф. 1287, воп. 41, спр. 1129. (Справа К.Э.Чапскага) ; воп.36, спр. 235. (Разлік г.Менска са спадкаемцамі К.Чапскага).

Kraj. 1904, № 4.

Наша Ніва. 1913, № 9, 1 сакавіка.

Журнал общего собрания Минского общества сельского хозяйства 12 декабря 1893 г. Минск, 1894.

Сведения о деятельности Минской городской думы состава 1909—1913 гг. за 1909 г. Минск, 1910.

Czapska M. Czapski (Hutten) Karol Jan Aleksander (1860—1904) // Polski Słownik Biograficzny. T.IV, Kraków, 1938. S. 190—191.

Шыбека З. Менск у складзе Расійскай імперыі (культурны генезіс будучай сталіцы) //Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства: Матэрыялы III Міжнароднага кангрэса беларусістаў... Менск 2001. С. 196—199.

## Прыбытак ці ўратаванне душы?

## Крэдыт і ліхвярства ў Беларусі XVI—XVII стст.

**Ігар МАРЗАЛЮК**
**(Магілёў)**

Пазыка... Слова гэтае трывожна гучыць для чалавека, які апынуўся ў складаным фінансавым становішчы. Сёння ў Беларусі паміж сабой "ваююць" дзве асноўныя формы "пазыкі" – юрыдычна аформлены крэдыт (пад працэнты, пад заклад уласнасці) ды "сяброўска-братэрска-суседская" беспрацэнтная пазыка. У апошнім выпадку грошы часцей за ўсё даюцца сваякам, сябрам пад "слова сумлення". Браць працэнты з радні, а тым больш натарыяльна афармляць умовы пазыкі, лічыцца на масавым узроўні благім тонам, сведчаннем асаблівай прагнасці таго, хто пазычае. Ці заўсёды было так? Паспрабуем распавесці пра крэдытныя рэаліі Беларусі XVI—XVII стст.

Як вядома, стаўленне да працы ў сярэднявеччы было дваістае. Неабходнасць працаваць – наступства першароднага граху. Абагачэнне і накапленне ёсць справа грахоўная. Багацце і маёмасць не могуць служыць толькі асабістаму ўзбагачэнню – чалавек мусіць мець роўна столькі ўласнасці, колькі неабходна для існавання. Той, хто шукае прыбытку, – грашыць. Навечна ў пекла трапяць тыя, хто, набыўшы вялікія ўласнасці пры жыцці, скарыстоўваў іх толькі для асабістага ўжытку, не дапамагаў бліжняму і тым парушаў найважнейшыя прынцыпы хрысціянскай этыкі. Запасіць багацце толькі для сябе – значыць жыць "свінскім" жыццём, прыпадабняцца да злачынцаў, якім няма спадзявання на Збаўленне.

Той, хто нажываецца на вечных і нязменных для ўсіх людзей каштоўнасцях, – найбольш подлы і агідны грэшнік, бо ён імкнецца атрымаць прыбытак з таго, што дадзена ўсім людзям Богам бясплатна. Такім злачынцам, якому няма надзеі на збаўленне, з'яўляецца найперш ліхвяр – бо ён нажываецца на часе, які дадзены ўсім людзям як Божы дар. Ужо ў помніку XII ст. "Хаджэнне Багародзіцы па пакутах" адна з самых страшных пакутаў на "тым" свеце чакае менавіта яго: И оувиде святая Богородиця моужа висящ за нозе. И чървье ядяхоу его. И въпроси ангела кто сь есть. Что ли грех сътворилъ есть. И рече к ней архистратигъ. Сь есть иже приклады имаше на злато свое и на сребро. И за то на векы моучиться[1]. Незаконна нажытае багацце разглядаецца ў "Пролагу" як від рабунку, прысваення агульнай маёмасці: "мздоимец, резоимец, сребролюбец и грабитель" – чатыры колы калясніцы, якой кіруе вознік – Сатана. Ліхвяр не ведае літасці ні да кога з людзей, нават да сваіх блізкіх, ён самы небяспечны з усіх "драпежцаў".

Ён не мае аніякіх шанцаў на выратаванне, на ласку Божую, бо служыць Мамоне. Д'яблава вынаходніцтва – грошы – для яго самадастатковая і самакаштоўная вартасць.

Згодна з традыцыйнай царкоўнай дактрынай Госпад даў шэраг дабротаў усім людзям у вечнае карыстанне задарма: Двоякии речи заровно дал Бог всем человеком, внутрныи и зевнутрный: внутрный сут, розум и воля, которыи ся в самом посполитом прироженю чловечом найдуют. Зевнутрный, который в оздобе и в пожитках своих под смыслы людскии подпадают: тыи суть, небо, слонце, месяц, звезды, огонь, въздоух, вода и земля, и все што колвек ест в них и на них: все то заровно всем добротливый Бог дал: ровно все тое межи сыны свои розделил: все тое однолко в оужитку своем мают грешный як и справедливый[2].

У “Дыёптры”, выдадзенай у 1612 г. у Еўі, змешчана надзвычай выразная, характэрная для традыцыйнай праваслаўнай этыкі, характарыстыка ліхвяра: Лихоимец сей же ест идолослужитель не имет достояния в Царствии Христа Бога. Никто же есть мучительнейшее в мире якоже лихоимец. Лихоимец любви не имат, матери али братий не познавает, и своих равно с внешними вменяет: Ничтоже ест злее, паче лихоимца. Иные аще и повреждают себе, обаче прочих некако пользуют, лихоимец всех обще вредит, егда бо скрывает благая земленная наводит плодолетнюю скудость. Никтоже нищетою съгневаем ест, якоже лихоимец, той сам ест вина своему окаянству. Лихоимец недостоин ест съпребывания аггел небесных и человек земных, сего ради сподабается погребения Июды предателя, иже желания сребра, продал Исуса Христа Спаса нашего. Лихоимец прежде приобретения, приобретению предается; преже ловатвы, оуловлен бывает. Горит зде огнем желания; и посему горети имат огнем геенским [3].

У XVI ст. адбываюцца надзвычай сімптаматычныя змены ў стаўленні гарадскога насельніцтва і часткі шляхты да ліхвярства. Калі да XVI ст. гэтай самай “бруднай” для хрысціяніна справай займаліся толькі “жыды”, то цяпер у іх з’яўляюцца шматлікія канкурэнты як у асяроддзі шляхоцтва, гэтак і хрысціянскага мяшчанства. Падкрэслім, што афіцыйнае стаўленне да ліхвярства і каталіцкага касцёлу, і праваслаўнай царквы ў гэты час заставалася нязменным – гэты занятак трактаваўся як несумяшчальны з хрысціянскімі этычнымі нормамі. Але факт застаецца фактам – менавіта ў той час прага атрымання максімальнага прыбытку ад “ліхвы” стала значна больш прыцягальнай ды прывабнай для заможнай часткі “паствы”, чым страх перад адказнасцю за такія ўчынкі на тым свеце.

Змены ў стаўленні да ліхвы і ліхвярства ды спробы “рэабілітацыі” пазыкі з працэнтамі выразна прасочваюцца ў трактаце слыннага прафесара Віленскай акадэміі, украінца з паходжання, езуіта Марціна Сміглецкага. У прадмове да эканамічнага трактату “Аб ліхве...” (O lichwie..., 1596) Сміглецкі прызнаваў працэнты за пазыкі для капітальных укладанняў (ratio capitalis), а працэнты ад спажывецкага крэдыту (ratio mutui) лічыў неабгрунтаванымі. Спасылаючыся ў якасці прыкладу на гандаль збожжам, Сміглецкі тлумачыў, у якім выпадку працэнт бывае ліхвярскім. Ліхва прысутнічае тады, калі пазычаецца пэўная колькасць дрэннага зерня, з мэтай, каб было вернута столькі ж добрага, але ж добрае зерне каштуе больш за дрэннае. Аднак калі зерне адзычваецца тады, калі яно з'яўлялася больш танным, а вяртаецца, калі яно падаражэе, усё роўна трэба вярнуць тую ж колькасць. У гэтым выпадку Сміглецкі трымаўся аўтарытэту Фамы Аквінскага: паколькі час не належыць чалавеку, то чалавек і не можа прадаць таго, чым не валодае [4].

Цікавасць шляхты ВКЛ да крэдыту яскрава бачная ў яе просьбе да манарху аб заснаванні пазыковага банку з прыбыткаў манетнага двара (1584 г.): люди, потробуючи пенезей, великую интересу, – до цалого гроша, а некоторыи и большей, дають от копы на тыдзень (больш за 87% ў год – І.М.) за чим сынове земские ку убоству приходят. Разам з гэтым, хадайнічаючы аб заснаванні банку, шляхта прасіла, каб пасля яго адкрыцця ніхто не наважваўся даваць грошы ў “ліхву”, бо не толькі купцы, пакінуўшы гандаль, займаюцца ліхвярствам, але і некоторые з стану рицерского, покинувши господарство пристойное, на лифу пензи дают [5].

Сміглецкі імкнуўся таксама абумовіць шэраг выпадкаў, калі атрыманне працэнту апраўдваецца і не лічыцца грэшным. Такімі выпадкамі ён лічыў рэнту з уласнай маёмасці, удзел у аперацыях купцоў, сам гандаль ды на гэта падобнае. Калі б крэдытор мог з прыбыткам скарыстацца з грошай, але сябар ці хто-небудзь іншы просіць

пазычыць, тады спагнанне працэнту апраўданае, незалежна ад мэты скарыстанай пазыкі. Сміглецкі рашуча апраўдвае і банкаўскі прыбытак. Апошні ён ахарактарызаваў як кампенсацыю банкіру за працу, як узнагароджанне пры пераводзе грошай з адной краіны ў іншую, бо ў такім выпадку купцу не трэба рызыкаваць і клапаціцца аб перавозе грошай. Езуіцкі прафесар нават прызнаваў прыбытак ад абмену грошай! "Гэта не ёсць ліхвой, бо ліхва з'яўляецца, калі пазычаюць, а не абменьваюць" [6].

Знаны гэбрайскі гісторык Бершадскі вельмі пераканаўча паказаў, што занятак гандлем і даванне грошай у "рост" у шляхоцкім асяродзі ў XVI ст. быў звычайнай з'явай. Ліхвярства ўжо настолькі не супярэчыць шляхоцкай годнасці, што нават Статут 1588 г. не забараняе шляхце займацца гэтым заняткам! Гэтае права выразна сфармулявана ў 24-м артыкуле 3-га раздзелу Статуту "О шляхте, которые, именья свои попрадавши, лифою се бавять". Уставуем: естлибы который шляхтич именье свое продавши, в месте мешкаючи, з лифы жил, уникаючи службы земское военное, таковые предсе з сумы своее пенежное винни службу земскую служити водле уфалы на он час соймовое, под утраченьем всего добра своего[7]. Як бачым, занятак шляхцічам ліхвярствам не цягне за сабою страты прыналежнасці да шляхоцкага стану. Ён толькі абавязаны, як і раней з маёнтку, несці земскую ваенную службу.

Тыя самыя змены выразна прасочваюцца і ў бюргерскім асяроддзі. Паказальны прыклад Магілёва. Васіль Мялешка грунтоўна прааналізаваў умовы, на якіх выдаваліся грашовыя крэдыты для правядзення гандлёвых аперацыяў магілёўскім мяшчанам у XVI – першай палове XVII ст. Умовы крэдыту былі надзвычай разнастайныя. Большасць дакументаў сведчыць, што грошы браліся ў крэдыт не пад працэнты, але такія ўмовы крэдыту распаўсюджваліся не на вялікія сумы, яны выдаваліся на непрацяглы час. Зрэшты, нават у такіх выпадках абавязкова абумоўлівалася, што, калі грошы не вярталіся ў дамоўлены тэрмін, крэдытор меў права забраць тавар у вінаватага на гэтую суму за 50% яго кошту. Такі варыянт са "схаванай працэнтнай стаўкай" фармальна не канфліктаваў з традыцыйнай праваслаўнай і каталіцкай дактрынамі. Але не былі рэдкімі і выпадкі, калі грошы даваліся пад працэнты. Мінімальная стаўка складала 6%, але ў большасці выпадкаў даходзіла да 10–20%. Асабліва высокі працэнт выплочваўся пры кароткатэрміновых крэдытах. Сярод ліхвяроў мы сустракаем не толькі гэбраяў, але і мяшчанаў–хрысціянаў і нават… праваслаўных святароў! Першая згадка пра ліхвярскую аперацыю паміж хрысціянамі датаваная 1578 г. Заможны магілёўскі праваслаўны святар-ліхвяр (!) Павел Пашкоўскі ў кошт кампенсацыі за пазычаныя ім 6 коп грошай літоўскіх магілёўцу Юрку Апанасавічу забраў у апошняга книгу Апостола …кгды гроши позычал, от каждое копы на тыден по шести грош мел ми дават, за которые гроши мне тую книгу дал, а истизны и тепер еще не оддал[8]. Магілёвец Юрка Апанасавіч абавязаўся плаціць папу Пашкоўскаму за ўзятыя ў таго 6 коп грошай літоўскіх па 6 грошай у тыдзень. Працэнт у дадзеным выпадку велізарны, памеры яго дасягалі кошту пазыкі. Яшчэ большы працэнт, які значна перавышаў памеры пазыкі, атрымаў поп Узнясенскай царквы з магілёўскіх гандляроў мясам Івана і Тараса Крывошыных. Яны ўзялі ў яго крэдыт 26 коп грошай літоўскіх, за што абавязаліся штотыднёва ўносіць па 5 пенязяў у выглядзе працэнту. Аднак паколькі на працягу сямі гадоў яны не выконвалі сваіх абавязкаў, то святар-крэдытор патрабаваў праз суд выплаты ўсёй сумы ў памеры 116 коп і 24 грошаў літоўскіх[9]. Прыклады паказальныя і кажуць самі за сябе. Не толькі цывільныя, але і святары ў гэты час не грэбавалі даваць грошы ў "ліхву".

На пачатку XVIII ст. уніяцкая царква паспрабавала знайсці своеасаблівы кампраміс паміж катэгарычнай забаронай ліхвярства і натуральным імкненнем уласніка грошай атрымаць нейкую выгаду ад пазычаных сродкаў. У новай кадыфікацыі царкоўнага

права ўніяцкай царквы, выдадзенай у 1722 г., адразу пасля Замойскага сабору, прапаноўвалася наступнае рашэнне праблемы: Что належит сохранити в пожичаню? Ответ: Кто пожичает, не может лихвы брати, может еднак от ста золотых пожичоных, золотых седм, взяти на рок, бо хотяй бы не пожичив, может себе человек заробити през Гандель, седм золотых, от ста золотых. Кто зась важил быся, больше брати, такий называется Лихвяром, не повинен быти припущоный до Причастия, до Споведы, не может никто быти, при его Тестаменте, и не повинен быти, ани в церкви, ани на цментаре погребенный[10].

Актавыя кнігі XVII ст. фіксуюць яшчэ адну даволі нечаканую з'яву – манаскую уласнасць. Не царкоўную, а менавіта прыватную ўласнасць законнікаў і законніц. Ім належалі землі, крамы, яны праводзілі гандлёвыя аперацыі. Вельмі паказальны тастамант 1662 г. ігумена магілёўскага брацкага манастыра Іосіфа Гаўрылавіча Азаровіча. Азаровічы былі адным з найбагацейшых магілёўскіх мяшчанскіх родаў XVII ст. Сярод ягоных прадстаўнікоў шмат хто звязаў свой лёс з царкоўнай кар'ерай. Іосіф Гаўрылавіч, яго дзядзька Арсен і брат Філарэт, – усе сталі манахамі. Але да самае смерці, не складаючы сану, захоўвалі ў прыватнай уласнасці нерухомасць, мелі крамы, давалі грошы ў крэдыт і атрымоўвалі прыбытак з гандлю[11].

Надзвычай важным фінансавым дакументам выглядае і тастамант уніяцкага мітрапаліта Антонія Сялявы, датаваны 1670 г. Як вынікае з гэтай крыніцы, мітрапаліт не грэбаваў крэдытнымі аперацыямі. Прычым, ізноў-такі, грошы гэтыя былі не манастырскія, а яго ўласныя, прыватныя сродкі. Сялява завяшчае па двух сваіх векселях на Лазару Майсеевічу віленскім гэбраю, "фактары Яго каралеўскай Вялікасці, трыццаць тысяч злотых польскіх", на царкоўныя патрэбы. 20 тысячаў ён ахвяраваў менскаму жаночаму манастыру пры царкве Св. Духа, а таксама загадаў, каб "чынш" ад гэтай сумы памерам у 2 тысячы (пад гэтым эўфемізмам хаваюцца тыя самыя працэнты-ліхва) гэбраі ў пэўны тэрмін выплочвалі на жаночы манастыр. Рэшту сумы – 10 тыс. залатых, ён аддаваў на Святую Сафію Полацкую. Па другім вексялі мітрапаліту быў вінен 10 тысячаў Стэфан Белiковіч, падваявода Віленскі. З гэтай сумы Сялява падараваў тры тысячы пляменнікам Фёдару, Данілу і Івану, а 2 тысячы – пляменніцы Гальшцы, на пасаг. Яшчэ 2000 залатых было выдаткавана другой пляменніцы мітрапаліта, Тарэсе Дубянецкай, у полацкі жаночы манастыр пры царкве Святой Сафіі. Прычым грошы гэтыя мусілі быць адданыя "ў жыдоўскую сінагогу, каб штогадовы прыбытак з іх ішоў у манастыр"(!), на ўтрыманне яго пляменніцы да канца яе жыцця, а пасля яе смерці на тую ж суму павінна была быць прынята на яе месца, у манастыр, адна дзеўчына з яго сваякоў. Яшчэ дзве тысячы пайшло на ўнучак, "сірот пасля смерці шурына яго", нябожчыка Віславуха. Тысячу – брату Івану Сяляву і яго жонцы. Архіепіскапу полацкаму, у кошт кампенсацыі за свае пазыкі "на царкоўных полацкіх маетнасцях", на выкуп гэтых царкоўных маёнткаў, Антоні Сялява пакінуў " дзве тысячы злотых з "пажыткам" (працэнтамі), пазычаных у яго Янушам Кішкам, ваяводам полацкім, які не аддаваў доўг і працэнты за 10 гадоў. "Чацвёртую суму маю, чатыры тысячы злотых, вінную мне па пазыцы (na oblig winną), панам Марцыянам Валовічам, пісарам земскім Віленскім" мітрапаліт ахвяраваў "на царкву мінскую Святога Духа, дзе буду пахаваны"[12].

Як бачым, рэальныя паводзіны ў штодзённым жыцці і царкоўныя максімы па гэтым пытанні выразна канфліктавалі паміж сабой. У смяротны грэх упадалі і люд цывільны і святарства...

Асобна варта сказаць пра крэдытныя аперацыі беларускіх праваслаўных, рыма-каталіцкіх ды ўніяцкіх манастыроў – сапраўдных іпатэчных банкаў таго часу! Яны

паспяхова канкуравалі з гэбрайскімі ліхвярамі ў барацьбе за крэдытаванне шляхты ды магнатаў. Манастырскія крэдыты даваліся звычайна на ўмовах закладу маёнтку за выдаткаваную суму. Такім чынам фармальна знікалі прыкметы ліхвярства – працэнт "хаваўся". Але ў выпадку нявыплаты ў тэрмін часткі сумы з даўжніка спаганялі працэнты да сумы ў якасці кампенсацыі. Сярод усходнебеларускіх праваслаўных манастыроў вылучаўся размахам сваіх крэдытных аперацыяў Куцеінскі праваслаўны брацкі манастыр. У 1637 г. куцеінскія манахі звярнуліся са скаргай на ўладальніцу маёнтку Аболле, шляхцянку Швяйкоўскую, якой яны пазычылі 15 тысячаў залатых. Апошняя абавязалася штогод выплочваць манастыру працэнты (!). Чарняцы скардзіліся на неотданье за рок пожитку и самое истизны полтораста золотых польских ды патрабавалі ад уладальніцы, каб и пожиток, от тое сумы приходячий, по шестидесят коп грошей литовских в каждый рок яна аддавала без прамаруджвання[13]. Манастыры паўстаюць са старонак судовых кніг як жорсткія, бязлітасныя крэдыторы, для якіх самае галоўнае – атрымаць максімальны прыбытак за ўкладзеныя грошы. У іх не выклікала сантыментаў разбурэнне ды галеча ўладанняў шляхты падчас крывавага "Патопу" XVII стагоддзя. Пра гэта красамоўна сведчыць судовая справа 1655 г. паміж законнікамі Кронскага манастыру ды спадкаемцамі Уладзіслава Францавіча Радзімінскага. Манастыр пазычыў апошнім 10 тыс. залатых польскіх. Яны павінны былі штогод певную квоту, то есть по тысечу золотых польских их милостям отцом законником кронским отдавать и платить; а гды бы в которм року тот термин похибили тою пожитку не отдали и не заплатили, теды заразом скоро по оминеню того термину так самую тую ориинальную суму заплаціць. Манахі скардзіліся, што почавши в року прошлом 1654 [...] они належитое от десяти тысячей золотых польских квоты, тысяча золотых, ани самое тое капитальное сумы, также ани того особливого тысеча золотых на лист обликг винного, не отдали и не заплатили. Спадкаемцы пратэставалі супраць няслушнасці крэдытораў, апелюючы да той акалічнасці, што манахі не хочуць звяртаць увагі на спусташэнне ды вынішчэнне іх зямлі праз Маскву[14].

Не ўсялякая пазыка з лёгкасцю і ў акрэслены тэрмін вярталася да крэдытора – нават калі была належным чынам юрыдычна афармленая. Часам пазыка не вярталася цэлае стагоддзе. У 1691 г. гетман ВКЛ Казімір Сапега, як гаспадар Дуброўны, атрымаў ад магілёўскага радцы Малчановіча старую пазыку Магілёва у 8 тыс. польскіх залатых. У свой час, пасля нападу Налівайкі у 1596 г. (!), магілёўцы пазычылі гэтыя грошы ў дубровенцаў для адбудовы гораду, але ў тэрмін іх не аддалі. А аддаць грошы яны былі павінныя ў 1597 г...

Крыніцы сведчаць, што пазыкі сваякоў адзін аднаму, як правіла, натарыяльна афармляліся. Гэта характэрна і для шляхты, і для беларускіх месцічаў. Аднак былі выпадкі, калі даверлівыя бацькі, каб дапамагчы дзецям, без усялякіх папераў давалі ім грошы ў пазыку. На жаль, асобных з іх чакала чорная няўдзячнасць. У такую сітуацыю патрапіла і магілёўская мяшчанка Марына Васільева, якая пайшла ў 1673 г. скардзіцца ў магістрацкі суд на свайго сына Рыгора Васілевіча. У сына дрэнна ішоў гандаль, не хапала грошай, каб развярнуцца. І вось ён прыходзіць да маці, якая з прыроджнанай міласці сваёй як маці да сына свайго, дае яму 100 коп грошаў літоўскіх. Але шчасце не ўсміхаецца яму – і сын ізноў звяртаецца за пазыкай да маці. Яна як маці сыну свайму ў чэраве яе быўшаму...сабе сама збыўшы астатнія лахманы і запазычыўшы ў іншых людзей, дала яшчэ 70 коп грошаў літоўскіх. Грошы гэтыя былі шчаслівымі – справы ў сына хутка пайшлі на лад, ён пачаў добра зарабляць, але пра маці ды пра яе даўгі, у якія яна патрапіла праз яго, ён і чуць не хацеў. Спроба маці ў прысутнасці намесніка Спаскага манастыру айца Клімовіча прымусіць сына вярнуць грошы скончылася для яе надзвычай сумна. Сын яе лжыў, сарамаціў словамі непрыстойнымі, не раз, не два збіў, змардаваў[15]. Усё гэта і прымусіла маці шукаць праўду ў магістраце.

Якія высновы напрошваюцца з прыведзеных тут фактаў? Для беларускага месціча ды шляхціца XVI—XVII стст. у значна большай ступені, чым для паспалітых беларусаў нашага часу, была характэрная рынкавая псіхалогія, псіхалогія людзей Новага Часу. Выдаткаванне грошай "напавер" у той час выглядала хутчэй анамаліяй, чым правілам. Гэта быў час трыюмфу пісанага права і дакументу. Дакументальны крэдыт не толькі стымуляваў эканоміку, але і выхоўваў чалавека новай, гарадской, еўрапейскай цывілізацыі – ашчаднага, з накіраванасцю да максімальнай выгады, а значыцца, і арыентаванага на эфектыўную эканоміку, прататыпа ўпэўненага ў сабе "сярэдняга класа". Прывід гуляў па Беларусі, прывід капіталізму, але, на жаль, так і застаўся прывідам...

**Ігар МАРЗАЛЮК (Магілёў)**
**ihar_marzaljuk@hotmail.com**

[1] Мильков В. В. Древнерусские апокрифы. Санкт-Петербург. 1999. С. 589.

[2] Евангелие учителна албо казане на каждую неделю и свята урочистыи. Евье. 1616. Арк.23.

[3] Диоптра. Евье, 1612. Арк.103 адв, 104, 104 адв.

[4] Egidija Laumenskaitė. Pinigai ir kainos // Lietuvos Didžiosios Kunigaikštijos kultūra. Tyrinėjimai ir vaizdai. Vilnius, 2001. P. 483–484.

[5] Бершадскій С.А. Литовскиe евреи. История их юридического и общественного положения в Литве от Витовта до Люблинской уніи. Спб., 1883. С. 290

[6] Egidija Laumenskaitė. Pinigai ir kainos P. 484—485.

[7] Статут Вялікага княства Літоўскага. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мн., 1989. С.123.

[8] Мелешко В. И. Могилев в XVI — середине XVII в. Мн., 1988. С.136—137

[9] Тамсама.

[10] Собрание припадков краткое, и духовным особам потребное. Супрасль, 18.I.1722. С.125.

[11] НГАРБ. Ф. 1817. воп.1, адз. зах. 24. Актавая кніга Магілёўскага магістрата. 1662 г. Арк.652—654 адв.

[12] ИЮМ. Витебск, Вып.2. С.259—271.

[13] АВАК. Вильна, 1888. Т.15. С.2—3.

[14] Тамсама, С.84—88.

[15] НГАРБ. Ф. 1817, воп.1, адз. зах. 29. Актавая кніга Магілёўскага магістрата. 1673 г. Арк. 507.

# Панамі будзеце, панамі! або Навошта дзядзька ездзіў у Вільню

***Андранік АНТАНЯН (Вільня)***

***Алесь БЕЛЫ (Менск)***

Сярод усяго, што напісана за апошняе стагоддзе па-беларуску, паэме Якуба Коласа “Новая зямля” належыць асаблівае месца. Магчыма, нават сярэднестатыстычны выпускнік сярэдняй школы, не вельмі абазнаны ў айчыннай літаратуры, першыя дзесяць гадоў нешта цьмяна памятае пра герояў паэмы ці хоць бы ведае на памяць некалькі радкоў, пачынаючы ад “Мой родны кут…“. Пра змест і абставіны напісання паэмы, пра яе “вытокі, веліч, хараство” напісаныя дзесяткі кніжак і сотні артыкулаў. Здаецца, "Новая зямля" вывучаная ўдоўж і ўпоперак. Але ці так гэта? (Уступны абзац)

Галоўная сюжэтная лінія паэмы - спроба звычайнай сялянскай сям'і выбіцца з нястачы і татальнай залежнасці ад моцных гэтага свету, набыўшы ўласную зямлю. Цэнтральнае ж месца ў творы Коласа займае віленская выправа дзядзькі Антося, - нездарма ж “Новая зямля” і пачалася з гэтага эпізоду. Як вядома, упершыню сюжэт з паездкай дзядзькі ў Вільню выведзены Коласам у вершаваным апавяданні “Як дзядзька ездзіў у Вільню і што ён там бачыў”, надрукаваным у газеце “Вольная Беларусь” у 1918 г.. Як сведчыў сам Колас, вершаванае апавяданне, якое пазней у перапрацаванай форме склала XXVII-XXIX раздзелы паэмы, напісанае ім у сакавіку-траўні 1911 г. у мінскім астрогу, куды Канстантын Міцкевіч трапіў за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з’ездзе. Рашэнне разгарнуць аўтабіяграфічныя нататкі са свайго дзяцінства і сваё тлумачэнне маштабных грамадска-палітычных падзеяў, якія з неверагоднай імклівасцю на вачох змянялі звыклае аблічча роднага краю, у вялікі мастацкі твор прыйшло да Коласа пазней. Але спачатку - дзядзька выпраўляецца ў даўнюю сталіцу ВКЛ, у банк, каб… І адразу ж пачынаюцца таямніцы, недакладнасці, непаразуменні, якія чамусьці дагэтуль амаль не трапілі ў поле зроку прафесійных літаратуразнаўцаў ды гісторыкаў, не кажучы пра паспалітага чытача.

Трэба здаваць сабе справу, што Міцкевіч-Колас у 1911 г., падчас мінскай “адседкі”, у 1918 г., калі было на поўны голас заяўлена пра Беларускае нацыянальнае адраджэнне і калі пачалася публікацыя асобных фрагментаў паэмы, і ў 1923 г., калі ў Савецкай Беларусі разгортвалася кволая беларусізацыя, а “Новая зямля” ўпершыню выйшла поўным асобным выданнем - зусім розныя асобы. Прычым гэты пералік датаў - няпоўны. Як мы ўбачым ніжэй, у храналогію стварэння “Новай зямлі” трэба ўвесці яшчэ і дату 1907 г., і 1900-1901 гг. - калі мы сапраўды жадаем разумець, якія падзеі адбываюцца на старонках паэмы, а не адно звыкла прабягаць іх вачыма, час ад часу абвяшчаючы завучаныя, дзяжурныя, банальныя, патэтычныя лозунгі.

Паводле вершаванага апавядання 1911 г., напісанага ў разгар сталыпінскай аграрнай рэформы, Колас “пасылае” дзядзьку ў Вільню, каб ПРАДАЦЬ абрыдлую зямлю:

> На шчот зямлі. Прадаць мы хочым;
> Ужо тры гадкі, як усё хлапочам
> І з ёй ні можам развязацца.
> Уляцелі здорава, прызнацца,
> Як тая сучка у рашчыну,
> Адна разруха, трасяніна.
> Яе былі мы перш купілі,

І процьму грошай прасадзілі,
Такое дрэннае здарэнне!

Але наколькі характэрным для эканамічнай сітуацыі пачатку XX ст., ды і ўвогуле для ўсяго парэформавага 50-годдзя, было расчараванне селяніна ў прыватным валоданні зямлёй? Ці мы рачэй маем справу з поглядамі самога Коласа-сіцыліста, перадвызначанымі неаспрэчнай інтэлектуальнай модай стогадовай даўніны, калі кожнаму адукаванаму чалавеку было ясна як Божы дзень, што ўсе чыста беды чалавецтва - ад прыватнай уласнасці? Дзядзька Антось "узору 1911/1918 гг.", здаецца, не столькі вырашае канкрэтную гаспадарчую праблему, колькі выкарыстоўвае сямейную няўдачу як нагоду заявіць рашучы пратэст усяму буржуазнаму свету з яго няшчырасцю ды прыватнасцю, быццам апераджаючы на некалькі дзесяцігоддзяў рух хіпі ці забавы парыскіх студэнтаў 1968 г.

Куды ж знікае гэты Коласаў пафас усяго за 5 гадоў, паміж 1918 і 1923 гг.? Мэта паездкі ў банк у першым поўным выданні паэмы, якое, уласна кажучы, і стала вядомым шырокаму чытачу і дайшло да нас у амаль нязменнай рэдакцыі, нечакана робіцца дыяметральна процілеглай!

Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,
Каб з панскіх выпутацца пут,
І там зажыць сабе нанова:
Свая зямля - вось што аснова!

Што ж паўплывала на такую радыкальную змену настрояў Коласа? Пад канец турэмнага тэрміну ён быў ужо не юнаком (амаль 29 гадоў), і да моманту публікацыі першай рэдакцыі асобных раздзелаў паэмы (амаль 36), магчыма, перажыў тыповы для гэтага прамежку жыцця мужчыны midlife crisis. Здавалася б, можна было чакаць, што ягоныя погляды набудуць закончанасць і манументальнасць. Але трэба аддаць належнае ягоным мужнасці й інтэлектуальнай сумленнасці: насуперак пануючаму пафасу рэвалюцыйнага абнаўлення і сваім уласным ранейшым перакананням ён кардынальна пераглядае фабулу выправы ў Вільню ды ўсёй паэмы. Змена сімвалічная, асабліва зважаючы на час, калі яна адбылася. Хто б разумны наважыўся "інвеставаць" у зямлю пасля рэвалюцыі? Вядома, не рызыкнуў бы і сам Колас. Але радыкальную змену мэты дзядзькавага падарожжа можна назваць менавіта інвестыцыяй у будучыню. Хіба няма ў гэтым крутым развароце пэўнага сігналу, зашыфраванага паслання наступным пакаленням? Эзопавай мовы? Разважыўшы над тым, што адбывалася і ў Беларусі, і ва ўсёй былой Імперыі за апошнія 5 гадоў, ці не перагледзеў Колас свае ранейшыя погляды, хоць абвяшчаць свае высновы адкрыта цяпер не было магчымасці? Што было таму галоўнай прычынай - нядаўна абвешчаны НЭП, глухія звесткі пра крывавую сялянскую вайну Антонава, якія даносіліся да курскага настаўніка з недалёкай Тамбоўшчыны, паведамленні ад сваякоў ды аднавяскоўцаў з польскага боку мяжы, назіранні над савецкай рэчаіснасцю? Пра гэта мы можам здагадвацца, але з пэўнасцю ўжо наўрад ці калі даведаемся.

Так ці інакш, у канчатковым варыянце паэмы Антось едзе ў Вільню, каб КУПІЦЬ зямлю. Урэшце рэшт, гэта ёсць сумленная канстатацыя рэальнага стану рэчаў. Вядома, што Міцкевічы сапраўды набылі зямлю ў Смальгаўку на мяжы Слуцкага і Бабруйскага паветаў. Але рэальныя абставіны гэтай здзелкі з зямлёй вельмі цьмяна вядомыя нават нашчадкам паэта, не кажучы пра ўсю астатнюю нацыю. А нам бы хацелася даведацца пра пэўныя эканамічныя падрабязнасці. Цяпер, падчас агоніі сістэмы, якая здолела

“акукліць” “Новую зямлю” і выкарыстаць яе як элемент сваёй прапагандысцкай машыны, гэтыя падрабязнасці ізноў падаюцца надзвычай істотнымі і павучальнымі.

Пачнем, бадай, з узнаўлення маршруту дзядзькі Антося ў банк. Мусім прызнацца, што наўрад ці мы здолеем аднавіць маршрут блукання Антося Міцкевіча - прататыпа аднайменнага героя паэмы. Нас больш цікавіць, як рухаўся віленскімі вулкамі (дакладней, у свядомасці Коласа) менавіта літаратурны герой. З аднаўленнем (наколькі дазволіць тэкст паэмы) маршруту і іншых акалічнасцяў Антосевай адысеі, віленскія раздзелы “Новай зямлі” набрыняюць жывой крывёй, і тады банальны сюжэт з візітам селяніна ў места набудзе рэалістычнасць і рэльефнасць хоць і аналагавую, але не менш пераканаўчую за 3D і Dolby Digital. Магчыма, гэта дазволіць сучаснаму чытачу лепш уявіць схаваныя за друзам часу рэаліі паэмы, рэальныя клопаты нашых продкаў, так адрозныя ад нашых і так падобныя на нашыя.

Нягледзячы на тое, што амаль ніводная тапаграфічная кропка Вільні не названа сваім імем (за выняткам хіба Замкавай гары і лёгкапазнавальнага “праспекту”), уяўляецца магчымым з пэўнай доляй дакладнасці пракласці нанава Антосеў маршрут.

Для пачатку акрэслім храналагічныя рамкі магчымай вандроўкі ў Вільню. Яна магла адбыцца паміж дзьвюма важнымі падзеямі ў жыцці Міцкевічаў - агледзінамі зямлі і смерцю Міхала. Сучаснае коласазнаўства не выпрацавала адназначнай даты смерці бацькі паэта. Адны даследнікі лічаць, што Міхал памёр 8 лютага 1903 г., іншыя - 8 лютага 1902 г. Першыя спасылаюцца на ўспаміны сясцёр паэта, другія - на яго малодшага брата Юзафа. Але на баку другіх, здаецца, яшчэ і надпіс “1902” на магільнай пліце ў Церабяжы - могільніку, дзе пахаваны бацька. Таму дата 8 лютага 1902 г. здаецца нам больш пераканаўчай. Агляд зямлі мусіў адбыцца ўвосень папярэдняга году, магчыма, нават 1900-га, бо ад агляду да смерці Міхала мінуў пэўны час:

> А грошы йшлі, плылі, як сліна,  
> Аж высякалася чупрына  
> І брала нейкая нудота,  
> І адпадала ўся ахвота  
> Зямлю купляць і нават жыць -  
> Такая хваля набяжыць.  
> А колькі гэтай валакіты!

Тады будзем лічыць, што вандроўка Антося адбывалася недзе ў 1900-1901 гг. Было б лагічна зрабіць выснову, што падзеі, апісаныя ў паэме, таксама адносяцца да гэтага перыяду. Аднак мы верым, што падарожжа “дзядзькі Антося” як літаратурнага героя відавочна адбывалася значна пазней. Так меркаваць дазваляе той факт, што сам Якуб Колас, як сведчыць фундаментальны біяграфічны даведнік М. Мушынскага, а таксама аўтабіяграфічныя лісты да Л.Клейнбарта, у Вільню, бадай, упершыню трапіў у канцы 1906 г., а наступны раз - у траўні 1907 г. Так, вядома, што паэтаў дзядзька быў добрым апавядальнікам, але гарадскія рэаліі, Колас, праўдападобна, апісваў на падставе ўласнага досведу, ці, прынамсі, з улікам яго. Адпаведна, віленскія “здымкі з натуры” паходзяць рачэй з 1906-1907, чым з 1900-1901 гг.

Мэта візіту ў Вільню - атрыманне ў неназваным віленскім зямельным банку пазыкі пад заклад зямлі, якую так прагнулі набыць:

А першым дзелам справа пільна -
Паехаць трэба ў банк у Вільню
Навесці спраўкі, сёе-тое
Ці разрашэнне там якое.

Антось даехаў да Вільні на цягніку, маршрутам Стоўпцы-Баранавічы-Вільня. Характэрна, што герой не надта ўяўляў, якія транспартныя выдаткі яго чакаюць:

І думаў дзядзька, каб танней як,
Хоць бы за трыццаць пяць капеек -
А чым танней, тым лепш, вядома...

Але самы танны квіток ад станцыі Баранавічы да Вільні (у 3-м класе), каштаваў 2 рублі 59 капеек. Такія значныя выдаткі на транспарт не прадугледжваліся Антосем, і ён быў вымушаны ехаць "зайцам". Дарэчы, ці апісанне дзядзькавай паездкі на цягніку не ўзнаўляе абставінаў уцёкаў Коласа ў Вільню са Стаўпецкае лясное каморы ў Цёмных Лядах ў траўні 1907 г.? Апроч эканоміі, у яго меліся і дадатковыя прычыны, каб падарожнічаць incognito, бо паліцыя ўзяла з усіх удзельнікаў нелегальнага настаўніцкага з'езду падпіску аб нявыездзе.

У тэксце паэмы няма згадкі, а якой гадзіне Антосеў цягнік прыходзіў у Вільню. Але ўскосна гэта можна вылічыць па аўтарскай згадцы, што, калі дзядзька ехаў па дарозе з Баранавічаў у Вільню - узыходзіла сонца.

І вось наш дзядзька едзе "зайцам".
Тым часам сонейка ўсхадзіла,
Палёў узгоркі залаціла,
І белаватаю смугою
Туман навіснуў над вадою.

*Расклад руху цягнікоў на Палескай чыгунцы, наколькі можна меркаваць з даступных нам дакументаў, заставаўся амаль нязменным цягам доўгіх гадоў. Прынамсі, і ў 1904, і ў 1913 г. ён быў фактычна адным і тым жа. Вывучэнне раскладу наводзіць на думку, што, хутчэй за ўсё, дзядзька Антось прыехаў (ці мог прыехаць) у Вільню тавара-пасажырскім цягніком №8 Палескай чыгункі "Сарны-Вільня" ці "Роўна-Вільня", які выходзіў з Баранавічаў-Палескіх а 3:43 (ці 3:45) раніцы. То праз нейкі час па ад'ездзе мог назіраць узыход сонца. Гэты цягнік прыходзіў у Вільню а 9:50 раніцы. Наступны, 28-мы цягнік з Валыні ў былую сталіцу ВКЛ выпраўляўся з Баранавічаў а 7:17 раніцы і ў Вільні мусіў быць каля паловы другой апоўдні - але тады дзядзьку зусім бы не засталося часу на ягоны доўгі шлях да банку, знаёмства з Грышкам Верасам, на паспяховае завяршэнне крэдытных справаў, шпацыр да Замкавае гары ды яшчэ філасофскае сузіранне гораду з яе вяршыні... Калі прыняць, што падарожжа адбылося*

*неўзабаве пасля агляду зямлі ў "Заблонні" (пад восень прад сяўбою), дык найбольш верагодна, што дзядзька ездзіў у Вільню ў верасні.*

Такім чынам, на гарадскім гадзінніку 9 гадзінаў 50 хвілінаў: верасень 1900 ці 1901 году.

Антось да Вільні пад'язджае
І свой гарнітур папраўляе.

Знаёмства дзядзькі з Вільняй, калісьці слаўнай сталіцай вялікай дзяржавы, а тады губернскім горадам Расейскай імперыі, пачалося менавіта з чыгуначнага вакзалу.

Машына стала. Валіць валам
Люд у тунелі пад вакзалам,
А з ім і дзядзька цісне збоку,
Ад шэрых світ непадалёку.

Віленскі вакзал будаваўся ў 1861-1862 гг., калі праводзілася чыгунка Пецярбург-Варшава, паводле тыповага праекту, агульнага для станцыяў лінейнага тыпу, пабудаваных таксама ў той час ў Дзвінску, Коўне, Кібартах і г.д. Паводле значэння места вакзал быў аднесены да II класу (вакзалы I класу мелі Пецярбург, Масква і Адэса). Цягнік прыбыў далёка не на першую платформу, і таму, каб патрапіць у места, дзядзька мусіў прайсці праз падземны тунель.

Дзівіўся дзядзька тут нямала,
Йдучы тунелем да вакзала.
Як хітра, мудра збудавана!
Як чыста, хораша прыбрана!
А колькі вулачак і ходаў,
Палітурованых усходаў!
Там, угары, над галавою,
Ідуць вагоны чарадою!..

Калі б вандроўка Антося адбылася ў нашыя дні, то нават яму, жыхару глухога кутка, сённяшні віленскі чыгуначны вакзал не падаўся б месцам шматлюдным. Чыгуначны транспарт апошнія дзесяцігоддзі спакваля саступае ў папулярнасці аўтамабільнаму.

Першым паваротам, зробленым самастойна ў маршруце да банку, першым экзістэнцыяльным выбарам у гарадской прыгодзе, стала рашэнне, якой дарогай выходзіць з вакзалу:

Тунель тым часам раздзяляўся,
І вал сярмяжнага народу
Ідзе да правага праходу.
Паны налева важна садзяць,
Дзе іх сярмяжнікі не здрадзяць
Ні пахам дзёгцю, ні карчагі,
Ні відам латанай сярмягі.

Чаму люд падзяліўся на дзве часткі паводле сацыяльнай прыкметы? Найбольш простым (і для сучаснага чалавека - найбольш відавочным) было б тлумачэнне, што

сяляне і просты люд трымаліся правага боку, бо канчатковай мэтай прыезду для бальшыні сялянаў магло быць наведванне Хлебнага рынку (цяпер рынак Гале), які знаходзіўся (і знаходзіцца па гэты дзень) на Базыльянскай вуліцы, г.зн з правага боку ад будынку вакзалу. З таго ж правага боку і галоўная каталіцкая святыня краю - Вострая Брама. Але думка, што на правы бок падаліся пераважна пілігрымы, досыць спрэчная, бо культ віленскай Маці Божай Вастрабрамскай быў пашыраны сярод усіх сацыяльных слаёў каталіцкага насельніцтва краю, а не толькі сярод сялянаў.

Так ці іначай, наш герой трапляе на Прывакзальную плошчу і ўпершыню на ўласныя вочы бачыць Вялікае Места :

Як выйшаў дзядзька наш з вакзала,
Яму аж моташна нейк стала:
Такое пекла - шум страшэнны,
Застой паветра і дух дрэнны;
Народ таўчэцца каля конкі,
Па бруку б'юць падковы звонка,
Грымяць павозкі, буды, колы,
Аж проста глушаць балаголы -
І гэта процьма ўсякіх зыкаў
Злілася ў гул адзін вялікі,
Дзе з непрывычкі вуху цяжка.

Герой Якуба Коласа дрэнна ўяўляў свой будучы маршрут. Які банк быў яму патрэбны? У кожным сучасным, стэрэатыпным, кананізаваным выданні "Новай зямлі" сустракаецца (тройчы) толькі азначэнне "зямельны". Але на рубяжы XIX і XX стст. у Вільні былі, прынамсі, 4 установы, якія можна назваць "зямельным банкам". На наша шчасце, 3 з іх займалі ўсяго два будынкі, якія і да нашага часу стаяць адзін насупраць аднаго на галоўнай віленскай вуліцы. То задача ўзнаўлення дзядзькавага маршруту значна спрашчаецца.

Самы стары з віленскіх зямельных банкаў так і называўся: Віленскі зямельны банк - найбуйнейшы з усіх акцыянерных іпатэчных банкаў Расейскай імперыі. Надзвычай важная ў гісторыі нашага краю ўстанова. Дастаткова паглядзець на публікацыі Ф.Багушэвіча ў пецярбургскім "Краі" - ніякай іншай установе і, бадай, ніякаму іншаму прадмету Багушэвіч-журналіст не ўдзяляе столькі ўвагі, як Віленскаму зямельнаму банку. Прынамсі, 10 публікацыяў Багушэвіча згадваюць гэтую ўстанову, прычым пераважна прыхільна, асабліва вызначаючы заснавальніка, князя Пятра Вітгенштэйна.

*У зямельным банку вялікі рух: адначасова з тэрмінам аплаты падаткаў, кантрыбуцыі і найбольшых выдаткаў у сельскай гаспадарцы, а таксама разам з затрымкаю продажу лясоў - набліжаецца апошні тэрмін выплаты складак за першае паўгоддзе. Тым часам лік зямельных уладанняў, якія банк пагражае прымусова прадаць, значны. Напэўна, шмат уладальнікаў уратуюцца ў апошнюю хвіліну коштам дарагой прыватнай пазыкі, абы толькі адсунуць катастрофу крыху далей, бо іншых крыніц няма. І ўсё ж, несумненна, ахвяры будуць.* ***Ф. Багушэвіч, 1888 .***

Уласны будынак Віленскага зямельнага знаходзіўся па адрасе: Георгіеўскі праспект, 8 (цяпер праспект Гедыміна, 6). У доме, выбудаваным у 1889-1891 гг. у стылі неакласіцызму паводле праекту Вінцэнта Гарэцкага, у розныя часы частка памяшканняў аддавалася ў арэнду іншым банкаўскім установам. Досыць доўга здымаў тут памяшканне Віленскі Прыватны Камерцыйны банк, які быў арыентаваны на

крэдытаванне гандлю і прамысловасці. Абодва банкі мелі шырокія агентурную і кліенцкую сеткі ва ўсім Паўночна-Заходнім краі, пераважна сярод землеўладальнікаў і прадпрымальнікаў каталіцкага веравызнання. Гэта была тыпова “клубная” ўстанова, няпісанымі правіламі амаль закрытая для чужынцаў, адна з легальных арганізацыяў ненадзейных ліцвінаў, гатовых уцячы з расейскага дзяржаўнага карабля пры першай нагодзе.

Сёння ў гэтым будынку рэзідэнтуе Банк Літвы (нацыянальны, ці цэнтральны эмісійны паводле сваіх функцыяў). Хутчэй за ўсё, не гэты зямельны банк, з яго элітарнай, багатай, спецыфічнай кліентурай, быў канчатковай мэтай дзядзькавага падарожжа.

Скажы, паночак, як далёка
Мужычы банк?

- пытаецца ў мінака дзядзька Антось у пачатковай версіі паэмы 1911-1918 г.. Такім чынам, “зямельны” і “мужычы”... Канчаткова высветліць пытанне, у які банк ездзіў герой “Новай зямлі”, дапамагае адзін з рэдакцыйных артыкулаў “Нашай Нівы” за 1907 г.:

*На “Крестьянскій поземельный банк” (мужыцки зямельны банк) правицельства цяпер кладзець ўсе сваи надзеи, думаючы, што гэты банк паложыць канец мужыцким бунтам за зямлю... Дарма надзею пакладае правицельства на банк крэсцянски, на ўселякие камиссии зямельные: усе ихние способы ня могуць палепшыць доли мужыцкай. И зямельную справу упарадкуе тольки сам народ праз сваих выбарных людзей, а не казённые чыноўники, гдзе б яны не сядзели: ў банку, чы ў камиссиях.*

Зрэшты, “выбарныя людзі” з народу вельмі лёгка робяцца бескантрольнымі і некампетэнтнымі дзяржаўнымі чыноўнікамі, а грамада-грамадства паспяхова замяшчае таталітарную дзяржаву. Што лепш за ўласнаць, недатыкальнасць асобы, прававую дзяржаву могуць абараніць і найпышнейшага магната, і апошняга жабрака? Так ці інакш, з артыкулу “Каму служыць «Крестьянски банк»?” недвухсэнсоўна вынікае, што пад “мужычым банкам” трэба разумець дзяржаўны “Крестьянский поземельный банк”, які ў канцы XIX - пачатку XX-га стст. з’яўляўся найбуйнешым аператарам зямельнага рынку ў Паўночна-Заходнім краі. Хутчэй за ўсё, канчатковай мэтай падарожжа Антося - прынамсі, Антося літаратурнага - быў менавіта гэты банк. У беларускай мове пачатку XX ст. слова “мужык” было блізкім сінонімам слова “селянін” - фактычна рэдакцыя “Нашай Нівы” пераклала для сваіх чытачоў рускае слова крестьянский менавіта як мужыцкі.

Будынак, які мусіў знайсці ў незнаёмым горадзе дзядзька-рызыкант, літаральна праз дарогу ад будынку Віленскага зямельнага, а сёння Банку Літвы, з’явіўся на мапе Вільні ў 1886 г. Пабудаваў яго шляхціч Андрэй Снядэцкі паводле праекту Юльяна Янушэўскага. У меркаваны час дзядзькавай выправы домам валодалі пэўныя Балінскі і Завістоўскі, але на пачатку XX ст. ён ізноў вярнуўся да сям’і Снядэцкіх. Сёння ў гэтым будынку знаходзіцца Віленскі паштамт (Гедыміна, 7), а стагоддзе таму тут арандавалі памяшканні дзве дзяржаўныя ўстановы: Віленскае аддзяленне Дзяржаўнага шляхоцкага зямельнага банку і Віленска-Ковенскае аддзяленне Сялянскага Пазямельнага банку. З 1896 г. абодва аддзяленні ўзначальвала адна і тая ж асоба: стацкі саветнік Іван Аляксеевіч Літвінаў, праваслаўнага веравызнання. Можам нават пафантазіраваць - якой жа п’яўцы мусіў дзядзька Антось даць рубля за спраўку? Памочніку справавода Васілю Кудзінцаву ці памочніку бухгалтара Канстанціну

Стралецкаму? Памятныя кніжкі Віленскай губерні захавалі для нас спісы банкаўскіх супрацоўнікаў. Зрэшты, мы забягаем наперад.

Сялянскі Пазямельны банк, агульнадзяржаўная ўстанова Расейскай імперыі, пачаў сваю дзейнасць 10 красавіка 1883 г. з мэтай "аказваць сялянам садзейнічанне для набыцця ва ўласнасць прапануемых для продажу зямель". Банк выдаваў пазыкі асобным сялянам і вясковым грамадам тэрмінам ад 13 да 51.5 гадоў у памеры 80-90% ад кошту набыванай зямлі. Аддзяленні Сялянскага банку былі ўва ўсіх губернскіх гарадах Беларусі і Літвы. І нідзе больш у Імперыі дзейнасць банку не была настолькі паспяховай, як у "Паўночна-Заходнім Краі". Па выніках першага дванаццацігоддзя дзейнасці банка (1883-1895) Магілёўская губерня займала 1-е месца па плошчы набытай сялянамі зямлі, а Менская - 6-е. Пры гэтым у Магілёўскай, Віцебскай і Гарадзенскай губернях ў гэты перыяд увогуле не было выпадкаў вяртання зямлі за нядоімкі па плацяжах, а ў Менскай і Віленскай доля такіх асабістых сялянскіх няўдач склала адпаведна 1% і 3% ад усіх фінансаваных банкам выпадкаў куплі зямлі. Так упарта ўчапляўся тутэйшы селянін (вядома, працавіты і заможны) у тую самую бедную ды неўрадлівую зямельку, на якой, лічылася, растуць адны падаткі. Такіх бездапаможных бедакоў, каб вяртаць зямлю банку, якім выглядае дзядзька Антось у вершаваным апавяданні 1911 г., у нас амаль і не было. (Хадыка ў паэме прадае зямлю не банку, а непасрэдным пакупнікам, і тое дзеля таго, каб на атрыманыя грошы заняцца гандлем). Затое ў чарназёмных ды ўрадлівых Варонежскай, Пензенскай і Курскай губернях сяляне мусілі вельмі хутка развітацца адпаведна з 59, 57 і 50 % набытых у крэдыт земляў. Гэтая тэндэнцыя захавалася і ў наступнае дзесяцігоддзе (1895-1905): сярод усіх эканоміка-статыстычных раёнаў Расейскай імперыі "Паўночна-Заходні край" упэўнена займаў першае месца па колькасці закладзенай у банку зямлі.

Досыць сухой статыстыкі. Спынімся і паразважаем, што за ёй стаіць. Забітая ўскраіна імперыі, прыкметна адстаючы ад прамысловых раёнаў і навакольляў шыкоўных сталіц у тэмпах тэхналагічнага прагрэсу і ў сярэднедушавых даходах, аказваецца, лідзіравала па адным вельмі важным паказчыку: тэмпах узросту рынкавай капіталізацыі зямлі, яе мабілізацыі. Значыцца, нідзе больш у Расейскай імперыі, як у Беларусі, так хутка не йшоў працэс ліквідацыі феадальнай сістэмы і пераводу аграрных стасункаў на капіталістычныя рэйкі.

Як ні дзіўна, працэс гэты быў выгадны абодвум бакам аграрнага канфлікту. Абачлівыя абшарнікі, паны-прыгняталынікі, адчуваючы, што зямлі ўсё роўна не ўтрымаць, спяшаліся перавесці свае капіталы ў іншую, больш надзейную форму - у гарадскую нерухомасць, у фабрыкі і заводы, ў каштоўныя паперы. Сяляне ж набывалі магчымасць заняцца той справай, у якой яны маглі найлепш праявіць свае таленты і ўпартасць. Рэнтабельнасць зямлі ў сярэднім штогод зніжалася, а кошты яе раслі. Парадокс? Толькі на першы погляд. У першае парэформавае дваццацігоддзе дабрабыт былых прыгонных рэзка ўзрос, як і нараджальнасць у сялянскіх сем'ях. Але гэтае новае насельніцтва мусіла сябе недзе заняць, а брак адукацыі ды інэрцыя светапогляду не дазвалялі сотням тысячаў сялянскіх дзяцей хутка перакваліфікавацца. У горад, з яго кволай, у параўнанні з вялікарасейскімі губернямі, прамысловасцю, падавацца не выпадала: у межах "рысы аселасці" на кожнае працоўнае месца там ужо мелася шмат прэтэндэнтаў з гэбрайскай галечы. На было ў Беларусі буйных будоўляў і індустрыяльных гігантаў, хаця шмат нашых землякой падаліся у пошуках лепшай долі на украінскія шахты, у імперскую сталіцу і нават за акіян.

Выяўлялася, што ў краі сяляне могуць пракарміцца толькі з зямлі, на якой шляхцічу заставалася ўсё менш месца. Не тое каб з філантропіі, але з цвярозага разліку ён

разумеў, што зямлю ўрэшце рэшт давядзецца прадаць, - але, вядома, як мага даражэй. Ці выйграў бы шляхціч, калі б нейкім чынам прадбачыў наступныя катаклізмы і паспяшаўся ўлагодзіць сацыяльны канфлікт, прадаўшы зямлю танна і хутка, - і эвакуяваўшы ў горад прынамсі частку капіталу, заміж таго, каб губляць усё? Нават сёння, ведаючы дакладна, што адбылося за апошняе стагоддзе, вельмі цяжка адказаць на гэтае пытанне адназначна.

Парадаксальна, але, што б ні рабіў шляхціч цягам усяго XIX ст., незалежна ад таго, што ён думаў сабе пыхліва пра хлопа, ішло апошняму на карысць. Менавіта шляхта заходніх губерняў на працягу першых дзвюх трацей XIX ст. выступала ініцыятарам скасавання прыгону. Нават трагічная памылка, ліхаманкава-неабдуманы фальстарт 1863 г., абярнулася на карысць тутэйшага селяніна, з самага пачатку паставіўшы яго ў лепшыя ўмовы набыцця зямлі, чым ягонага велікарускага класавага брата.

Не дзіва, што, выкрываючы рабаўнічую эканамічную палітыку Сталыпіна ў рэдакцыйным артыкуле “Ацэнка зямлі ў крэст. банку” ад 25 траўня 1907 г., “Наша Ніва” найбольш красамоўныя прыклады пераацэнкі зямлі на карысць абшарнікаў, якая выціскала з новых уласнікаў усе сокі і часта вяла да разарэння, падавала з Варонежскай, Саратаўскай, Уладзімірскай губерняў. Але сітуацыя ў велікарасейскіх і беларускіх губернях рознілася карэнным чынам! Прыкра, што адраджэнцы-сіцылісты ўпарта не хацелі гэтага заўважаць. Махавік рэвалюцыйнага пафасу і экспрапрыятарскай рыторыкі, якія ў выніку ўкрадуць у Беларусі прынамсі стагоддзе гісторыі, калі ўвогуле не надзею на выжыванне як самастойнай нацыі, раскручваўся ўсё шпарчэй.

Паспрабуем жа быць справядлівымі да паноў-прыгнятальнікаў. Пры ўсіх заганах і выбрыках, ці не яны здолелі перадаць сваім былым прыгонным гэты імпульс імкнення да ўласнасці і незалежнасці, які паходзіць яшчэ з тых часоў, калі Вітаўт, апошні “ўсенародны суверэн” Літвы, няздольны ўтрымаць у адных руках агульнанародную ўласнасць, быў вымушаны пачаць яе раздаваць найбольш набліжаным асобам? Не задумваючыся пра гэта, Міцкевічы і Ўлашчыкі падсвядома наследавалі ідэялу, які пачаў афармляцца за 4-5 стагоддзяў да іх. Гэта і меў на ўвазе Хвядос Хадыка, калі прарочыў: “Панамі будзеце, панамі!”. Не збылося. Самая вялікая трагедыя краю, належным чынам не асэнсаваная дагэтуль, - у тым, што 100 гадоў таму Міцкевічы і Ўлашчыкі, а за імі і ўсе мы, закалыханыя сіцылістычнай дэмагогіяй, упусцілі шанец зрабіцца панамі - гаспадарамі сваёй зямлі, свайго лёсу, сваёй краіны. Таму мы і клічам цяпер адзін аднаго - “слыш, мужык”, а не “прошэ, пане” - таму што Новую Зямлю не ўдалося ўтрымаць у руках.

Няўменне адрозніваць уласнасць ад карыстання, уласцівае першабытнаму чалавеку, “Наша Ніва”, а за ёй і ўсё Беларускае нацыянальнае адраджэнне XX ст. зрабілі быццам бы абавязковым атрыбутам беларуса, які паспяхова трывае да гэтага дня і цалкам акрэслівае межы нашага існавання. Падсвядомая прага ўласнасці, самастойнасці і сапраўднай, не сфальсіфікаванай, годнасці так і не прабілася на паверхню нашай свядомасці, - ці не ў гэтым патаемны сэнс сну Міхала пра ваўка, які тоне, адчайна спрабуючы выкараскацца са здрадніцкай палонкі?

А сто гадоў таму ўсё выглядала досыць аптымістычна. Дзесяткі тысячаў новых “мікрамагнатаў”, энэргічных гаспадароў, Міцкевічаў ды Ўлашчыкаў, з неверагоднай хуткасцю паўставалі на месцы нядаўніх сотняў “даменаў вялікіх князёў”. Гэтая драматычная гісторыя 1864-1914 гг., адзінага паўстагоддзя ў гісторыі нашага краю, калі ўсе ягоныя жыхары карысталіся абмежаванай і адноснай, але асабістай свабодай,

прынамсі эканамічнай, і яе працяг у Заходняй Беларусі да 1939 г., ніколі не была належным чынам засвоеная беларускай літаратурай, навукай, ды мастацтвам - калі не лічыць “Новай зямлі”.

Вернемся, аднак, да дзядзькі Антося і правядзем яго прынамсі да банку, калі ўжо давесці яго і дайсці самім да годнага жыцця пакуль не ў нашай абладзе.

Ідзе так дзядзька і па бруку
Адзін за дзесяць робіць груку.
А дзе ж той банк? - карціць пытанне,
Так правандруеш да змяркання,
А сам туды не пападзеш
І толькі дзень дарма звядзеш.

Самым геаметрычна простым для Антося быў бы маршрут: вуліца Завальная (Pylimo) - Георгіеўскі праспект. І ўсяго нейкіх 250 метраў па праспекце ў бок Катэдральнай плошчы. Аднак дрэнна абазнаны ў тапаграфіі Вільні Антось ускладняе сваю задачу, бо пытанні, якія ён задае мінакам, застаюцца без адказу.

І дзядзька наш стаў прыглядацца,
Ў каго б дарогі запытацца,
Бо ён зрабіў адну ўжо спробу,
Спытаў чумазую асобу,
Дык тая так яму сказала,
Што лепш бы ёй няхай зарвала!
Тут дзядзька кроку падбаўляе
І пана з цэшкай наганяе;
Ступіў яшчэ ён колькі крокаў,
Да пана коціцца ён бокам;
А пан не бачыць ці не хоча
Глядзець, як дзядзька наш клапоча
І ў ім патрэбу дужа мае,
Ідзе і палачкай махае.
Тут дзядзька трошачкі прыгнуўся,
Рукою пана дакрануўся:
- Скажы, паночку, як далёка
Зямельны банк? - Пан кінуў вока
На дзядзьку скрыва так і строга:
- Спытай аб тым гарадавога! -
Сказаў і кроку пан прыбавіў.

Не дачакаўшыся адказу, дзядзька ўсё ж вырашыў сам знайсці дарогу, тым больш, што першы шок ад знаёмства з урбаністычнай культурай у яго, відавочна, прайшоў:

Памалу стаў ён разглядацца.
Э, што! няма чаго баяцца!
Ідзе вальней, глядзіць смялей.
На сэрцы стала весялей,
І трохі карк ён падымае,
На крамах вывескі чытае...

Ідылія цягнецца не так доўга, як бы хацелася герою. Вельмі хутка, страціўшы пільнасць, уцягнуты ў разгляданне шыльдаў, гэтых гіперспасылак XIX ст., дзядзька раптам натыкаецца на слуп і заўважае, што трапіў у тупік, ці тупіковы завулак.

Сцяна прад ім і сцены збоку,
Ўпярод не ступіш ані кроку -
Прапала вуліца, ды годзе!
Таўчэцца дзядзька, як у бродзе
Той сом, прыціснуты плытамі,
Што ў букце век жыў пад карчамі.
“Бадай ты спрахла! дзе ж дарога?
Нагвалт крычы гарадавога!
Куды нялёгкая загнала!”
Аж проста дзядзьку страшна стала
І з перавулачка глухога
Ідзе шукаць гарадавога.

Цяпер самы час спыніцца і паспрабаваць зарыентавацца: куды ж завялі шыльды Антося? Відавочна, што ён даволі хутка збіўся з Завальнай вуліцы, якая павінна была без асаблівых прыгодаў давесці яго да банку.

Нічога надзвычай цікавага - масавых забаваў, пілігрымак, нейкіх прыкметных помнікаў архітэктуры - на шляху Антося альбо не траплялася, альбо ён проста нічога не заўважаў. Мяркуем, што калі б дзядзька прайшоўся маршрутам: вул. Вакзальная - Базыльянская - Вострая Брама - Вялікая, - дык хоць бы нейкая дэталь віленскага ландшафту (парк каля Вострай Брамы, сама Вострая Брама, касцёл Св.Тэрэзы, Ратуша) ці землякі-пілігрымы павінны былі прывабіць вока бізнес-турыста з-пад Стоўпцаў. Але нічога такога ў паэме няма - толькі агульныя словы пра брук і тратуар. Хутчэй за ўсё, Антось абраў (ці Антося абраў) шлях, менш насычаны архітэктурнымі дзівосамі. Няма згадак пра тое, што Антось пераходзіў якую-небудзь вуліцу з інтэнсіўным транспартным рухам. Не знойдзем мы і знаку таго, што герой разважаў “пайсці налева ці направа”. Відавочна, ён рухаўся “куды ногі нясуць”. Калі ўважліва разгледзець мапу Вільні 1898 г., то робіцца відавочным, што “перавулачка глухога” можна знайсці хіба побач са скрыжаваннем Лідскага завулку і вул. Св.Мікалая. Трапіць туды ён мог наступным чынам: вул. Завальная - вул.Усіх Святых (Visų Šventųjų) - завулак Жмудскі (цяпер вул. Šiaulių - „Стралковая“). Але цікава, што ў некалькіх кроках ад гэтага сапраўды глухога завулку, ў тыя часы знаходзіўся і Глухі завулак (сапраўдная афіцыйная назва!), які зусім не быў глухім, бо злучаў Лідскі завулак (цяпер вуліца Lydos) і вуліцу Троцкую (Trakų). У сучаснай Вільні былы Глухі завулак называецца Kėdainių (вул. Кейданская). Здаецца, дзядзька мусіў заблукаць недзе ў гэтым раёне.

Мінут праз колькі з перавулка
На свет ён выбіўся, дзе гулка
Нясліся зноў страшэнна зыкі,
Дзе горад гуў многаязыкі.

“Мінут праз колькі з перавулка” можна было выбрацца альбо зноўку на Завальную альбо на Нямецкую.

Больш дакладна зарыентавацца на мясцовасці нам дапаможа дыялог Антося з гарадавым:

- Скажыце, як мне ў банк папасці?
Мне па зямельнай трэба часці.
- А вось як пойдзеш, чалавеча,
Таму касцёлу насустрэчу,
Там будзе вуліца направа, -
Пачаў казаць служака бравы, -
Ты правай вуліцы трымайся,
А там другога запытайся,
І скора банк той будзе блізка.

На Завальнай вуліцы, калі не лічыць Рэфармацкага збору (цяпер. Pylimo, 30) ані цяпер, ані тады не было будынкаў, якія б гарадавы мог назваць "касцёлам". Тым больш, калі дзядзька заставаўся на правым баку Завальнай, ён проста не здолеў бы пабачыць гэты арыентыр, бо збор ані тады ані цяпер не дамінаваў над астатнімі будынкамі гэтай вуліцы.

Калі ж уявіць, што дзядзька выйшаў праз вул. Св.Мікалая (Šv.Mykolo) прасіць паратунку на Нямецкую (Vokiečių), хоць і разы ў тры вузейшаю, чым цяпер, але тым не менш ці не самую ажыўленую ў Вільні, дык ўсё ўстае на свае месцы. Да Другой Сусветнай вайны менавіта Нямецкая была галоўнай гандлёвай артэрыяй гораду, і лепшае месца, дзе мінаку можна было паглядзець на прыгожыя шыльды, цяжка ўявіць. Зрэшты, сучаснікі Антося былі ў меншым захапленні ад Нямецкай вуліцы, чым сённяшнія госці сталіцы Літвы. Ф.Дабранскі ў шляхаводзе па Вільні 1890 г. так апісвае Нямецкую: "Вуліца выключна яўрэйская, напоўненая бруднымі і цёмнымі крамкамі і майстэрнямі яўрэяў. Па ажыўленню і руху - яна першая ў горадзе".

Адусюль з Нямецкай відаць двухгаловы барочны касцёл Св. Кацярыны (цяпер. Vilniaus, 41), акурат за якім направа адыходзіць Бенедыктынская (Benedektinų) вуліца, якая злучае Віленскую (Vilniaus) і Татарскую (Totorių).

Зрабіўшы два-тры павароты,
Людзей спытаўшы раз мо ў соты
Спыніўся дзядзька каля банка.

Натуральна, што Антось мог прайсціся і па Людвісарскай (Liejyklos), якая таксама злучае Віленскую і Татарскую. Але першая вуліца направа - гэта Бенедыктынская, і наўрад ці ён стаў бы рызыкаваць, ігнаруючы падказку гарадавога.

*Колас нідзе не кажа, што дзядзька трапіў на праспект менавіта праз Татарскую, а не праз Віленскую вуліцу. Але ўскосным сведчаннем таго, што Антось дайшоў да банку па Татарскай, можа служыць апісанне такога каларытнага для вяскоўца месца, як галоўны праспэкт "амаль сталічнага" гораду. Яно пачынаецца толькі пасля таго, як Антось са сваім новым знаёмцам больш-менш паспяхова залатвіў свае справы ў банку. Ад Віленскай да Татарскай адлегласць не такая малая для селяніна, які ўпершыню трапіў у Вільню (каля 200 м), - амаль такая ж, як і далейшы шлях ад банку да Катэдральнага пляцу (250 м), апісанне якога займае ў Коласа ледзь не сотню радкоў. А вось ад скрыжавання праспекту ды Татарскай да банку - літаральна два крокі, і таму, відаць, дзядзька - рэальны ці літаратурны - адразу кінуўся да мэты сваёй адысеі, не гледзячы па баках. І ўжо толькі выйшаўшы, пачаў азірацца. Каб трапіць у памяшканне Сялянскага пазямельнага банку, дзядзьку трэба было перайсці праз праспект, але ў паэме пра гэта нічога не гаварыцца.*

Самы час падсумаваць нашу рэканструкцыю Антосевай адысеі. Герой паэмы, магчыма, рухаўся па віленскіх вуліцах паводле наступнага маршруту: Прывакзальная плошча - Завальная вуліца - вуліца Усіх Святых - завулак Жмудскі - у раёне скрыжавання Лідскай, Св.Мікалая і Францішканскага завулку Антось мог заблукаць - на Нямецкую трапіў праз вул. Св.Мікалая, з Нямецкай выйшаў на Віленскую, затым павярнуў на Бенедыктынскую, а адтуль па Татарскай вуліцы дайшоў да Георгіеўскага праспекту і:

Спыніўся дзядзька каля банка,
Дзе ўсходы чыстыя, як шклянка,
Шырокі крок яго стрымалі.

Месца гэтае Колас ведаў выдатна. У кватэру нумар 10 у доме Хандзінскага па Георгіеўскім праспекце, 4 (праз дом ад "мужыцкага" банку, але на працілеглым баку) у красавіку 1907 г. Барыс Даніловіч перавез са старога памяшкання на рагу праспекту і Татарскай выкупленую ў Ізраіля Немзера бібліятэку "Знание". З гэтага часу 10-я кватэра ў доме Хандзінскага зрабілася адным з галоўных пунктаў распаўсюду "Нашай Нівы" ў Вільні. Колькі разоў давялося бываць тут будучаму аўтару "Новай зямлі"? У пачатку траўня-чэрвені, пакуль паліцыя не выслала яго з гораду, і з верасня па снежань таго ж 1907 г. ён, магчыма, некалькі дзесяткаў разоў прайшоў паміж двума банкаўскімі будынкамі ў дом Хандзінскага. Дарэчы, ў гэтым жа доме на Георгіеўскім праспекце, 4, месцілася і Галоўная агентура Санкт-Пецярбургска-Тульскага пазямельнага банку па Віленскай, Ковенскай і Гарадзенскай губернях - апошні, чацвёрты "зямельны банк" Вільні - ўсе чатыры на прамежку праспекту карацей за 100 метраў! Гэтага банкаўскага "пятачку" было, бадай, не мінуць нікому, хто хацеў прадаць ці купіць зямлю - прынамсі ў Віленскай, і ў значнай ступені, ў Ковенскай ды Гарадзенскай губернях. Падчас трох першых наведванняў Коласам Вільні (1906-1907 гг.) "Наша Ніва", як, бадай і ўся рэвалюцыйная прэса Расейскай імперыі, асабліва часта пісала пра дзейнасць Сялянскага пазямельнага банку. Ніколі на працягу гісторыі гэтай установы яе дзейнасць не выклікала такога гучнага грамадскага рэзанансу, як у гэты час. З канца 1906 г. менавіта Сялянскі пазямельны банк зрабіўся галоўным інструментам сталыпінскай аграрнай рэформы. Яму былі выдзеленыя дзяржаўныя грошы, і ён пачаў актыўна сам выкупляць абшарніцкія землі (не пад канкрэтнага пакупніка), выдаючы сялянам ільготныя пазыкі на іх набыццё.

Вось менавіта за 1906-1917 гг., без рэвалюцый, бунтаў, паўстанняў, сялянскае землеўладанне ў Беларусі перавысіла шляхоцкае. І гэта было ўладанне на праве прыватнай уласнасці, асвечанае і абароненае законам, які забяспечыў пераемнасць нават пры змене дзяржаўнай улады з рускай на польскую, як да гэтага, на працягу больш як 120 гадоў, ад падзелаў Рэчы Паспалітай аж да рэвалюцыі 1917 г., рускі ўрад не мог у цэлым аспрэчыць легітымнасць сістэмы ўласнасці на далучаных землях. Мэтай Сталыпіна было стварыць у вёсцы сацыяльную базу манархіі, апірышча не на убогих и пьяных, а на крепких и сильных. Менавіта на такіх, як Міхал і Антось. Такімі іх хацеў бачыць царскі ўрад, і такімі ж, праз нейкі час, - урад адроджанай II Рэчы Паспалітай, - вядома, пры ўмове, што яны складуць апірышча менавіта гэтага, а не суседняга, ураду. Вось толькі беларускаму руху ці, прынамсі, большасці беларускіх інтэлектуалаў XX ст. Міхал і Антось і сотні тысячаў іх суседзяў, аднавяскоўцаў і класавых таварышаў у розных кутках краю былі, здаецца, мілейшымі менавіта нягеглымі і бездапаможнымі. Бо рыторыка артыкулаў "Нашай Нівы", якія крытыкавалі Сялянскі пазямельны банк, накіраваная не толькі і не столькі супраць гэтай канкрэтнай установы, дарагоўлі зямлі ці адноснай складанасці працэдур яе набыцця. Сам факт таго, што зямля можа знаходзіцца ў прыватнай уласнасці і ў эканамічным абароце, выклікаў праведны гнеў:

як, хіба неабвержна не даказана найлепшымі вучонымі-гуманітарыямі нашага часу, што ад прыватнай уласнасці і паходзіць усё сацыяльнае зло? Коласу давялося прачытаць багата такіх артыкулаў, магчыма, ён нават удзельнічаў у напісанні некаторых.

*На працягу многіх дзесяцігоддзяў працоўны клас адбіў у непрацоўнага цэлы шэраг даброт. Ён пераўзыйшоў свайго праціўніка памерамі пазямельнай плошчы, памерамі пасеваў, памерамі збору збожжа, ён, нарэшце, стаў зраўноўвацца з непрацоўнай гаспадаркай уменнем карыстацца палепшанай тэхнікай... Валоданне матэрыяльным базісам бясспрэчна падводзіла беларускае сялянства да барацьбы за ўладу, за кіраванне ў далейшым палітыкай краіны* . ***М.В.Доўнар-Запольскі. Гісторыя Беларусі, 1926.***

Несумненна, што менавіта тады, у 1907 г., падчас штодзённых праходак уздоўж сходаў чыстых, як шклянка і роздуму пра нялёгкія спробы ідэйна няразвітых бацькі-нябожчыка і яшчэ жывога дзядзькі набыць хоць драбочак, хоць сіняпёсу, але свайго, - гэтыя ўспаміны амаль рэфлекторна ўсплывалі з памяці пры кожным позірку на шыкоўны фасад дома Снядэцкіх ці на фасад Віленскага зямельнага, што насупраць - Канстантына Міцкевіча ўпершыню вось гэта думка напаткала: напісаць вялікі, ідэялагічна вытрыманы верш, можа, нават паэму, пра марнасць спадзяванняў на сталыпінскую аграрную палітыку, пра няўдалую спробу селяніна набыць зямлю, пра немагчымасць дасягнення індывідуальнага шчасця ва ўмовах эксплуататарскага грамадства...

Невялічкі нарыс “У горадзи” у “Нашай Ніве” за 21 чэрвеня (ст. ст.) 1907 г., падпісаны Ганнай Крум - адным з псеўданімаў К.М.Міцкевіча - можна лічыць адпраўным пунктам апавядання пра дзядзьку. Герой нарысу, бедны рабочы, якога адусюль прагналі і які навярэдзіў сваю руку, працягаючы да багачоў, каторые шли кале яго, - гэта ў нечым сам Колас (якому нядоўга засталося жыць у Вільні - ці не назаўтра паліцыя затрымала яго як нелегала і ўзяла абяцанне тэрмінова пакінуць горад), а ў нечым - будучы дзядзька Антось, які ніяк не можа дапытацца дарогі ў “паноў”. Жах перад горадам, перад чужой заходняй урбаністычнай цывілізацыяй выказаны ў гэтым нарысе амаль тымі словамі, як пазней і ў вершаваным апавяданні пра дзядзьку, і ў “Новай зямлі”:

*"Людзи, чужые адзин аднаму, жэдныя да ўсяго пустого и непатрэбнаго, шли и шли, як хвили рэчные, абганяли адзин другога, кудысь-то сьпешалися,пхалися, таўклися, як мухи над гаршчком.*

*Горад шумеў як дзень, так ноч, тысячами галасоў. Лекатали лёгкия каляски, грукали доўгие, цяжкие, наваленые паклажаю вазы. Тут жэ часами нясьмела пастуквау мужычы воз, мизэрны коник дробна перабираў нагами па цьвёрдаму бруку. Ўсё гэта зьливалося ў нешта адно цэлае, и ўся гэта стракатасць грамады била ў вочы..."* ***Ганна Крум. У горадзи, 1907.***

Рэдакцыйныя клопаты, вандроўкі, арышты ды суд адклалі ажыццяўленне гэтай задумы на тры з паловай гады. Але вясной 1911, трэцяга году зняволення, успаміны пра колішнія гарачыя спрэчкі бацькі і дзядзькі, пра ўласны віленскі журналісцкі досвед, пра адзінадушнае ў 1907 г. абурэнне перадавой часткі грамадства сталыпінскай аграрнай рэформай паліліся на паперу яшчэ не зусім адшліфаванымі радкамі: хоць так, хоць нечым наблізіць той дзень, калі межы ды капцы больш не будуць спрыяць усеагульнаму адчужэнню ды запануюць па ўсім свеце тры французскія

словы (пад пільным наглядам міжнароднага чынавенства). Магчыма, забойства Сталыпіна, літаральна за некалькі дзён да выхаду Коласа з турмы ў верасні 1911 г., мусіла падмацаваць паэта ў ягоных тагачасных перакананнях.

*Паказаў мне ляснік Ермаліцкі і колішнія палосы Міхалевіча, Шэўчыка і Кунцэвіча, які пасля адкупіў зямлю ў Антося. Трактар даўно зраўняў тут межы, і як кінуць вокам, зелянее збажына на калгасным палетку.* ***С.Х.Александровіч. Па дарозе ў Заблонне, 1965.***

Дык вось, Антось дасягае нарэшце мэты сваёй віленскай выправы. Тое, што абодва аддзяленні дзяржаўных зямельных банкаў - і Шляхоцкага, і Сялянскага - месціліся ў адным доме, дапамагае ўлагодзіць супярэчнасць, чаму ў мужычым банку

*паны туды-сюды снавалі.*

На вялікі жаль, зайшоўшы сёння на Віленскі паштамт, дзе калісьці месціўся мужычы банк, не зможам пабачыць прасторнай, чыстай, светлай залы, бо ў 1969 г. гэты будынак рэканструяваны архітэктарамі Насвіцісамі і ў першапачатковым выглядзе захаваўся толькі ягоны фасад.

У банку Антось пазнаёміўся з чалавекам, які “Грышкам Верасам назваўся” і які стаў для дзядзькі віленскім Вергіліем. Бо чалавекам у юрыдычнай ды банкаўскай справах ён быў значна больш дасведчаным за дзядзьку.

Ён знаў чыноўніцкія сеці -
Недарма ж соваўся па свеце,
Зямлі шукаючы з сябрамі,
І добра знаўся з пісарамі.

Па завяршэнні банкаўскіх клопатаў:

- Ну, што ж? - пытае дзядзька Грышку.
Хіба дзе выпіць па кілішку
Ды падкрапіцца б мала-мала?
Я з дому ўзяў кавалак сала,
І хлеба ёсць крышан са мною,
Чаго ён сохне сіратою?
- Падмацавацца б не мяшала,
Бо ў жываце штось заспявала,
А нашча чарачку кульнуць -
Усё адно што ў рай зірнуць.

Новыя сябры не рызыкнулі скарыстацца з паслугаў прадпрыемстваў масавага харчавання тагачаснае Вільні - 88 рэстарацыяў, 97 сталовак і ажно 450 піўных, паводле стану на 1910 г., праз іх дарагоўлю (а вось у Стоўпцах дзядзька не пагрэбаваў станцыйным буфетам), а вырашылі падсілкавацца хатнімі прыпасамі.

Сябры ўстаюць, ідуць спавагу
І на прашпект нясуць сярмягу.

Рухаліся яны праспектам Гедыміна ў бок Катэдральнай плошчы. Як толькі не называлася галоўная сёння вуліца Вільні за 165 гадоў свайго існавання! Алея (пазней праспект) Св. Георгія (па-польску Świętojerska), за II Рэччу Паспалітай - вул. Міцкевіча, пасля 1939 г. - Гедыміна, за Саветамі - праспект Сталіна, потым Леніна, і, нарэшце, з 1989 - ізноў праспект Гедыміна. Забудову двухкіламетровай магістралі, якая злучала Катэдральны пляц з прадмесцем "Звярынец", распачалі ў 1836 г., а большая частка дамоў, што трапіліся на вока нашаму герою, будавалася напрыканцы XIX ст. Значыцца, падчас гістарычнага дзядзькавага візіту былі яны яшчэ зусім новыя, што ўзмацняла ягоны шок ад знаёмства з горадам. Што там дзядзька, калі і ягоны сучаснік, славуты руска-літоўскі мастак Мсціслаў Дабужынскі, які зусім не ў глухім лесе нарадзіўся, таксама быў адначасова і прыгнечаны, і зачараваны тагачаснай Вільняй! Зрэшты, значна больш за архітэктуру гораду дзядзьку цікавілі і бянтэжылі ягоныя жыхары. Менавіта публіка, што шпацыравала па галоўнай вуліцы, прымушала пасланца традыцыйнай, сярмяжнай беларускай вёскі пачувацца ніякавата.

Ну ж і паноў! не дай ты Божа!
Антось стрымацца ледзьве можа -
Няхай ім дрэннае прысніцца, -
Каб тым панам не пакланіцца.

Аднак да абавязковых у глухім кутку паклонаў не дайшло. Добры Вергілій са смехам растлумачыў Антосю, што адвечная для беларускай вёскі дыхатамія "паны-сяляне" ў Вільні хоць і існуе, але яе фармальныя знешнія прыкметы не такія выразныя:

- Ты не ўважай, што ён убраўся,
Гальштук павесіў і манішку,
А каб раздзець яго, брацішку,
То пэўна ходзіць без кашулі,
На ланцужку - кусок цыбулі.
Па віду пан і ходзіць панам,
А спіць напэўна пад парканам.

Хіба не з сябе, з жыцця свайго і сваіх калегаў - амаль жабрацкага, хоць знешне інтэлігентнага, - на 5 капеек штодзень, у нашаніўскі перыяд, іранізуе тут Колас? Так ці інакш, культурны шок дзядзькі паступова праходзіў, тым больш што ён, нягледзячы на сваю рустыкальнасць, быў гатовы прыняць і ацаніць дасягненні гарадской цывілізацыі:

Чым болей дзядзька разглядаўся,
Ён тым мацней тут захапляўся.
Які тут рух і беганіна!
Як ззяюць вокны магазінаў!

Нягледзячы на разважанні пра сацыяльную несправядлівасць, якая, на думку Антося, і стала падмуркам такога ўзвышэння і надзвычайнага хараства Вільні, -

А колькі слёз у ім, праклянцця?
Якія брычкі і карэты!
А для каго ўся роскаш гэта?
Антосю стала чагось смутна.

ён даволі хутка змог абстрагавацца ад гэтай думкі, балазе архітэктурнае хараство яго захапіла не на жарт.

- Ото, брат, горад! от дамішчы,
Ото дзе сыпалі грашышчы!
Якія вежы і касцёлы!
Як толькі іх трымаюць долы!..

І тут жа ўзнікае на даляглядзе пункт, які і стаў мэтай шпацыру дзядзькі Антося і Грышкі Вераса.

Зірні, зірні: гара якая!
На ёй і будка цагляная…
Ото б адтуль зірнуць на горад! -
Забыўся дзядзька і пра голад
І падбівае сябра Грышку
Ўзысці на тую гару-вышку

“Зірні, зірні! Гара якая” вырываецца ў Антося, калі яны выходзяць на Катэдральны пляц, у даўнюю “даліну Швінтарога”. Бо з ніводнай кропкі сучаснага праспекту Гедыміна Верхні Замак не разгледзіш - панараму перакрывае Катэдральны касцёл Св.Станіслава. І толькі праз некалькі радкоў, ўжо удакладняючы, Колас нібы за кадрам паведамляе:

Прашпект, касцёл сябры мінулі
І ў сквер зялёны павярнулі.

Гэта можа навесці няўважлівага чытача на думку, нібы спачатку сябры мусілі ўбачыць “будку цагляную”, а ўжо потым выйсці з праспекту. Насамрэч убачыць Замкавую гару яны мусілі паміж выхадам з праспекту і тым, як абагнулі касцёл. Фразы “праспект, касцёл сябры мінулі” - ўвогуле няма ў першай версіі апавяданні пра дзядзькаву выправу.

Пад касцёлам тут, відавочна, маецца на ўвазе будынак віленскай Архікатэдры - цытадэлі хрысціянства ў колішняй паганскай Літве, пабудаванай пры Міндоўгу на месцы паганскай святыні. Шматкроць перабудаваная, сучасны выгляд Катэдра набыла ў 1820 г. пасля завяршэння праекту архітэктара Міхала Шульца. У такім жа прыкладна выглядзе заспеў яе і дзядзька.

“Сквер зялёны” таксама існуе і па гэты дзень. Ён закладзены ў 1881 г. на месцы руінаў Ніжняга Замку, пасля таго як пляцоўку расчысцілі і пасадзілі дрэвы. Да 1899 г. сквер заставаўся фармальна безназоўным, а жыхары Вільні называлі яго “Цялятнікам”, бо раней на гэтай пляцоўцы на працягу XIX-га ст. быў выган, дзе пасвіліся цяляты. Цяпер ён носіць назву “Парк моладзі”. Чамусьці ў Коласавым апісанні места зусім не прысутнічаюць два помнікі, якія з’явіліся на гэтым шляху паміж магчымай паездкай у Вільню Антона Міцкевіча і першым побытам там самога Коласа. Гэта помнікі Аляксандру Пушкіну (з 1899 г. - ад гэтага часу і сквер пачаў называцца Пушкінскім), і Кацярыне II (з 1907 г.).

Сябры тым часам сквер мінулі,
Налева ўгору павярнулі;

Тут з будкі сторараж іх спыняе:
- Куды йдзяце? - сяброў пытае.
- Куды ж? на гору, ёсць вядома.
- А ці вам правіла знаёма,
Што безбілетным ход запынен?

Сапраўды, ад 1880-х гг. гарадскія ўлады, пасля зыходу з Замкавае гары расейскага гарнізону, паспрабавалі ператварыць гару ў фешэнебельнае месца адпачынку. Вось што піша ў шляхаводзе па Вільні 1904 г. А.Вінаградаў: "Цяпер Замкавая гара, пакрытая цяністымі дрэвамі, зрэзаная ў розных кірунках сцежкамі, і стракаціць цэлым шэрагам лавачак і альтанак. Дзякуючы цудоўнаму выгляду з Замкавай гары на места яе ахвотна наведваюць аматары шпацыру".

І дзядзька стоража пытае:
- А колькі той білет каштуе?..
Ніяк у Вільні не шанцуе!
- Ўсяго шэсць грошаў. Заплацеце,
Тады сабе, здаровы, йдзеце.

Названая сума была, відавочна, за 2 квіткі. Бо ў 1904 г. уваход на гару каштаваў 3 капейкі, а вучні мелі права наведваць яе бясплатна.

Чым вышэй сябры караскаюцца па стромкіх схілах Замкавай гары, тым больш узнёслы настрой, па волі аўтара, іх ахоплівае. Прыходзяць думкі, звычайна неўласцівыя земляробу, прыціснутаму шэрай штодзённай працай: пра сэнс жыцця, прыроду чалавека, пра гістарычнае мінулае ўсяго краю, які рэальны дзядзька Антоні наўрад ці ўсведамляў адзіным цэлым. Віленскімі раздзеламі "Новай зямлі", і асабліва эпізодам на Замкавай гары, Колас выводзіць свайго дзядзьку з патрыярхальна-тубыльскага ладу жыцця ў свет эканамічных дачыненняў, самастойных, адказных рашэнняў, у пэўным сэнсе - нават сталічнай палітыкі. Рабі пільна - і тут будзе Вільня! Ацалелыя парэшткі вежы Верхняга замку, якія памятаюць столькі стагоддзяў, нечакана прымушаюць Антося нават бліснуць гістарычнай эрудыцыяй:

Твардоўскі пан быў - мо чувалі? -
Яму ўсе чэрці слугавалі
І ўсе выконвалі жаданні,
І што ж? шчаслівы быў? нізвання!

Ці чуў калі пра Твардоўскага рэальны Антон Міцкевіч? Рачэй ужо легенду пра славутага чарнакніжніка, "польскага Фаўста", які нібыта выклікаў несуцешнаму Жыгімонту Аўгусту здань яго каханай Басі і здзейсніў яшчэ нямала магічных цудаў, "падчапіў" у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі сам Колас. Жудаснымі гісторыямі пра Твардоўскага любілі палохаць адно аднаго яшчэ студэнты Полацкай езуіцкай акадэміі, як мы добра ведаем дзякуючы Яну Баршчэўскаму, то, відаць, і семінарыстам у Радзівілавым Нясвіжы гэты "элітарны фальклёр" быў зусім не чужы.

Ці маем мы права сказаць, што "Новая зямля" - гэта апошні сігнал (знак-не-бяды) нашаму краю з далёкай дарасейскай / дасавецкай эпохі, у якой кляйнот Радзівілаў - R з каронай, легенды пра чарнакніжніка Твардоўскага, прыватная ўласнасць на мераную валокамі зямлю і банкі, што выдаюць пазыкі пад яе заклад - маюць паўнапраўную прапіску? Гэта рэаліі жыцця, неаспрэчныя "структуры штодзённасці", з якімі дзядзька

не спрабуе “змагацца”. Ён уладкоўваецца ў іх - не без перашкод, але і не без поспехаў - праз уласную працу і ашчаднасць, праз пераадоленне страхаў і комплексаў, смела пазіраючы ў вочы рэальнасці. Як жа хацелася б верыць, што і наша будучыня пасылае нам такія ж сігналы!

Сябры на верх гары ўзняліся,
Аж упацелі, засапліся,
І ногі іх спыніліс самі.
А слаўны від перад сябрамі
З гары высокай адчыняўся!

Сапраўды, “хто відам тым не любаваўся?”. Дзядзька пачынае аглядаць:

Агромны горад, цесна збіты,
Ўвесь блескам сонейка заліты,

Найперш ён зірнуў уніз на сквер, праз які яны з Грышкам толькі што прайшлі.

Як бы разоркі паміж збожжа,
Дарожкі роўныя, крывыя.
Над імі дрэвы маладыя
Ў сваёй пакоячай цішы
Сплялі жывыя салашы.

Першым асобным будынкам, заўважаным сябрамі з Замкавай гары, быў палац віленскіх генерал-губернатараў, перабудаваны ў 1824-1832 гг. у стылі позняга класіцызму, на падмурку, вядомым, прынамсі, з XIV ст.:

А дзе васпанам адзінокім,
Расцерабіўшы сабе пляц,
Як горды пан, стаяў палац.

Хто толькі не жыў, не спыняўся ў гэтым славутым палацы: Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, Аляксандр I, Кутузаў, Напалеон, Людовік XVIII, Мураўёў-вешальнік, Юзаф Пілсудскі... Цяпер у гэтым будынку месціцца Палац Прэзідэнта Літоўскай Рэспублікі (плошча Даўканта, 3).

Колас дае даволі дакладныя арыентыры - у якім кірунку глядзеў з вежы наш Адысей:

Налева, між гор крутабокіх,
У берагах сваіх высокіх,
Па камянях, бы тая змейка,
Вілася шумная Вілейка...

З правага боку адпаведна:

А справа ўніз свабодным махам
Лягла другая рэчка шляхам,
Як бы сталёвая пружына;
То Вілія, Літвы дзяціна.

Адсюль вынікае, што сябры стаялі тварам на Новы горад, на захад.

З апісання Новага гораду можна вылучыць хіба што Набярэжную вуліцу (якая ў міжваенныя гады называлася Зыгмунтоўскай, а цяпер Жыгімонтаў - Žygimantų).

Па левым беразе ў шнурочак
Зялёных дрэў пралёг радочак,
Як стрэлка, роўненька, пад меру,
Як тыя буквы на паперу.
Дамы, каменныя грамады,
Палацы, пышныя пасады,
Крутыя горы з жоўтым скатам,
Пяскамі, глінаю багатым,
Ўвесь правы бераг абступалі.

Віленскі Стары горад для Антося застаўся хіба нейкай вялікай і невыразнай плямай, якую разнастаіла толькі безліч бажніц розных канфесіяў.

А між высокіх дамоў-градак,
Свой пэўны маючы парадак,
Віліся вулачкі так-гэтак
Густою тканню цёмных клетак.
Ўгары, высока над дамамі,
Пазалачонымі крыжамі
Блішчалі цэрквы і касцёлы,
Узняўшысь к небу галавамі,
На сонцы ззяючы вярхамі.

Апошняя, вартая увагя, дэталь віленскага ландшафту, апісанай ў паэме, - гармата, што стаяла, відавочна, на заходнім схіле гары:

Сябры назад з гары звярнулі,
Шырокім крокам сціганулі.
- Пастой! а там што? - Там - гармата.

Відаць, гармата была адзінай віленскай цікавосткай, пра якую быў начуты дзядзька Антось. На заўвагу Грышкі, што гармата “мо старая або хвальшывая якая” і што страляць з яе ў горадзе проста небяспечна, Антось заўважае:

- А вось я чуў, што і страляюць -
Якраз тут поўдзень выбіваюць
- Хіба мо ў гору, - Грышка здаўся, -
Ў людзей пра гэта не пытаўся.

Нягледзячы на тое, што дзядзька быў у Вільні ўпершыню, ён меў рацыю. Як паведамляе турыстычны даведнік Вінаградава, “штодзень апоўдні з гары раздаецца стрэл гарматы, які рэгулюе Віленскі час, які адрозніваецца ад Пецярбургскага на 20 хвілінаў назад”.

На Замкавай гары, уласна, і сканчаецца вандроўка дзядзькі Антося па Вільні. Але не сканчаюцца нашыя пытанні да Коласа, да ягонай геніяльнай паэмы. Застаецца безліч

загадак, процьма зашыфраваных паміж радкоў паэмы пасланняў у будучыню. Калі б у нашым краі за апошнія 100 гадоў не былі да такой ступені выкарчаваныя заходнія культурныя традыцыі, закладзеныя ў 1385 г. Ягайлам, высвятленне ўсіх акалічнасцяў шараговай здзелкі з зямлёй, ператворанай паэтычным геніем Коласа ў эпічную падзею, і ўсіх яе непасрэдных і аддаленых наступстваў магло б стаць чымсьці накшталт масавай нацыянальнай гульні, ці то ў бісер, ці то ў калектыўнага дэтэктыва-аматара. Адказы на пытанні, якія правакуе "Новая зямля", куды больш важныя, чым здагадкі пра тое, хто і навошта забіў Лору Палмер. Пры пэўных умовах пошукі гэтых адказаў, зразумелыя як нацыянальная звышзадача, маглі б стаць лакаматывам развіцця комплексу гуманітарных навук у краіне, якія дагэтуль не могуць узняцца над узроўнем чырвонай прафесуры рабфаку:

- Калі Міцкевічы звярнуліся па пазыку ў Сялянскі пазямельны банк і на якіх умовах яна была ім выдзеленая?

- Увогуле, ці рэальны, а не літаратурны, дзядзька Антось ездзіў у Вільню? Бо і Альбуць-Парэчча, дзе жылі Міцкевічы, і набыты ў "мінскага гарамыкі" Хвядоса Хадыкі (Мікалая Міхалевіча?) надзел у Смальгаўку - гэта Мінская губерня, а ў Мінску было сваё аддзяленне Сялянскага пазямельнага банку - на Захар'еўскай, 79, у доме Ругера. Магчыма, McDonalds адчыніў сваю першую "кропку" ў РБ менавіта на гэтым месцы (праспект Ф.Скарыны, 23), каб падкрэсліць, што ніхто больш не адгародзіцца ад глабальнага свету прыватным парканам? Па інстанцыі, здаецца, Антосю належала звяртацца менавіта ў Менск, які да таго ж у некалькі разоў бліжэйшы. Ці не адрываецца ў Коласа абагульнены вобраз Антося ад ягонага роднага дзядзькі - дзеля надання яму праз сталічную прыгоду большага эпічнага маштабу? Вядома, паэма настолькі сфармавала свядомасць нашчадкаў Коласа і яго герояў, ды і ўсёй нацыі, што цяпер ніхто не сумняваецца ў рэальнасці віленскага падарожжа. Але "каго больш" у дзядзьку-Адысею - Антося ці Кастуся Міцкевіча?

Ці сапраўды той кавалак зямлі у Смальгаўку каштаваў 3000 рублёў? Якую плошчу ён займаў - сапраўды валоку? Але тая валока выглядае надта пераацэненай: 3000 руб. за валоку - 156 руб. за дзесяціну. Цэны, як ні круці, не гэтых гадоў, не за жыцця Міхала. У 1893-97 у Менскай губ. дзялянкі ад 10да 50 дзесяцінаў прадаваліся па 47-38 руб. за дзесяціну . Ды і пазней цэны не так выраслі. З 1907 па 1914 г. (у сярэднім па 5 заходніх губернях) - з 88,8 да 118,4 руб. за дзесяціну.

Цікава было б аднавіць паводле дакументаў абрысы тае зямлі: культавай, легендарнай, адзінай і непаўторнай, прывабнай і дагэтуль недасягальнай Новай Зямлі. Дзякуй Богу, мы ўжо да драбніц ведаем гісторыю радзімы іншага Міцкевіча, фальварку Завоссе, з усімі зменамі яго гаспадароў, ад якіх нас аддзяляе значна больш часу, чым ад прыгодаў сям'і Міцкевічаў-Коласаў стогадовай даўніны. Хто, калі, за колькі купіў-саступіў-арандаваў Завоссе, дзе ў якім годзе праходзіла ягоная мяжа, вядома абсалютна дакладна, з дадаткам усіх магчымых планаў і актавых выпісак. Ці не таму, што гэта найбольш цікавіць нашых заходніх суседзяў? А гешэфт паміж Міцкевічамі-"Коласамі" ды Хвядосам Хадыкам - Мікалаем Міхалевічам цікавы "ўсяго толькі" нам самім? Бо дома можна хадзіць négligé? Ці, магчыма, кананічная беларушчына можа захаваць сваю першабытную шчырасьць толькі застаючыся па-за эканомікай, па-за правам, па-за тэхналогіяй?

*Заснавальнікі вёскі [Віцкаўшчына] куплялі зямлю праз банк, прычым 60 працэнтаў кошту яны мусілі ўнесці адразу, а астатняя - выплаціць на працягу 40 гадоў. Такім чынам, за дзесяціну плацілі адразу па 42 рублі. Колькі грошай мелі пакупнікі на той час*

*і пазней, вызначыць немагчыма, бо кожны сваю гатоўку старанна ўтойваў. Вядома толькі, што селянін, які набыў 31 дзесяціну, перад куплявю меў 800 рублёў, а значыць, мог цалкам заплаціць амаль за 20 дзесяцін. Такім чынам, на астатнія 11 ён мусіў пазычыць не меней 500 рублёў .* ***Мікалай Улашчык. Была такая вёска, 1979.***

Дзіўнае супадзенне - магчыма, іронія бязлітаснага лёсу: зямля, якую Міцкевічы гэтак упарта намагаліся набыць, - на радзіме Людвіка Кандратовіча, славутага нашага лірніка вясковага Ўладзіслава Сыракомлі. Можа, калі б кола гісторыі шчасліва замкнулася, і Новую Зямлю ўдалося б утрымаць у прыватнай уласнасці, Беларускае нацыянальнае адраджэнне пайшло б зусім іншым шляхам, захаваўшы пераемнасць з заходнімі культурнымі традыцыямі, з традыцыямі Сыракомлі, Міцкевіча, Баршчэўскага, Ельскага, Кіркора, без пагрому савіцкага маёнтку Эдварда Вайніловіча ў 1918-м і забойства Рамана Скірмунта ў 1939-м? Ці мусім мы лічыць дасягненнем, вызваленнем ад панскага прыгнёту тое, што сучасны беларускі „мужык" пазбаўлены магчымасці і неабходнасці звяртацца ў банк па пазыку, не мае сваёй уласнасці і не імкнецца да гэтага дый увогуле выключаны з эканамічных і прававых дачыненняў, уласцівых еўрапейскай цывілізацыі, за выняткам набыцця солі, мыла і запалак?

Нягледзячы на звыклую а танную рыторыку пра "нацыянальную эпапею", "энцыклапедыю сялянскага жыцця", "гімн чалавеку працы" і г.д., мы да крыўды мала ведаем пра пратапластаў паэмы. Так, "Новая зямля" - насамрэч нацыянальная эпапея, але пакуль што "інфраструктура" гэтай эпапеі знаходзіцца ў жахліва занядбаным стане. Магчыма, стан вывучэння і інтэрпрэтацыі "Новай зямлі" містычным чынам звязаны з эканамічнай і прававой сітуацыяй у краіне? Тады, бадай, неістотна, з чаго пачынаць - са стогадовым спазненнем! - сапраўдныя буржуазныя рэформы. З юрыдычных ініцыятываў ці дасканальных штудыяў "Новай зямлі"? Новая Зямля - НЗ - недатыкальны запас, які дастаюць са схованаў толькі ў чорныя часы, і, здаецца, гэтыя часы надышлі. Апошнія 10 гадоў беларускай гісторыі славутая паэма Коласа ўсё больш відавочна актуалізуецца. "Новая зямля" лямантуе па асабістай трагедыі адной сям'і, але, па сутнасці, не аспрэчвае самога працэсу ўтварэння нацыянальнай буржуазіі.

Як магіла Невядомага жаўнера персаніфікуе тыповы трагічны лёс ананімнага чалавека ў эпоху вайны, татальнага знішчэння матэрыяльных ды культурных здабыткаў, так і выправа дзядзькі Антося, рэальнага ці сапраўднага, у Сялянскі Пазямельны банк, віленскі ці мінскі, пад пэўным вуглом зроку можа разглядацца як кульмінацыйны момант усёй беларускай гісторыі, магчыма, важнейшы за бітву пад Грунвальдам ці нават публікацыю Скарынавай Бібліі. Пакуль застаюцца хоць бы мізэрныя шанцы вярнуцца на Новую Зямлю, гэтая гісторыя няскончаная.

***Андранік АНТАНЯН (Вільня) antanian@centras.lt***
***Алесь БЕЛЫ (Менск) bely@infonet.by***

***P.S. Рэканструкцыя аўтараў не прэтэндуе на абсалютную дакладнасць і вычарпальнасць, але зробленая з усёй магчымай сумленнасцю***

# Беларусь на вузкай каляіне

## Баляслаў Ялавецкі і будаўніцтва чыгункі Свянцяны — Беразвеч

**Андрэй КІШТЫМАЎ**
**(Менск)**

Як вядома, першая чыгуначная лінія па беларускай зямлі прайшла ў 1862 г. Паравозны гудок беларусы пачулі ўпершыню параўнаўча позна — праз трыццаць з нечым гадоў пасля таго, як ён прагучаў на радзіме новага віду транспарту — у Вялікай Брытаніі. Затое 1870—1880-я гг. сталіся гадамі сапраўднага чыгуначнага буму. У гэты час рэйкі працягнуліся праз беларускія губерні ва ўсе бакі свету. Да 80-х гг. пазамінулага стагоддзя чыгункі ў нас будаваліся і эксплуатаваліся прыватнымі акцыянернымі кампаніямі, прычым з актыўным удзелам замежнага, перадусім ангельскага, капіталу. З канца 80-х гг., у сувязі з рэарганізацыяй усёй сістэмы чыгуначнага транспарту, пачаўся выкуп прыватных чыгунак дзяржаўным скарбам. Да сярэдзіны 1890-х гг. усе беларускія чыгункі сталі дзяржаўнымі. За кошт скарбу вялося ў далейшым і будаўніцтва новых. Зрэшты, быў і адзін вынятак: вузкакалейная чыгунка Свянцяны—Беразвеч, пабудаваная прыватнай кампаніяй — Першым таварыствам пад'язных чыгуначных шляхоў.

Царскі ўрад будаваў чыгункі ў Беларусі, кіруючыся найперш ваеннымі мэтамі і стратэгічнымі меркаваннямі; галоўнай лічылася неабходнасць звязаць сталічныя Пецярбург і Маскву з Заходняй Еўропай, забяспечыць бесперашкоднае злучэнне Украіны і цэнтральных расейскіх губерняў з партамі Балтыкі. Вядома, значны станоўчы эфект мелі гэтыя чыгункі і для беларускай эканомікі. Але толькі вузкакалейка, пабудаваная Першым таварыствам пад'язных шляхоў, стала першай унутранай беларускай чыгункай, свядома прызначанай для абслугоўвання мясцовых інтарэсаў, беларускай дарогай для беларусаў.

> **Пытанне: Што такое Літва?**
>
> Адказ: Літва – гэта край, населены спрадвеку літоўцамі, палякамі і беларусамі, а ў Інфлянтах таксама і латышамі, злучаных паміж сабой супольнасцю крыві і ўтвараючых адну літоўскую нацыю.
>
> ***З "Нацыянальнага Маніфэсту Літвы" Б. Ялавецкага. Вільня, 1905 г.***

Можна сказаць, што гісторыя гэтай чыгункі пачалася ў сакавіку 1890 г., калі ў Міністэрства шляхоў зносін паступіла хадайніцтва ад надворнага дарадцы, інжынера Баляслава Антонавіча Ялавецкага з просьбай дазволіць яму заснаванне акцыянернага таварыства для будаўніцтва і эксплуатацыі прыватных вузкакалейных чыгунак. Вельмі абгрунтавана ён заўважыў, што "существующие на необъятных пространствах Российскай империи железные дороги и водные пути, несмотря на громадное их протяжение, представляют собой весьма жидкую и не полную сеть главных коммуникационных артерий страны, которою могут с условным удобством пользоваться лишь местности, непосредственно к сим путям прилегающие"[1]. Новае Таварыства збіралася не толькі будаваць і выкарыстоўваць уласныя чыгункі, але і выконваць замовы для правядзення інжынерных вышукаў і складання праектнай дакументацыі пад'язных шляхоў на даручэнне дзяржаўных, грамадскіх і прыватных установ і асобных прадпрымальнікаў, а таксама наладзіць вытворчасць і продаж чыгуначнага абсталявання і прыладаў. Б.Ялавецкі наважваўся прадаць Таварыству

сваё вынаходніцтва: чыгуначныя прылады і рухомы склад для стацыянарных і пераносных чыгунак сістэмы “Дольберга і Ялавецкага”. Паводле праекту асноўны капітал Таварыства планаваўся ў 3 млн. руб. і ўтвараўся праз выпуск дзесяці тысячаў акцыяў, па сто рублёў кожная, на агульную суму адзін мільён рублёў, і аблігацыяў на суму два мільёны рублёў. На кожную 100-рублёвую акцыю меркавалася атрымаць не менш за 15—30 руб. дывідэндаў.

Просьба Б.Ялавецкага і праект статуту новага Таварыства падрабязна разглядаліся ў Міністэрстве шляхоў зносін, былі ўзгодненыя ў Міністэрстве фінансаў, і толькі пасля гэтага, са станоўчым заключэннем, 15 лістапада 1891 г. перададзеныя ў Камітэт міністраў. Канчатковае рашэнне прыняў імператар Аляксандр III, зацвердзіўшы 26 сакавіка 1892 г. статут Таварыства.

У якасці першай спробы сваёй дзейнасці Таварыства выбрала будаўніцтва чыгуначнай лініі ад станцыі Свянцяны Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі да буйнога беларускага мястечка Беразвеч (цяпер у межах г. Глыбокае). Адпаведнае хадайніцтва на дазвол будаўніцтва паступіла да імператара праз віленскага, гарадзенскага і ковенскага генерал-губернатара і міністра ўнутраных справаў у лютым 1894 г., і 27 чэрвеня 1894 г. яно было зацверджанае Аляксандрам III. Таварыству надавалася канцэсія на гэтую дарогу тэрмінам на 85 гадоў з правам выкупу яе ўрадам у скарб праз 18 гадоў. Канцэсіянеры атрымалі магчымасць адчужэння дзяржаўных земляў пад будаўніцтва і некаторыя іншыя льготы, а ўзамен абавязаліся перавозіць бясплатна пошту і за паменшаную плату — войска і ваенныя грузы[2].

Дзялянка новай чыгункі ад Свянцянаў да Паставаў даўжынёй 66 вёрстаў была адкрытая для руху 11 лістапада 1895 г., а 1 ліпеня 1897 г. пачала дзейнічаць другая чарга, да станцыі Беразвеч, г. зн. да Глыбокага, працягам 53 вярсты[3]. Шырыня каляі новай лініі склала 0,351 сажня (75 сантыметраў ), а на чыгунках Расейскай імперыі яна была роўная 152,4 см. Хуткасць руху дасягала 25—30 вёрстаў у гадзіну, пасажырскія вагоны 2-га класа мелі мяккія спружынныя сядзенні са спінкамі, а для жадаючых меліся спальныя аддзяленні.

Спробы арганізаваць кампаніі па будаўніцтве і эксплуатацыі вузкакалейных чыгунак рабіліся ў Расейскай імперыі і раней, але далей планаў справы не йшлі[4]. Апроч таго, амаль адначасова з праектам Б.Ялавецкага на разгляд ураду быў пададзены і зацверджаны статут Маскоўскага таварыства для будаўніцтва і эксплуатацыі пад'язных чыгуначных шляхоў у Расеі, але прыярытэт у гэтай справе належыць усё ж Баляславу Ялавецкаму.

Звернемся да біяграфіі гэтага чалавека. Прычым скарыстаем не толькі апублікаваныя крыніцы, але і матэрыялы Расейскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіву ў Маскве і Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве, дзе захоўваюцца рукапісныя ўспаміны сына Б.Ялавецкага — Мечыслава, са зместам якіх мяне ласкава пазнаёміў беларускі гісторык Алесь Смалянчук.

10 жніўня 1846 г. у сям'і шляхціча Віленскай губерні Антона Ялавецкага нарадзіўся сын, якога пры хрышчэнні назвалі Баляслаў Лаўрэнці. Ягоны бацька валодаў 500 дзесяцінамі зямлі. Баляслаў скончыў Віленскую гімназію, затым у 1861—1865гг. вучыўся ў Мікалаеўскай інжынернай вучэльні ў Пецярбургу. Праз два гады паспяхова вытрымаў іспыты ў Мікалаеўскую інжынерную акадэмію, якую бліскуча скончыў у 1870 г. — ягонае імя выбітае на мармуровай дошцы ў будынку акадэміі, — і быў прызначаны ў інжынерны корпус, у Галоўнае інжынернае ўпраўленне. Вайсковая кар’ера складваецца паспяхова: 22 кастрычніка 1870 г. прысвоены чын штабс-капітана, але 13 красавіка 1871 г., паводле прашэння, Б.Ялавецкі звольнены са службы. Праз паўтара года, 21 верасня 1872 г., ён ізноў пакліканы на службу і 1 кастрычніка 1872 г. прызначаны ў Пецярбургскае крапаснное інжынернае ўпраўленне. Але не мінае і месяца, і яго 27 кастрычніка камандзіруюць на будаўніцтва Лібава-Роменскай чыгункі. У Пецярбург, на старое месца службы, Б.Ялавецкі вяртаецца ў

сакавіку 1873 г. Яму даручана кіраваць будаўніцтвам Адміралцейскай набярэжнай. За паспяховае выкананне гэтай працы ён 26 снежня 1874 г. атрымлівае асабістую падзяку імператара Аляксандра II, а 13 красавіка 1875 г. — чын капітана. Са жніўня 1875 г. па снежань 1878 г. у вайсковай службе Б.Ялавецкага ізноў перапынак — ён удзельнічае ў будаўніцтве чыгункі Растоў—Уладзікаўказ[5].

30 сакавіка 1885 г. Б.Ялавецкі падае на імя імператара прашэнне аб адстаўцы з-за хваробы. Да гэтага часу ён адслужыў 20 гадоў, узнагароджаны ордэнамі св.Станіслава 3-й ступені і св.Ганны 3-й ступені, быў жанаты са шляхцянкай Анжалікай Ігнатаўнай з Віткевічаў, меў сына Мечыслава і дачку Ядвігу. Прашэнне было задаволенае 16 ліпеня 1885 г.[6].

Наступны перыяд жыцця Б.Ялавецкага звязаны з Аляксандраўскім заводам у Пецярбургу. На пасадзе дырэктара ён ператварыў яго ў прадпрыемства, якое не саступала лепшым заводам Еўропы. Менавіта тут пабудаваны спецыяльны цягнік для царскай сям'і. Аўтарам канструкцыі быў Баляслаў Ялавецкі.

На той час, калі Ялавецкі вырашыў заснаваць Першае таварыства пад'язных чыгуначых шляхоў у Расеі, ягоны аўтарытэт інжынера, арганізатара вытворчасці і знаўцы чыгуначнай справы не выклікаў сумневу. Ён засноўваўся не толькі на ведах, атрыманых падчас вучобы і стажыровак за мяжой — у Аўстрыі і Чэхіі, але і на практычным досведзе ў будаўніцтве чыгунак і іншых інжынерных канструкцыяў, выкладзеным у артыкулах на тэхнічныя тэмы, дакладах і выступленнях у Рускім тэхнічным таварыстве. Настольнай кнігай для мноства інжынераў-чыгуначнікаў стала праца ў двух тамах “Вада, паліва і паравозныя катлы”, выдадзеная Б.Ялавецкім у Пецярбургу ў 1878—1879 гг.

Чыгунка стала сапраўднай рэвалюцыяй на транспарце. За гадзіну цягнік праходзіў такі шлях, які гужавы транспарт пераадольваў за суткі. У той жа час перавозка грузаў чыгункай каштавала ад пяці да дваццаці разоў танней, чым па-старому, на “аўсяным маторы”. На Глыбоччыну разам з чыгункай прыйшла індустрыялізацыя. З'явіўся і тэлефон: сучасны сродак сувязі звязаў паміж сабой станцыі новай вузкакалейкі. Насамрэч, яе паравозы цягнулі за сабой не толькі вагоны, але і паслужылі лакаматывам для ўсёй эканомікі краю. Б.Ялавецкі не памыліўся, калі абраў родныя мясціны для спробы сілаў новай чыгуначнай кампаніі.

Адразу за чыгункай Свянцяны—Беразвеч Першае таварыства пад'язных чыгуначых шляхоў пабудавала і паспяхова эксплуатавала вузкакалейныя чыгункі ў Прыбалтыцы і ва Украіне. У 1913 г. яму належала 1149 вёрстаў чыгуначных шляхоў — амаль палова агульнарасейскай вузкай чыгуначнай каляі. Таварыства з'яўлялася найбуйнейшай чыгуначнай кампаніяй такога кшталту ў Расейскай імперыі, нашмат апераджаючы найбліжэйшага канкурэнта — Маскоўскае таварыства пад'язных шляхоў, якое валодала толькі 301 вярстой[7].

Вельмі пераканаўчым сведчаннем таго аўтарытэту, якім карыстаўся Б.Ялавецкі не толькі ў сваёй краіне, але і за мяжой, ёсць сталая прысутнасць яго ў складзе праўлення Руска-Бельгійскага металургічнага таварыства з асноўным капіталам 20 млн. руб. Ён быў і ў ліку заснавальнікаў у 1895 г. Таварыству належалі Пятроўскі чыгуна-плавільны і жалезаробчы завод (4200 рабочых), вугальныя шахты ў Екацярынаслаўскай губерні і Данской вобласці[8].

Пры гэтым Б.Ялавецкі заставаўся сталым старшыням праўлення Першага таварыства пад'язных шляхоў. Яно месцілася ў Санкт-Пецярбургу, на Неўскім праспекце, 11. Таварыства займалася не толькі перавозкай пасажыраў і грузаў па сваіх чыгунках, але і будавала на замову пераносныя рэйкавыя шляхі з рухомым складам, выраблялa вагоны і ваганеткі, гандлявала машынамі і прыладамі для здабычы і прасавання торфу і пераноснымі лесапільнымі заводамі. Перад Першаю Сусветнаю вайною маёмасць Таварыства ацэньвалася амаль у 27 млн. руб.[9]. Яно рэгулярна

выдавала справаздачы па эксплуатацыі пад'язных шляхоў і каштарысы даходоў і выдаткаў.

Не менш вядомая і грамадская дзейнасць Б.Ялавецкага. Як выбарны прадстаўнік ад Свянцянскага павету ён прымаў удзел у распрацоўцы Палажэння аб земскіх установах у Віленскай, Ковенскай і Горадзенскай губернях, а ў 1906 г. абраны ад Віленскай губерні дэпутатам Першай Дзяржаўнай Думы[10]. У Думе Ялавецкі далучыўся да "Кола тэрытарыяльнага" — фракцыі "краёўцаў", і ягоныя погляды на будучыню Беларуска-Літоўскага краю, выкладзеныя ў "Нацыянальным маніфэсце Літвы", сведчаць пра глыбокую неабыякавасць да эканамічнага і культурнага развіцця ўсіх нацыянальных, рэлігійных і моўных групаў насельніцтва краю, якое бачылася яму адзінай "літоўскай нацыяй" (narodem). Смерць Ялавецкага (каля 1916 г.) не дала ўбачыць, як руйнуюцца ягоныя наіўныя мары, як бязлітасна знішчаюцца ў большай частцы ягонай Літв любыя ягонаму сэрцу хрысціянства, асвета і заходняя культура...

**Пытанне: Адкуль паходзіць, што люд польскі, літоўскі і беларускі ў Літве ўтвараюць адну нацыю?**

Адказ: З 1386 г., ад злучэння Літвы з Польшчай, хрысціянства, асвета і заходняя культура прыходзілі ў Літву толькі праз Польшчу і пераўтвараліся ў адну супольную польска-беларуска-літоўскую культуру... і так сталася, што на ўсім абшары Літвы, ад Балтыкі, Нарэву, Нёмна, Віліі да Дняпра, ад Дзвіны да Прыпяці запанавалі аднолькавыя звычаі, тыя самыя норавы, тая самая нацыянальная этыка; не зважаючы, пануе пад той ці іншай страхой мова польская, літоўская ці беларуская, бо ўсе гэтыя мовы – нашы родныя, бо ў жылах нашых адна агульная кроў цячэ...

***З "Нацыянальнага маніфэсту Літвы" Б. Ялавецкага.***

Пасля пабудовы вузкакалейкі Навасвянцяны—Панявеж (цяпер літоўскі горад Панявежыс) даўжынёй 136 вёрстаў агульны працяг свянцянскіх пад'язных шляхоў дасягнуў 255 вёрстаў. Дзейнічала гэтая чыгунка вельмі эфектыўна. Як сведчыць статыстыка перавозак за 1913 год, агульны грузаабарот склаў 8327 тыс. пудоў, у тым ліку 823 тыс. пудоў хлебных грузаў, 175 тыс. пудоў каменнай і пажыўнай солі, 61 тыс. пудоў нафты і газы[11]. Рух быў бесперапынны і амаль без аварый: за год зафіксаваны адзін сыход цягніка з лініі з мінімальнай шкодай у 37 руб., пры гэтым ані маёмасць пасажыраў ані яны самі не пацярпелі, і сем наездаў на буйных жывёлаў з агульнымі стратамі 5 руб.[12]. Налічвалася на свянцянскіх пад'язных шляхах у той час 525 рабочых і служачых: 347 сталых, 86 часовых і 92 падзённыя. Агульныя выдаткі на іхнае ўтрыманне склалі 194 682 руб.[13]. Паравозныя брыгады, незалежна ад штатнага заробку і службовай кватэры, атрымлівалі павёрстныя і сутачныя грошы, а таксама прэміі за эканомію паліва.

У 1894 г. праектавалася чыгуначная лінія ад Лынтупаў да мястэчка Свір (24 вярсты) і далей на Смаргонь, а ў 1899 г. — ад Лынтупаў на Шэметава, Іжу да Маладэчна[14]. На пачатку XX ст. на так званай Заходняй сетцы Першага таварыства пад'язных чыгуначых шляхоў у Расеі (Глыбокае-Свенцяны-Панявеж) эксплуатавалася 12 паравозаў, пабудаваных на Каломенскім заводзе. Кожны такі васьміколавы "жалезны конь" важыў 18,4 тоны без паліва і 20,24 тоны ў працоўным стане. Запасу паліва і вады хапала амаль што на 120 км шляху. У якасці паліва выкарыстоўвываліся дровы. У свенцянскіх майстэрнях адначасова маглі рэмантаваць чатыры паравозы[15].

Яшчэ адзін, грандыёзны паводле задумы, праект быў высунуты ў 1909 г. Праўленне Першага таварыства пад'язных чыгуначных шляхоў прасіла ў Міністэрства фінансаў дазволу на будаўніцтва і эксплуатацыю Данецка-Балтыйскай шырокакалейнай чыгункі агульнай даўжынёй 999 вёрстаў. Яна мусіла ісці ад станцыі Льгоў — канчатковага

пункту Паўночна-Данецкай чыгункі, да губернскага гораду Магілёва, далей на Паставы і часткова па лініі ўжо існуючай Свянцянскай вузкакалейкі з канчатковым выхадам на Рыгу праз горад Баўску. Пры гэтым праз станцыю Панявеж прадугледжвалася будаўніцтва чыгуначнай галіны на Лібаву. Меркавалася, што агульныя выдаткі на будаўніцтва гэтай чыгункі складуць 65,5 млн. руб., а будаўніцтва запатрабуе ад 3,5 да 5,5 гадоў[16].

Гэты праект так і не быў ажыццёўлены, а вось дарога, пабудаваная больш за сто гадоў таму, і сёння служыць людзям. Шмат змянілася за гэтыя гады: лінію "перашылі" на шырокую каляю, ад Глыбокага працягнулі на Круляўшчызну, на злучэнне з чыгункай Полацк — Маладэчна, ад Варапаева працягнулі ў 1932 г. адгалінаванне на Друю. Шкада толькі, што пры гэтым фактычна забытае імя таго, каму абавязаны сваім нараджэннем чыгуначны транспарт у гэтых краях.

> **Пытанне: У які спосаб найпамысней для народу і для краю развязаць аграрнае пытанне?**
>
> Адказ: Аграрнае пытанне ў Літве мусіць быць вырашанае за пасярэдніцтвам мясцовых самаўрадаў, эвалюцыйным шляхам, у кірунку ўсеагульнай камасацыі грунтоў і ўзмацнення малых, але дужых вясковых гаспадарак праз паступовае набыццё большых абшараў зямлі [...] праз лепшую даступнасць усялякага крэдыту, стварэнне розных кааператываў [...] праз скасаванне ўсялякіх абмежаванняў права прыватнай уласнасці, праз урэгуляванне тытулу ўласнасці як для буйных, так і для дробных землеўласнікаў...
>
> ***З "Нацыянальнага маніфэсту Літвы" Б. Ялавецкага.***

Хто ведае, мо паспяшаліся з адмовай ад вузкай каляі — "рэйкавых прасёлкавых шляхоў" паводле трапнага выразу Баляслава Ялавецкага? Дарэчы, у гэтых мясцінах, яны пачыналіся дзякуючы ягоным энергіі і таленту, тут жа, і пра гэта мо яшчэ памятаюць мясцовыя старажылы, была зачыненая апошняя беларуская вузкакалейка на возера Нарач. А мо калі-небудзь будзе здзейснены і апошні праект інжынера Ялавецкага — чыгуначная магістраль з поўдня на захад, амаль ад мора да мора, часткай якой мусіла стаць і першая дарога Свянцяны—Беразвеч.

## ДАДАТКІ

1) "Я дазваляю сабе звярнуць увагу на адсутнасць у Расеі якіх-кольвечы нішчаватых праезных дарог, на даражнечу пабудовы шасэйных дарог і на поўнае спыненне ў пэўныя перыяды году гужавой возкі, як у выніку дажджэй, бязснежжа, так і пад час летніх палявых работ; пасля гэтага важнасць пабудовы рэйкавых прасёлкавых шляхоў, якімі па сутнасці і ўяўляюцца ўсе пад'язныя і другасныя шляхі, паўстае ўва ўсёй сваёй велічы. Што можа быць ідэальнейшым, чым уяўленне усёй паверхні Расеі, незалежна ад сеткі магістральных ліній, гэтых шырокіх трактаў, якія вядуць да вялікіх населеных і прамысловых цэнтраў, пакрытай вялікай бесперапыннай сеткай рэйкавых прасёлкавых шляхоў, якія ахопліваюць фабрыкі, заводы, руднікі, усе больш ці менш населеныя пункты, лясныя дачы і інш.?! Шкодна было б гэта для народнай гаспадаркі і дзяржавы ці не? Асмельваюся думаць, што, апроч карысці, нічога іншага ад гэтага быць ня можа!.. А гэта ж не сто вёрст і не дзвесце вёрст, але дзесяткі і, можа быць, сотні тысяч вёрст!.. Чаму ж, пытаюся, шкодна, калі нехта жадае пабудаваць 100, 200 ці 300 вёрст, так званага пад'язнога ці другаснага пуці? Бо гэта ж той самы рэйкавы прасёлак і прытым надзвычай карысны, бо ён не міне ані бліжэйшага населенага пункту, ані таго месца, дзе прыкладаецца ў той ці іншай форме чалавечая праца,

адкуль здабываюцца тыя ці іншыя скарбы, карысныя для жыцця народа і дзяржавы!.. Пытаюся, якую шкоду прыносяць рэйкавыя шляхі 75-сантыметровой каляі Першага таварыства, якія маюць пункты прыпынку ледзь не праз кожныя 8 ці 10 вёрст і цалкам абслугоўваюць тую мясцовасць, па якой яны пракладзеныя, якія дастаўляюць у любы час тавары ў захаванасці з хуткасцю не менш чым на магістральных лініях, пошту і даюць магчымасць пасажырам у цёплым і зручным вагоне ехаць з хуткасцю да 25 і 30 вёрст у гадзіну?.. Якія падставы забараняць прадпрымальнікам будаваць сваім коштам і на сваю рызыку такія шляхі?..

На шчасце, гэтую шкоду бачаць нямногія, бо, не без падставы, пасля 5 год свайго існавання "Першае таварыства пад'язных шляхоў у Расеі", дзейнічаючы без усялякай дапамогі ад дзяржаўнага скарбу, мае ўжо ў перыяд пабудовы і эксплуатацыі каля 1300 вёрст рэйкавых шляхоў 75-сантыметровай каляі, і ў Праўленне Таварыства з усіх бакоў паступаюць заявы аб пашырэнні сеткі гэтых шляхоў і аб збудаванні такіх жа новых у іншых мясцовасцях. Мо таму, што асобы, бліжэй знаёмыя з дзейнасцю Таварыства і з эксплуатацыяй згаданых шляхоў, усведамляюць іх карыснасць і ахвотна ідуць насустрач Таварыству." (Записка инженера Б.А.Яловецкого по предмету доклада В.Ф.Вигуры и беседы, состоявшихся 12 марта 1898 года в VIII Отделе Императорского Русского Технического Общества. — Спб., 1898. — С. 4.)

2) «З таго, што мне ўдалося пачуць са справаздачы і са спрэчак, я, прынамсі, бачу, што ўсё пытанне круціцца, галоўным чынам, на тым: будаваць нам шырококалейныя чыгункі або вузкакалейныя. Мне здаецца, што гэта пытанне выключна эканамічнае, і калі параўноўваць, напрыклад, для дадзенай мясцовасці паміж двума пунктамі выгады ўжытку той ці іншай каляі, дык тут трэба ўзяць пад увагу цэлы шэраг розных абставінаў. Кожная дарога паміж двумая пунктамі – ёсць функцыя вельмі складаная, якая залежыць і ад меркаванага грузавога руху, і ад тапаграфіі мясцовасці, і ад цэлага шэрагу спосабаў абслугоўвання гэтай мясцовасці. Так што перадвырашаць ці казаць увогуле, што возьмем цалкам аднолькавыя тэхнічныя ўмовы, наўрад ці магчыма, таму што калі будзем мець на ўвазе аднолькавыя тэхнічныя ўмовы, але не возьмем пад увагу іншых элементаў, дык атрымаем высновы не зусім адпаведныя. Калі ўмовы эканамічная такія, што грузавы рух велізарны, што тэхнічныя ўмовы мясцовасці лёгкія, дык несумненна, усе пагадзяцца, што ў гэтым выпадку належыць будаваць шырокую каляю, калі гэта не б'е па кішэні таго, хто будуе. Але калі моцна б'е па кішэні, дык наўрад ці знойдзецца ахвочы будаваць і чакаць, што, можа быць, праз 15—20 гадоў гэта чыгунка будзе прыносіць даход, — бо да гэтага часу трэба ж яшчэ дажыць......Таму я б думаў, трэба спыніцца на тым поглядзе, што не варта ўвогуле сцяняць прадпрымальнікаў у выбары той ці іншай каляі, бо прадпрымальнік ёсць, галоўным чынам, асоба, што вырашае. Канешне, калі ўрад або якія-кольвечы таварыствы будуць даваць субсідыі і пажадаюць мець шырококалейную чыгунку самую моцную, дык няхай яны плацяць за гэта тым ці іншым спосабам. Але калі ўсё гэта мусіць выносіць на сабе прадпрымальнік, у выглядзе таварыства або прыватнай асобы, дык ён сам і мусіць перадусім разважыць — што ж будзе і якія вынікі атрымліваюцца ад гэтага; таму што пры агульных развагах як за мяжой, так і ў нас, усе гэтыя спрэчкі з нагоды той ці іншай каляі заўжды канчаліся чымсьці малаакрэсленым, і я думаю, што з гэтай малаакрэсленасці наўрад ці мы выйдзем. Я, прынамсі, буду стаяць за наданне, па магчымасці, больш шырокіх правоў менавіта прадпрымальніку»

О причинах медленного развития подъездных рельсовых путей. Стенографический отчет по докладу Е.А.Соковича и беседе в VIII Императорского Русского технического общества. 21 января 1899 г. // Железнодорожное дело. 1899, № 44. – С. 421-422.

**Андрэй КІШТЫМАЎ (Менск)**
**Akishtymau@tut.by**

[1] Яловецкий Б. Объяснительная записка по поводу учреждаемого инженером Б.А.Яловецким Первого Общества подъездных железных путей в России. – СПб., 1892. – С. 1.
[2] Верховский В. Краткий исторический очерк начала и распространения железных дорог в России по 1897 г. включительно. – СПб., 1898. – С. 547—548.
[3] Тамсама.
[4] Тамсама. С. 544 — 545.
[5] Расейскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў, ф. 400, воп. 17, спр. 459, арк. 15—15 адв., 17 адв., 20 адв.
[6] Тамсама, арк. 3, 12 адв.—13.
[7] Россия 1913 год. Статистико-документальный справочник. — СПб., 1995. — С. 112.
[8] Акционерно-паевыя предприятия России. М., 1914. С. 369; Фабрично-заводские предприятия Российской империи ( исключая Финляндию ). 2-е выд. Пг., 1914. С. 16 Б.
[9] Акционерно-паевые предприятия России. М., 1914. С. 307.
[10] Государственная Дума первого созыва. Портреты, краткие биографии и характеристики депутатов. М., 1906. С. 9; Первая Государственная Дума. Алфавитный список и подробные биографии и характеристики членов Государственной Думы. М., 1906. С. 112 — 113; Боиович М.М. Члены Государственной Думы. М., 1906. С. 21.
[11] Железнодорожный транспорт в 1913 г. ( Статистические сведения ). М., 1925. С. 112, 116, 117, 120, 127.
[12] Тамсама. С. 94, 98.
[13] Тамсама. С. 152.
[14] Фабрики и заводы, казенныя лесныя дачи, леса частных владельцев и выдающиеся сельские хозяйства в 50-ти верстном районе. Виленская губерния. — Вильна, 1900. — С. 91.
[15] Железнодорожное дело. 1907. № 45. - С. 509.
[16] Дополнительная пояснительная записка Правления Перваго Общества подъездных путей в России к проекту Донецко-Балтийской железной дороги с уменьшенным заданием. 1910 г. — СПб., 1910. — С. 1, 4.

# Свянцянская вузкакалейка ў Інтэрнэце

У Інтэрнэце існуе старонка, прысвечаная гісторыі Свянцянскай вузкакалейнай чыгункі: **www.kolej.pl/~maron/swieci.htm**. Схема яе заходняй, надзвычай разгалінаванай часткі, пададзеная паводле міжваенных польскіх мапаў. Дзялянкі Каўтыняны-Уцяны (Уцена), Свянцяны-Саламянка-Аймуны, Януковічы-станцыя на шырокакалейнай лініі Лынтупы-Падброддзе (Пабрадэ) фігуруюць толькі на ваенных мапах і пакуль невядомыя з іншых крыніцаў. З прамовы віленскага арцыбіскупа Ялбжыкоўскага на ўрачыстым адкрыцці апошняга перадваеннага (4-кіламятровага) адцінку Кабыльнік–возера Нарач.

“Чатыры кіламетры вузкакалейкі – усміхнецца паблажліва ці іранічна жыхар сталіцы, слушна ўважаючы вузкакалейныя чыгункі за перажытак мінулага. Але гэта не перажытак на Крэсах Усходніх, дзе брак шляхоў зносін адчуваецца вельмі даткліва. Таму ініцыятыва Лігі падтрымкі турызму – арганізацыі, якая ўжо дала Польшчы не адну карысную інвестыцыю – тут пайшла ў належным кірунку. Нарач – “Віленскае мора” – найбольшае возера Польшчы, цяпер, ад 5 чэрвеня [1937 г.] мае чыгуначную камунікацыю [...]

Дагэтуль “Віленскае мора” было даступнае толькі для людзей загартаваных у цяжкасцях. Падарожжа з Вільні да Кабыльніка займала каля 10 гадзінаў, таму што гэтыя апошнія 4300 метраў трэба было брысці па бездарожжу. Цяпер з Вільні трэба ехаць ледзьве 4 гадзіны (уключаючы перасадку ў Лынтупах з “нармальнага” на вузкакалейны цягнік), прычым чыгунка падыходзіць да самага берагу возера, амаль да школьнага лагеру і базы Лігі Марской і Каланіяльнай. Гэтая чыгунка належыць да самых маляўнічых у Польшчы. Некаторыя яе дзялянкі (асабліва каля Ольшэва) жыва нагадваюць Шварцвальд ці Вагезы. Каляіна віецца серпантынам па высокім насыпе, сярод густога бору, пераскокваючы праз яры, на дне якіх бягуць імклівыя рачулкі, дзе водзіцца стронга. Апошні адцінак чыгункі з нарачанскім краявідам проста найпрыгажэйшы. Дзеля аднаго гэтага відовішча варта сюды прыехаць. Малы вакзальчык, гарманічна ўпісаны ў навакольнае асяроддзе, вытрыманы ў своеасаблівым стылі, а пабудаваны... з вагонных кузаваў, зменены да непазнавальнасці. Далей раскідваюцца амаль 80 квадратных кіламетраў воднай прасторы, пакрытай яхтамі, кацярамі, лодкамі, байдаркамі [...] Пабудова чыгункі, пад кіраўніцтвам інжынера Забакліцкага, была скончаная ў рэкордны тэрмін - 3 месяцы. З агульнага бюджэту каля 70 тыс. злотых 60% дало Міністэрства Камунікацыі, а рэшту - Лігі падтрымкі турызму”.

Часопіс ***Turysta w Polsce***, 1937 г.

## КАЗІМЕР ШАФНАГЕЛЬ І ЯГОНЫ ЗВАРОТ “ДА НАШАЙ КРАЁВАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ”

***Алесь СМАЛЯНЧУК***
***(Горадня)***

У лістападзе 1917 г. у некалькіх нумарах віленскага “Гомана” (“Homan”) быў надрукаваны зварот “Да нашай краёвай інтэлігенцыі”. Аўтар заклікаў “вярхушку” мясцовай польскай грамадскасці ўспомніць пра ўласнае беларускае паходжанне і далучыцца да беларускага нацыянальнага руху, каб паспрыяць будаўніцтву беларускай (беларуска-літоўскай) дзяржаўнасці (“гасударственасьці”). У публікацыі сцвярджалася, што дзяржавастваральная праца разам з беларускім народам пад штандарам Пагоні дасць беларускім палякам “аснову быту” і забяспечыць “благаслаўленьне патомных пакаленьняў”. Аўтарам звароту быў зямянін Ашмянскага павету Казімер Шафнагель.

Пра аўтара вядома няшмат. Тэкст трэцяй часткі ягонага звароту дазваляе сцвярджаць, што шляхоцкі род Шафнагеляў паходзіў з Валыні, аднак “быў звязаны чысьленымі вузламі крыві з “польскай шляхтай” з Беларусі”. Сам аўтар выхоўваўся на беларускай зямлі і на момант публікацыі звароту меў даволі сталы ўзрост (не менш за 50 гадоў). Таксама можна сцвярджаць факт ідэйнай прыналежнасці Казімера Шафнагеля да краёўцаў.

Варта нагадаць, што краёўцы выступалі за ўтварэнне новай “нацыі ліцвінаў” (або, як варыянт, “нацыі літоўскіх палякаў”) як грамадзянскай (палітычнай) нацыі. Галоўным крытэрам прыналежнасці да яе было пачуццё краёвага грамадзянства. Моўныя, культурныя, канфесійныя, сацыяльныя ды іншыя адрозненні, на іх думку, адыгрывалі другарадную ролю. “Нацыя ліцвінаў” трактавалася як поліэтнічная палітычная супольнасць. Краёўцы былі адкрытыя да супрацоўніцтва з беларускім і літоўскім рухамі, імкнуліся да міжэтнічнага паразумення. Трэба дадаць, што краёвая плынь дамінавала ў польскім руху на беларускіх і літоўскіх землях да 1916—1917 гг. Пазней, калі ў гэтым руху на пярэдні план выйшла нацыянальная ідэя, найважнейшай складовай якой была барацьба за ўтварэнне польскай дзяржавы, краёўцы пачалі далучацца да асобных нацыянальных (этнакультурных) рухаў. Бальшыня зрабіла свой выбар на карысць пальшчызны. Адзінкі, сярод якіх быў і аўтар звароту, падтрымалі беларускае нацыянальна-культурнае Адраджэнне.

На момант публікацыі звароту Казімер Шафнагель жыў у Кушлянах, дзе апошнія два гады свайго жыцця правёў Францішак Багушэвіч. Таксама вядома з архіўных дакументаў, што К.Шафнагель з 1906 г. уваходзіў у Таварыства сяброў навукі[1]. Ён займаўся навуковымі даследаваннямі ў галіне брыялогіі. У прыватнасці, вывучаў мох. Адначасова разам з Іванам Луцкевічам, Людвікам Абрамовічам, Аўгусцінасам Янулайцісам ды інш. уваходзіў у археалагічную секцыю. Ён даволі актыўна працаваў у Таварыстве і ў траўні 1910 г. быў абраны ганаровым сябрам “за навуковыя працы і дапамогу, аказаную Таварыству”.

Казімер Шафнагель не эвакуіраваўся на ўсход падчас “свянцянскага прарыву” нямецкіх войскаў. Спіс сяброў віленскага Шляхоцкага клубу ад 11 снежня 1915 г. паводле старога стылю засведчыў ягоную прысутнасць у сталіцы гістарычнай Літвы[2].

Да беларускага Адраджэння К.Шафнагель далучыўся, хутчэй за ўсё, на пачатку восені 1917 г. Верагодна, на гэты выбар паўплывала абвастрэнне палітычнай

барацьбы, у якой вызначалася будучыня Беларуска-Літоўскага краю. З 18 па 23 верасня 1917 г. у Вільні адбылася Літоўская канферэнцыя, рашэнні якой яшчэ раз прадэманстравалі імкненне кіраўнікоў літоўскага руху да ўтварэння незалежнай літоўскай нацыянальнай дзяржавы. Пры гэтым яе тэрытарыяльнай асновай мусіла стаць г.зв. “этнаграфічная Літва”, да якой далучаліся землі, населеныя пераважна беларусамі-каталікамі. Сталіцай гэтай новай Літвы станавілася Вільня. Створаная на канферэнцыі Літоўская Рада (Тарыба) на чале з А.Смятонам прэтэндавала на тое, каб стаць адзіным прадстаўніком краю ў дачыненнях з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі. Такім чынам, краёвая ідэя цярпела крах, а гістарычнай Літве, за адзінства якой актыўна выступала частка мясцовай польскай грамадскасці і дзеячы беларускага руху, пагражаў тэрытарыяльны падзел.

Беларускія і польскія арганізацыі пратэставалі. Яны звярнуліся да нямецкіх уладаў з заклікам не прызнаваць Літоўскай Рады. У выніку дэмаршу акупацыйнымі ўладамі было прынятае рашэнне пра ўключэнне ў склад Тарыбы прадстаўнікоў беларускіх і польскіх арганізацыяў, з тым каб усе гэтыя народы мелі роўнае прадстаўніцтва. Трэба адзначыць, што ў склад Тарыбы ўваходзіў 21 літоўскі палітык. Беларусы адразу ж сутыкнуліся з праблемай падбору кадраў, годных быць прадстаўленымі ў сумеснай Радзе. Падобна на тое, што кіраўнікі беларускага руху распачалі перамовы з тымі прадстаўнікамі віленскай польскай грамадскасці, якія падзялялі краёвую ідэялогію і з прыхільнасцю ставіліся да беларускага Адраджэння. Цалкам верагодна, што К. Шафнагель зацікавіўся прапановай уваходу ў гэты “агульналітоўскі ўрад” у якасці беларускага прадстаўніка. Наступствам ягонага рашэння стала публікацыя звароту “Да нашай краёвай інтэлігенцыі” на старонках “Гомана”.

Зварот быў надрукаваны ў №№ 86 (28 кастрычніка 1917 г.) і 87 (30 кастрычніка 1917 г.). Адначасова ён быў выдадзены асобнай брашурай на польскай мове. Казімер Шафнагель сцвярджаў, што беларускі народ атрымаў рэальны шанс пабудовы ўласнай дзяржавы, аднак без дапамогі інтэлігенцыі ён не будзе выкарыстаны. На думку аўтара, далучэнне да беларускага руху – гэта абавязак мясцовай “спольшчанай інтэлігенцыі” перад краем і “перад народам, с каторага вы выйшлі і сярод каторага жывёце, народам, каторы ёсць, жыве і клічэ вам: “памажыце!”.

Публікацыя працягу звароту ў №№ 90 (9 лістапада 1917 г.) і 91 (13 лістапада 1917 г.) “Гомана”, хутчэй за ўсё, была выклікана даволі крытычным стаўленнем бальшыні мясцовай “спольшчанай інтэлігенцыі” да некаторых тэзаў К.Шафнагеля. Аналіз пазнейшай часткі звароту дазваляе казаць пра стаўленне гэтай бальшыні да краёвай ідэі і да беларускага руху напрыканцы 1917 – напачатку 1918 г. Відавочна, што значная частка беларускіх і літоўскіх палякаў не прызнавала самабытнасці беларускай мовы, баялася, што актывізацыя беларускага руху можа прывесці да абвастрэння польска-беларускіх дачыненняў і, нарэшце, глядзела на беларускія і літоўскія землі як на “гістарычную Польшчу”. Мясцовая польская грамадскасць пастуова ўцягвалася ў працэс фармавання сучаснай польскай нацыі. У перыяд 1917—1918 гг. ужо не краёвая ідэя, а польская нацыянальная ідэялогія ў варыянце Ю.Пілсудскага ці Р.Дмоўскага вызначала яе стаўленне да сучаснага становішча і будучыні гістарычнай Літвы.

Настроі мясцовай польскай грамадскасці і яе стаўленне да звароту К.Шафнагеля добра перадаюць запісы ў дзённіку вядомага віленскага прадпрымальніка і грамадскага дзеяча Аляксандра Шкленніка[3]. А.Шкленнік тлумачыў ператварэнне “паляка” К.Шафнагеля ў беларускага дзеяча выключна кар’ернымі меркаваннямі. (Варта заўважыць, што наўрад ці “кар’ерыст” здольны напісаць такі ўсхваляваны

зварот, наскрозь прасякнуты беларускім (беларуска-літоўскім) патрыятызмам.) Аўтар дзённіка даволі крытычна і іранічна ацэньвае намаганні Казімера Шафнагеля.

У той жа час запісы А.Шкленніка сведчаць пра вельмі актыўную дзейнасць зямяніна з Кушлянаў. К.Шафнагель не абмежаваўся публікацыяй. Польскамоўную версію свайго звароту ён рассылаў па пошце вядомым прадстаўнікам віленскай інтэлігенцыі, асабіста размаўляў з людзьмі, якія падзялялі краёвую ідэю, і прапанаваў далучыцца да беларускага руху. Але ў лепшым выпадку суразмоўцы абяцалі толькі падтрымку беларускіх намаганняў (у прыватнасці, пра гэта заявіў інжынер Ярэмія Лукасевіч). Пазіцыю К.Шафнагеля цалкам прыняў Вінцэнт Святаполк-Мірскі, які таксама падвергся пэўнаму астракізму з боку "вярхушкі" мясцовай польскай грамадскасці.

Казімер Шафнагель і Вінцэнт Святаполк-Мірскі ўвайшлі ў арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні "агульнабеларускай нацыянальнай канферэнцыі з усіх акупаваных земляў" ("Гоман" № 91 ад 13 лістапада 1917 г.) Канферэнцыя адбылася ў студзені 1918 г. і спрыяла кансалідацыі дзейнасці беларускіх арганізацыяў, якія дзейнічалі на акупаваных германскім войскам тэрыторыях. Выніковая рэзалюцыя Віленскай канферэнцыі ўтрымлівала імкненне, каб "акупаваныя літоўска-беларускія землі ўтваралі незалежную самастойную дэмакратычную дзяржаву, якая б складалася з дзвюх аўтаномных нацыянальна-культурных адзінак – беларускай і літоўскай у цеснай сувязі з Курляндыяй"[4]. Ажыццяўленне гэтага патрабавання звязвалася з Устаноўчым сходам у Вільні, абраным на падставе ўсеагульных, роўных, тайных, непасрэдных і прапарцыянальных выбараў у нацыянальных курыях.

Далейшы лёс Казімера Шафнагеля пакуль невядомы. Магчыма, ён адышоў ад актыўнай палітычнай дзейнасці ў беларускім руху.

Тэкст звароту друкуецца ў адпаведнасці з арыгіналам. Папраўлены толькі выразныя памылкі друку. Як вядома, "Гоман" ("Homan") выдаваўся адначасова на двух шрыфтах – беларускай лацінкай і "грамадзянкай". На жаль, не атрымалася знайсці асобнікі "Гоману" з тэкстам звароту, якія былі выдадзены адным шрыфтом. У выніку публікацыі ў №№ 86 і 90 перадрукоўваюцца лацінкай, а №№ 87,91 – "грамадзянкай".

***Алесь СМАЛЯНЧУК (Горадня)***
***smolenchuk_a_f@mail.ru***

### Da našaj krajowaj intelihencii
### (Adkrytaje piśmo)

Piśmo hetaje prysłano nam wiadomym predstaŭnikom wialikšych ziemleŭłasnikoŭ, p. Kazimiram Šafnaglem z Kušlan, Ašmianskaho paw., katory ŭsio swajo žyćcio stajaŭ na ščyra krajowym stanowiščy, jak syn ziamli Biełaruskaj, a ciapier, kali nastaŭ moment dziela čynnaho wystupleńnia biełaruskaho narodu, prystupiŭ da biełaruskaj nacyonalnaj raboty, jak biełarus.

Piśmo hetaje maje wyjšci ŭ asobnaj adbitce takže i ŭ polskim pierekładzie.

Redakcija

Pryjšoŭ moment jadyny, moment asabliwy, moment, katory mo' ŭžo ŭ historyi nie paŭtorycca bolš dla nieščaśliwaho, pazbaulenaho swajej dziaržaŭnaści, pakinutaho swaimi naturalnymi kirownikami – swaim duhawienstwam i swajej swieckaj intelihencijej

biełaruskaho narodu. Hety narod biełaruski pryzwan ciaper sam pastanawić ab sabie, ab swajej budučynie, pryzwan pakazać, što jon jość i padać hołas, što jon žywie, wyskazać swaje palityčnyje i nacyonalnyje žadańnia.

Ale jaki-ž strašenny trahizm! Hety narod biełaruski, katory, jak i kožyn inšy narod, pawinien składacca z niekolkich hramadzianskich słajoŭ: narodnaj massy – sielanstwa i rabotnikaŭ, dy s klas mienš čyślenych, ale ekonomična i kulturna silnych i nacyonalna świadomych, - značyć[,] ziemian, mieščanstwa i predstaŭnikoŭ wolnych prafesij, - hety narod biełaruski składajecca ciaper tolki z čyślenaj, ale ciomnaj, niehramatnaj, nacyonalna nieświadomaj sielanskaj i rabotnickaj massy, bałamučenaj pa siahońniašni dzień panujučymi nad jej palityčna, ekonomična i kulturna nacyonalnaściami. Bo hety narod biełaruski – to sirata, biedny, ciomny, biezzaščytny, sirata, pakinuty swaimi naturalnymi ajcami i apiakunami – swajej intelihencijej. I woś, kali nalacieła strašennaja historyčnaja nawalnica, kali prahawitość susiedzioŭ ščeryć zuby, kab prahłynuć i ścierci da zwańnia z abličča ziamli narod biełaruski, kali razam z tym – dziakujučy ščaśliwamu hodu zdareńnioŭ – hetamu narodu zaświaciŭsia, praŭda, słaby ješče pramień nadziei na nacyonalnoje i palityčnaje adradžeńnie, - u hetki stanoŭčy zwarotny moment toj narod – sirata staić woś biezzaščytny, bytc(y)[a]m smačnaja pažywa dla kožnaho, chto zahoče praciahnuć pa jaho ruku, kab jaho zniščyć, denacyonalizawać, prahłynuć!

Hdzie-ž zaprapała taja naturalnaja apiakunka i kiraŭnička kožnaha narodu – jaho intelihencija? Jakim dziŭnym, trahičnym zdareńniem astałosia ad narodu hetaho tolki tuławo, - hdzie padziełasia hawa jaho?

Ach, bo intelihencija hetaho narodu niekali za sorak siarebrenikoŭ (šlachockije prywilei – paddanstwo sielan) adrakłasia jaho, zdradziła swoj ulasny narod, pryswoiŭšy čužuju dla jaho mowu, kulturu i palityčny ideał. Biełaruski narod i sta(u)[ŭ]sia hetak siratoj, bo jaho intelihencija, jaho wyšejšyje, abiespiečenyje kłasy denacyonalizawalisia, spolščylisia, stalisia čužymi tej massie narodnaj, s katoraj wyšli, čužymi tej ziamli, z jakoj ad wiakoŭ ciahnuli žyćciowyje soki.

Razpačaŭ(č)[š]yjsia razdzieł wyzywaŭ usio wialikšyje rezultaty, pahłyblauŭšyje ŭsio bolej propaść miž narodam biełaruskim i jaho apalačenaj intelihencijej, bo biełaruskaja massa, pazbaulenaja swaich ułasnych nacyonalnych, kulturnych słajoŭ, astałasia na pačatkowaj stupieni razwićcia sa swaim „prostym” – jak u pakornaści swajej nazywaje – jazykom, sa swajej nacyonalnaj nieświadomaściu, katoraja wyjaŭlajecca, naprykład u tym, što biełarus niawiedaje, chto jon papraŭdzi jość, i na pytańnie ab heta, kali katalik, každe: „polski”, a kali prawasłaŭny – „ruski”, nie majučy mahčymaści razpaznać hetych dwuch asnaŭnych paniaćcioŭ – wiera i nacyonalnaść, bo ŭtraciŭ nawat žadańnie mieć swaju ŭłasnuju hasudarstwienaść i nacyonalnuju samabytnaść.

Intelihencija biełaruskaho narodu – jaho „abywateli”, duchawienstwo i mieščanstwo, pryswoiŭšy sabie čužuju, ale bahatuju polskuju kulturu z jaje pyšnymi zdabytkami, tradycijami, litaraturaj i ideałami, katoryje zichaciać tysiačami koleroŭ, wabiučy wočy, dušu i serce, i ŭłažyŭšy ŭ skarbnicu hetaj čužoj kultury bahatyje ŭłasnyje zdabytki, pakłaŭšy na žertwienny ałtar polščyny najwyšejšyje prajawy swajho nacyonalnaho gienija (Mickiewič, Kondratowič, Kościuško, Ožeškowa, Moniuško, Sienkiewič i t.p.), daŭšy polskamu narodu papraŭdzi lwinuju čaść taho, čym palaki pyšajucca, jak swaim najwialikšym i najharašejšym bahaćciem, - hetaja apalačenaja biełaruskaja intelihencija ciapier z pahardaj pahledaje na narod, z katoraha sama wyjšła, zusim, jak toj mužyk, katory dajšoŭ bahaćcia, pabudawaŭ na mi(j)escy baćkawaj chacinki pałac, apranuŭsia ŭ bahatyje šaty, nabraŭsia „panskich” manier – i saromicca swajho sielanskaho rodu, z pahardaj hladzić na tych

biednych bratoŭ swaich, katoryje ŭ mužyckaj chaci astalisia, dy ješče horš i strašniej: užo ich za bratoŭ nia ličyć, wyrekajecca ich i supolnaho z imi pachodženia...

A ty, panie, katory ad dziadoŭ-pradziadoŭ žywieš tut, u Biełarusi, maješ biełaruskaje imia, abo choć i polskaje, ci spolščenaje, dyk usio roŭna čyślenymi wuzłami zwiazan s tutejšym narodam i z hetaj ziamlicy rodnaj, z hetaho kraju – takoha blizkaho, z jaho paloŭ, požniej i lasoŭ i pawietra swaje soki žyćciowyje ciahnieš, - ty, panie, katory ad dziadoŭ-pradziadoŭ žywieš w najbliżejšym susiedstwie z hetym narodam i z pracy jaho zdabywaješ swajo bahaćcie, - ty, da katoraho lud hety hetak ščyra, hetak miła, pa synoŭsku pieščatliwa pramaŭlaje: panok, panočak, bytcym mimawoli šukajučy ŭ „panu” apiakuna, ajca, - ty, panie, na pytańnie, chto ty taki? – adkazwaješ: „Ja? Ja – palak!” Tak, horda, pyšna, świadoma: palak! Kryj Bože, nie biełarus: „Fe, heta wychodzić tak pa-chamsku, tak kompromituje, tak niazhodliwa z maimi tradycijami, ideałami i minuŭščynaj!”.

Woś(,) u čym trahizm pałažeńnia: biełaruski narod, praŭda, maje swaju intelihenciju, dy jana – polskaja!

Dwa asobnyja świety, dźwie mowy, dźwie tradycii, dwa świetapahlady, - dźwie orjentacii!

A trahizm pałažeńnia ŭzwialičywajecca jašče tym, što i miejscowaje duchawienstwa, radziŭšajasia ŭ hetym kraju, časta wyjšaŭšaje biezpasredna z biełaruskaj massy abo sa spolščenaj šlachty biełaruskaj, častka z čysta biełaruskim imieniem, čurajecca hetaho narodu. Na pytańnie: chto ty? – ksiondz adkazwaje:[”]Ja čuju siabie palakam...[”]

I woś biedny sielanin biełaruski ani ŭ swaim „panku”, ani ŭ ksiandzu nie bačyć užo brata. Pan i ksiondz pramaŭlajuć da jaho nie jaho rodnaj „prostaj” mowaj, a jazykom „panskim”, kulturnym, jazykom polskim. Pan i ksiondz ličać, što ich najświaciejšaja nacyonalnaja pawinnaść – apalačyć biełarusa-mužyka praz kaścioł, praz školu, a kali-b udałosia – dyk praz sud, praz uradowyje ŭstawy, a ŭ kancu, jak najwyšejšy ideał, praz dzieržaŭnaść... polskuju!

Čym že wy, apalačenyje biełarusy, lepšyje za pahardžanych wami hakatystoŭ i abrusicielioŭ? Adumajciesia! Čy nie ŭ sto razoŭ horšy wy ad ich, čy nie zasłuhoŭwajcie na imia adstupnikoŭ swajho narodu?! Bo kali hakatysty i abrusicieli prychodziać majučy ŭłaść z čužoj ziamli dziela denacyonalizacii taho abo inšaha narodu, dyk jany za heta prynosiać jamu dostup da wializarnych karyściej, katoryje denacyonalizawanym daje prynaležnaść da palityčna ci kulturna mahutnych dziaržaŭnych arhanizmoŭ. A wy apalačenyje biełarusy, wy adstupniki ŭ rodnym kraju, dzie wy ŭzhadawalisia, dzie žywicio, - adstupniki, bo chočecie pazbawić narod swoj jaho nacyonalnaści, chočecie nawiazać jamu čužuju has(y)[u]darstwienaść – zamiest pamahčy jamu stwaryć swaju ŭłasnuju, nakinuć jamu čužuju mowu, katoraja stałasia dla was radzimaj...

(Homan, Nr 86, ad 28 kastryčnika 1917 h.)

Ядыная ў цяперашні момэнт задача адраджаючайся Літвы і Беларусі – гэта выкарыстаць уклад палітычных варункоў, ды ўзяцца за адбудову свайго дому, сваёй гасударственасьці. Літвіны ўжо пачалі гэту работу, знаходзячыся ў тым шчасьлівым палажэньні, што ўжо раней, ня гледзячы на апалячэньне сваёй інтэлігенціі і нават супроць яе, стварылі хоць нячысьлен(н)ы гурток сваёй нацыянальнай інтэлігенціі, ды пры гэтым важную з нацыянальнаго пагляду, хоць і лішне захватную ролю адыграло літоўскае духавенство. Беларусы знаходзяцца ў горшым палажэньні, - як я сказаў на пачатку, у палажэньні трагічным. Народ беларускі ў асобе сваёй нацыянальнай

інтэлігенціі прадстаўлен горача мілуючай сваю справу, але нячысьленай групай людзей, а большасьць яго радзімай інтэлігенціі – спольшчэныя "паны" і духавенство – выступае як заядлы вораг яго, цікуючы на кожную праяву беларускай сьвядомасьці, скуль бы яна ні выявілася – з верху, ці з нізу, каб зніштожыць яе ў самым зачатку.

Запраўды, трагічнае палажэньне гэтаго народу-сіраты ў момэнт, калі доля ўсьміхнулася яму, у момэнт, калі мае магчымасць вярнуць утрачэныя прад вякамі прырожанае правы: маліцца Богу ў матчынай мове, вучыцца ў тэй-жа роднай мове ў школі, - калі перад ім адкрываецца пэрспэктыва адбудовы загубленай некалісь нацыональнай гасударственасьці. Каб здабыць усё гэта, яму трэба інтэлігентных сіл, каторых мае гэтак мала: нявыкарыстаны момэнт можэ ўжо ніколі не вярнуцца. Народу беларускаму трэба, каб яго асьвядоміліі, каб адкрылі яму вочы на вялікую праўду, каторая стаіць побач яго, ды ён яе не бачыць, - на туюю праўду, што народ гэты – то народ беларускі, а ня польскі, ці маскоўскі, што, як і кожын іншы народ, ён мае свой радзімы язык, каторы быў прад вякамі языком гасударственным, мае права на самаазначэньне, на стварэньне ўласнай самабытнай дзержаўнасьці, - што на гэта прыйшоў час, каторы трэба выкарыстаць, бо іначэй ён можэ мінуцца безпаваротна.

Хто-ж скажэ яму гэтыя вялікіе праўды, хто разбудзіць гэты народ і прызаве да дзела?

Апалячэная беларуская інтэлігенція! Паны "тутэйшыя палякі" – ксяндзы і земяне! Няўжо-ж ваша грамадзянскае сумленьне нічога вам не гаворыць? Няўжо-ж не задрыжыць у спольшчэных сэрцах вашых праўдзівы патрыотызм – не прыбраны ў пазычаныя пёры, але спакон вякоў краёвы, нацыональны і народны беларускі? Чы гэта зямелька родная са сваімі сумнымі абразамі, сваім[і] вазёрамі, лясамі і гарыстымі палямі да вас не прамовіць, - чы голасу гэтаго збожнага народу, што вас "панкамі даражэнькімі" называе, вуха вашэ не пачуе, - чы яго праўдзівых патрэб, каторых ён сам ешчэ не разумее, ваша душа не адчуе, а калі адчуе, дык чы не загаворыць у вас грамадзянскае сумленьне і чы не дасьць яго вам цьвёрдаго наказу ўзяць той-час на свае плечы работу дзеля адраджэньня гэтаго люду – нацыі, да катораго так чы сяк самі вы прыналежыце?

Або мо' трываючы ў старым засьляпленьні і далей будзеце ў адносінах да руху беларускага занімаць варожае становішчэ, а калі і не яўна варожае, дык раўнадушнае, пасыўнае, дарэмна спадзяючыся, што самай толькі гэтай раўнадушнасьцю, самай пасыўнасьцю засудзіце гэты рух на зніштажэньне – прынамсі дачэснае?

Не ашуківайце сябе: гэты рух, разьвіцце беларускай сьвядомасьці прыйдзе само сабой, абніме шырокіе массы, станецца магутнай сілай, каторая грозна і гнеўна спытаецца вас: "Што вы, нашы старшыя браты, нашы духовыя айцы, нашы натуральные апякуны і кіраўнікі, учынілі для нас у той час, у той момэнт асаблівы? Чаму не станулі з намі поплеч, чаму – не прызнаўшыся шчыра і адкрыта, што вы – сыны Беларускай зямлі, або беларусы, ужываючыя(,) польскай мовы, і гэтак фальшуючы запр[а]ўднае палажэньне, - абвʼявілі сябе за палякаў, не памаглі нам адбудаваць наш уласны дом, нашу родную дзержаўнасьць?" Так, дэмос той прыйдзе да вас і спытаецца вас гэтак і скажэ свой справядлівы прыгавор вам!

Дык, пакуль час, апамятайцеся! Ніхай споўніцца ў вас унутраная перамена! Змяніце сваю, так сказаць, зверхную орʼентацію на ўнутрэную, краёвую! Ніхай замест белага арла на вашым штандары зазʼяе пагоня, як некаліс на штандарах вашых дзядоў! Падайце руку народу, каторы вымагае і мае права вымагаць ад вас гэтай ахвяры, і памажыце яму збудаваць яго і вашу будучыну!

Гэтак вы толькі споўніце сваю павіннасць перад краем, каторы дае вам усё.

Кажэце: “Мы тут не колоністы і не хочэмо быць колоністамі; мы, палякі, тут – дома, мы – гаспадары ў гэтым краю і маемо права аб долі яго і аб сабе, як такіх, судзіць”.

Адкажэм вам: маеце права гэтулькі, паскольку прызнаеце нашу літоўска-беларускую гасударственасць. Але я ведаю, да чаго вы кіруецеся: вы хочэце тут, у гэтым нешчаслівым нашым краю, раздзіраным нялічэнымі праціўнасцямі, зрабіць ешчэ адну крывавую рану – утварыць польскі ольстэр, супроць беларускаго характ(е)[а]ра гэтаго краю выстаўляючы ваш “уласны” нацыональны характэр; мэта ваша – стварыць гасударство ў гасударстве з усемі яго прыналежнасьцямі, с сецыю шчупальцоў, раскінутай па ўсім краю дзеля высасываньня яго нацыональных асобнасцей, дзеля дэнацыоналізаціі. Раз стануўшы на фальшывым – процікраёвым становішчы, вы топчацеся ў зачарованым коле, шукаючы выхаду, каторы вось перад вамі шырока адчынен; а гэта ёсць: прызнаньне сябе за грамадзян Беларускаго краю і прыняцьце ўсіх выплываючых з гэтаго далейшых консэквэнцій і абавязкоў, каторые ўскладае на вас такое прызнаньне.

С прычыны таго, што будучая беларуска-літоўская гасударственасць, само сабой разумееццa, будзе апірацца на дэмократычных і лібэральных асновах, нацыональные і культурные правы ўсіх іншых нацыональнасцей гэтаго краю, як трэба, забяспечэны – аднак, с тэй умовай, што яны прызнаюць ядыную гасударственасць – літоўска-беларускую. Бо німа даўнасьці для правоў народу, і гасударственасць, трываўшая цэлыя сталецьця пад іменем Беларуска-Літоўскай дзержавы і загубленая сто лет таму назад, мусіць быць вернена паўстаўшым да новага жыцьця беларусам і літвіном, адвечным гаспадаром гэтаго краю, яго жывым массам народным. Гэтыя масы маюць права самі пастанавіць аб сабе, быць панамі на сваёй зямлі, і ўсё іншае павінно падчыніцца гэтай магутнай волі масс – большасьці.

Дык вось для вас, паны “палякі”[,] ёсьць толькі два выхады: або прызнаць сябе за грамадзян гэтаго краю, за сыноў гэтай зямлі і ста(ну)ць у адзін рад з народам, між каторым жывецё[,] – або прызнаць сябе за асобную нацыональнасць, чужую для гэтых мас – нават варожую для іх, бо з захватнымі апетытамі, нязгодную ўступіць захопленых становішч, за[й]здросна пілнуючую свайго “стану ўладаньня”.

Перад вамі, паны “палякі”, дзьве дарогі. У гэт(а)[ы] асаблівы момэнт вы апынуліся на розстані і маеце на выбар адно(,) ці другое. Найбліжэйшая будучына пакажэ, што ў вас прамовіць ямчэй: грамадзянскае сумленьне, пачуццё абавязку перад народам, с катораго вы выйшлі і сярод катораго жывёце, народам, каторы ёсць, жыве і клічэ вам: “памажыце!” – чы мо’ ваша дэзор’ентацыя нацыональная і палітычная, фальшывае нацыональнае становішчэ, жаданьне захватоў. І або вы пойдзеце поплеч з людам нашым, як яго старшые браты, прыяцелі і бацькі, і, падаўшы яму руку, паможаце яму выйсці на дзеннае сьвятло – да таго сонца самабытнасьці, на каторае мае права кожын народ, хоць бы цэлые сталецьця прабываў у цемры, забыцьці і занедбаньні, - або ў змучэных радох выступіце, як ворагі яго права на самазначэньне, на будову ўласнай гасударственасьці, усюды і заўсёды нішчучы работу яго.

Прабіла гісторычная гадзіна, каторая выявіць вашу палітычную мудрасць і дасьпеласць ці вашэ засьляпленьне і палітычнае банкрутство. І або нашы дарогі пойдуць адным шляхам, да далёкай яснай будучыны, або разойдуцца і будуць усё болей расхадзіцца – на векі.

Вы, панове “польскіе” і[н]тэлігенты на зямлі Беларускай, палітычна, культурна і нацыональна абязсілелі, і ўся ваша работа выяўляецца ў нэгацiі (адкіданьні), або ў тым, што сьлепа дзержыцеся застарэлых і ўтрацiўшых цану клічоў і формул, – зусім бытцым тые зубры, каторые сілай канечнасьці засуджэны на павольнае выміраньне, бо вы ўтрацілі звязь з вечна маладой крыніцай сьвежых сіл народных. На павароці да гэтай крыніцы, на чэрпаньні з яе сьвежых жыцьцёвых сокаў і дачы з іх падмогай адпору ўселякаму замяжоваму націску, усё роўна з якога боку, аснована будучына, аснованы бязцэнные кругазоры і магчымасьці! I калі віленская маладзёж, уздзеўшы на галаву “рогатывкі” ды начапіўшы арла, думае, бытцым яна спаўняе патрыотычны ўчынак, - дык якую ж страшэнную абмылку яна робіць, як кепска асьвядомлена! Ня Польшчу трэба тут цяпер будаваць, а нашу ўласную дзержаву; не арла, а пагоню насіць; не “рогатывкі”, а простые мужыцкія шапкі, якіх ужывае тутэйшы народ; не шматфарбны кракаўскі ўбор, пекны, але чужы, а сівая сермяга нашаго хлебароба – вось нацыональная опратка! Сюдой дарога – з народам і праз народ! Не вы цягніце яго за сабой у чужые для яго, незнаныя староны, але самі ідзіце за ім – туды, куды ён жадае! У гэтым – праўда, рэальная, позытыўная праўда, будаўніцтво ад асноў; у гэтым – кліч на сягоньняшні дзень; у гэтым – будучына!

Вы, паны тутэйшые інтэлігенты, утрацiўшые жывую звязь з тутэйшым народам, калі б замест шукаць для сябе ідэалоў у Варшаве або Кракаве, замест паддавацца патрыотычным настроеньням ад кракаўскіх танцоў і ўбораў, былі ў бліжэйшай еднасьці з нашым народам, калі б вы уважліва, з пашанай і тклівасцю, а мо’ і з пачуцьцём унутрэнага сораму прыглеладаліся лепей да шэрай долі тутэйшага селяніна, каторы з пакаленьня ў пакаленьне, ціха і без нарэканьня, ад калыскі да магілы ў поце чэла гарэ бацькаўскі палетак, ажно пакуль, аслабеўшы і зморэны, с пакорнасьцю волі Божай не паложыць сваю змучэную, пасівеўшую галаву ў дамавіну, калі-б вы – з другога боку – прыгледаліся бліжэй да таго маладога беларускага руху да адраджэньня, каторы, бытцым кволая ешчэ, скромная красачка ў цяню, развівае свае колеравые пялюсткі, да таго руху, поўнаго гарачаго патрыотызму і жаданьня вырвацца к сонцу, к праўдзе, к жыцьцю, - дык можэ ў сэрцы сваім вы бы выкрылі вялікую праўду, што тут вашы браты, тут ваш люд, тут ваша Бацькаўшчына, - што ў гэтым ваша будучына і згэтуль павінны вычэрпаць свае палітычные аспірацiі, ідэалы, вашы патрыотычные абавязкі.

А тым нямногім, хто здолее вызваліцца с цесных і ўтрацiўшых цану формул, абняць вокам шырокіе кругазоры і думкай далёка сягнуць у будучыну, я дабаўлю: паводлуг нашаго глыбокаго пераконаньня, новая палітычная мысль, каторую мы сабой прэдстаўляем, - гэта ядыная правільная, ядыная абаснованая – ядыная творчая мысль.

(Гоман, № 87 ад 30 кастрычніка 1917 г.)

Zamietka Redakcii ŭ pačatku majho pieršaho piśma da krajowaj intelihencii, (ŭ)[u] katoraj haworycca, što ja praz usio žyćcio swajo stajaŭ na krajowym stanowiščy, a ciapier, kali dla biełaruskaho narodu pryjšoŭ moment dziela čynnaho wystupleńnia, adkryta pryznaŭ siabie za syna ziamli Biełaruskaj, pryznaŭ siabie za biełarusa, - jak ja dawiedaŭsia i spaznaŭ swajej asobaj[,] wyzwała mnoha zakidoŭ, krytyk i raznarodnych uwah. Z hetaj pryčyny liču za swaju pawinnaść publična wytłumačyć swajo stanowišče ŭ hetaj sprawie – nia hetulki dziela asabistaj patreby, skolki dziela karyści samaj sprawy, spadziajučysia, što hetaje wyjaśnieńnie šmat kamu pamože u orjentacji ŭ swaim ułasnym stanowiščy adnosna da hetkich ważnych u hety čas spraŭ.

Adnak(,) wyjaśnieńnie ŭ majej asabistaj sprawie ja pawinien papiaredzić[,] dajučy historyčny pohlad na nacyonalnaje pytańnie ŭ našym kraju.

U Litwie i Biełarusi panujuć niezwyčajna zabłytanyje nacyonalnyje adnosiny. Nie kažučy ab tym, što na našaj ziamli žywie niekolki nacij, katoryje čaściu zanimajuć asobnyje abšary (litwiny i biełarusy), čaściu ŭ adzinočku abo hrupami raskinuty miž tymi hustymi masami (palaki i žydy), - adnosiny hetyje bł(u)[y]tajucca ješče bolej, kali kiniem wokam nazad – u historyčnuju minuŭščynu.

U časach niezaležnaści Wialikaho Kniażstwa Litoŭskaho (sprawiedliwiej: Litoŭska-Ruskaho), ješče nia złučanaho palityčnaj unijej s Polščaj, u hetaj dzieržawie žyli badaj wyklučna tolki dwa narody: litwiny i rusiny. Rusiny składalisia z niekolkich plamion: krywičoŭ, dreŭlan i inšych, wiadomych pad ahulnym imiem biełarusoŭ i „małarusaŭ" (Čyrwonaja Ruś – heta ukrainski narod), - bo ŭ tyja časy Wialikaje Kniażstwo Litoŭskaje ŭładało ŭsiej „Biełaj" i „Małaj" Ruśsiu. Usie hetyje plamiony byli tady wiadomy, jak „adzin" ruski narod, addzielajučysia hetym imiem ad „maskaloŭ", abo wialika-rusaŭ. U tahočasnych starych hasudarstwiennych dakumentach historyčnych my pastajanna spatykajem hetkaje wydzialenie: „My, bajary litoŭskije i ruskije, sabraŭšysia uchwalili i t.d." – Dyj paśla unii s Polščaj niejki čas trywaje hetkaje wydzialeńnie ŭ hasudarstwienych aktach i chronikach; adnak, s chodam času nazwańnie „ruskije bajary", „ruskaja šlachta" zacirajecca, znikaje, a tolki prybiraje nowaje imia, supolnaje z narodam litoŭskim i ŭziataje ad litoŭskaj hasudarstwienaści, - imia „litwinoŭ". Usio hasudarstwo, złoženaje z niekolkich nacij, atrymliwaje ahulnaje nazwańnie „Litwy"; žyhary jaho – jak sapraŭdnyje litwiny, tak i rusiny – biez nijakoj rožnicy nazywajuć siabie „litwinami", adrožniwajučysia hetak ad palakoŭ, žycharoŭ „Karony".

Woś(,) majemo tut pieršy prykład, jak u našym kraju, asabliwa paśla addzialeńnia ad Litwy Ukrainskich ziamiel, pierawažywajučaja massa žycharoŭ jaho (narodu „ruski", rusiny) (ŭ)[u] swaim całym i ŭ paadzinokich asobach zmieniaje, na pahlad, swaju nacyonalnaść, a papraŭdzi tolki imia swajo. Zamiest „ruskimi" abo biełarusami(,) našy dziady pačali nazywacca „litwinami". „Litoŭskaje wojska", „litoŭskaja šlachta", „litoŭski narod" – usio heta abnimaje jak sapraŭdnych litwinoŭ, tak i rusinoŭ (biełarusoŭ).

Chacia akurat u tych že časach „litoŭskaja" šlachta i pany apalačylisia, pakinuli mowy baćkoŭ swaich, pačali hawaryć pa polsku i pryniali polskuju kulturu, - chacia zwierchna stalisia jany „palakami", adnak ažno da samaho kanca istnawańnia „Rečypospolitaj" heta šlachta i pany zaŭsiody nazywali siabie „litwinami", kab adrožnić siabie ad palakoŭ - „koroniarzy", žycharou Polskaho Karaleŭstwa. Na sejmach u Warsžawie naša spolščenaja ŭžo šlachta wystupała zaŭsiody(,) jak šlachta „litoŭskaja", jak „litwiny", što widać z usich tahočasnych historyčnych dakumentoŭ. Tahočasnyje „palaki" ŭ Litwie i Biełarusi nia tolki nie ŭstydalisia nazywać siabie „litwinami": na adwarod, ličyli heta za čeść i patryotyčnuju dystynkciju.

Upadek „Rečypospolitaj" wyzwaŭ u hetych adnosinach wialikjie pieramieny: Ruś Litoŭskaja, abo Biełaruś, atrymała ŭžo oficyalna swajo siahońniašniaje imia, a narod naš usiudy pačali oficyalna nazywać biełaruskim (u časach „Rečypospolitaj" tolki ŭ chronikach dy ŭ paadzinokich prypadkach spatykajem hetaje imia: „biełaruskaja dywizija" kala 1730 h. i t.d.). A razam z tym „litoŭskaja" šlachta pačynaje nazywacca „polskaj". Daŭniejšy biełaruski šlachcic – „rusin", posle – „litwin", - nazywaje siabie „palakam". I tolki jak hetki „palak" apynuŭsia ŭ Waršawie, dyk, kab wydzialicca z pamiž „koroniarzy", pa staromu nazywaŭ siabie świadoma „litwinom".

Adnak(,) za našaj užo pamiaci adbyłasia nowaja pieramiena: zbudziŭšajasia nacyonalnaja świadomaść sapraŭdnaho litoŭskaho narodu, užywajučaho litoŭskaj mowy, i warožyje da swajej apalačenaj intelihencii wystupleńnia jaho zrabili toje što litwiny-„palaki” zusim pierestali nazywacca litwinami, chacia jany rodu litoŭskaho, choć ad dziadoŭ-pradziadoŭ tutaka žywuć, choć jany – syny Litoŭskaj ziamli. I ciapier imia „Litwin” užywajuć tolki etnografičnyje litwiny, katoryje haworać pa-litoŭsku. I daŭniešy „litoŭski” šlachcic, ciapier – „palak z Litwy”, ličyć za abrazu dla siabie, kali chto nazawie jaho „litwinom”: jon – tolki... „palak”.

Toje-ž samaje robicca i s „palakami” – daŭniejšymi „rusinami”: i jany niekali šlachta „ruskaja”, paśla „litoŭskaja”, urešci „polskaja”, kryŭdujecca, kali ich nazwać šlachtaj biełaruskaj, biełarusami. Bo ŭzrost nacyonalnoj świadomaści biełaruskaho narodu, katory, jak i narod litoŭski niedawierčywa hladzić na swaju spolščenuju intelihenciju, wyzywaje toj samy rezultat: „palak z Biełarusi” ličyć za hańbu dla siabie nazywacca „biełarusam”.

A ŭsio-ž taki i tut na našych wačach adbywajecca i pawinna sama saboj adbycca nowaja pieramiena.

Zdareńnia apošnich dzion, katoryje stanowiać dobry hrunt dziela ŭzrostu świadomaści ŭciskanych dahetul na ich ziamli etnagrafična litoŭskaj i biełaruskaj narodnych mass, hrunt dziela ich samaaznačeńnia, dziela žadańnia swajej hasudarstwienaj samabytnaści, - zdareńnia hetyje pawinny wyzwać pierewarot i ŭ samaaznačeńni našaj spolščenaj krajowaj intelihencii – „palakoŭ” z našaho kraju. Hetaja krajowaja intelihencija, hetyje „palaki” pawinny razdzialicca i ŭ mieru razwićcia litoŭskaj i biełaruskaj hasudarstwienaści, kali nia choćuć astacca za skobkami, jak čužaja nacija na rodnaj ziamli, - pawinny buduć nazwacca „litwinami” abo biełarusami, zaležnie ad taho, u jakoj čaści kraju žywuć – nazwacca tak u značeńni hasudarstwienaj prynaležnaćci. Zachoŭwajčy mo’ ješče na doŭhi čas polskuju mowu i kulturu, jany pawinny pryznać siabie za „litwinoŭ” i „biełarusoŭ” u hasudarstwienym, a časam i nacyonalnym značeńni.

Demokratyčny ruch znizu, uzrost nacyonalnoj świadomaści mass, zdabywajučych swajo prawo na nacyonalny hasudarstwieny byt buduć šybka nabližać ewoluciju nacyonalnaho samaaznačeńnia tutejšaj intelihencii. Heta intelihencija pawinna iści z tym rucham znizu i – kali nia choče sčeznuć u nieustanaj baraćbie – pawinna wiarnucca da krynicy, z jakoj wyšła, da narodu, z jakoha paŭstała, z jakim zwiazana krywioj i pachodžeńniem. Tak, značycca, adbudziecca nanowa staraja ewolucija, tolki naadwarot, - ewolucija nie samaj reču, ale, možna skazać zwierchnaj „naklejki” – imia, nazwańnia. Reč astaniecca sama saboj: biełaruska-litoŭski kraj i biełaruska-litoŭskije hramadzianie, niezaležnie ad taho, jakim jazykom haworać. Zmieniajecca tolki „imia” ŭ zaležnaści ad nastrajeńni[a]ŭ i patreb historyčnaho momentu. A sprawa jdzie ab toje, kab reč sama ŭ sabie – hety kraj, hetaje budučaje hasudarstwo – mieła ćwiorda i wyrazna wyjaŭlenuju fizionomiju, kab u dušach hramadzian hetaho kraju, wa ŭsich słajoch – ad wierchu da nizu, wa ŭsich nacyonalnaściach – zbudziałasia jasnaja świadomaść swajej asobnaj hasudarstwienaści (вылучана аўтарам.), swaich historyčnych tradycij, swaich asobnych met, - kab hetak usie žywyje siły Kraju, zamiest zmahacca miž saboj, zjednalisia dziela adnej supolnaj sprawy: dziela budawańnia swajej dzieržawy, swajej baćkaŭščyny.

Paśla hetkaho historyčnaho wyjaśnieńnia mnie astajecca ciapier dadać usiaho niekolki słoŭ. Pachodziačy z wałynskaj šlachty, asieŭšaj na Rusi ad niekolkich pakaleńnioŭ, zwiazany čyślenymi wuzłami krywi z „polskaj” šlachtaj u Biełarusi, tut wychawany i prypisany da wilenskaj šlachty, pracujučy 50 hadoŭ na ziamli ŭ hetym kraju, katory liču za radzimu i katory lublu, katoraho mowu i nacyonalnyje asobnaści zaŭsiody šanawaŭ i lud

katoraho liču za swoj i da katoraho čuju siabie wielmi blizkim, - ja ciapier u toj momant, kali hety lud-narod budzicca da žyćcia, da samabytnaści i patrebuje swajej intelihencii, kab jamu ŭ hety momant pamahła, liču swajoj pawinaści stanuć u jaho radoch, jak hramadzianin i patryot hetaho kraju Biełaruskaho, jaho budučaj hasudarstwienaści, - značyć: jak biełaruski hramadzianin, jak biełarus. A jak šmat lahčej adwiečnym synom hetaho kraju, katoryje majuć biełaruskaje imia, ŭ žyłac(j)[h] katorych ciače biełaruskaja kroŭ, adbyć hety samy ŭnutreny praces samaaznačenia, choć jany siabie ličać za „palakoŭ"!

Pačućcio hramadzianskaj pawinaści pierad swaim ułasnym krajem i narodam pawinno kožnamy ablahčyć hety praces. Unutrenaja p[e]raškoda, katoraja wyjaŭlajecca ŭ sławach: „ale ja čuju siabie palakam", - pawinna ščeznuć, a zamiest hetaho ćwiordy palityčny i patryotyčny nakaz musić, jak nie raz u našym kraju ŭ historyj zdarałosia dawiaršyć unutrenuju pieramienu.

(Homan, Nr 90 ad 9 listapada 1917 h.)

Проці такіх вывадоў між нашай інтэлігенцыей мы спатыкаем многа закідоў, каторые тутака і абсудзім.

Спатыкаем, напрыклад, гэткі закід: беларуская мова – гэта ўсё роўна як мова расейская, - значыць, завядзеньне яе вядзе да "абрусеньня". Аднак(,) тыя ж людзі пад той самы час даводзяць: беларуская мова – гэта не асобны язык, а толькі адна з гутарак польскай мовы, - а іншыя кажуць: гутарка расейскай мовы.

Ужо стаўляючы побач гэткія зусім нязгодлівые адзін з адным пагляды[,] лёгка давясьці неабаснованасьці іх, – бо калі паводлуг адных беларуская мова ёсць гутарка расейская, паводлуг другіх – польская, дык само гэта ясна паказвае, што яна ня ёсць ні аднэй, ні другой, што гэта – свая асобная, выявіўшаяся ад вякоў, мо' дзе-нідзе зацёртая чужымі ўплывамі, але, наагул, мова самабытная, якой ужывае больш за 8 мільёнаў народу на вялізным абшары і якая мае роўнае з іншымі права на жыцьцё і развіцьцё.

Другі доказ проці нашых паглядоў – тое, што народ ня цэніць свае мовы, называе яе "простай", ужывае толькі ў хаце, а ў касьцелі і ў "лепшым таварыстве" гукае па-польску, ці ў іншых старонах – па-расейску. На гэта адказ кароткі: бо народ гэты, мову каторага прасьледаваў быўшы(й) расейскі ўрад ды пагардай абкідала польская інтэлігенція і духавенство ня ўсюды йшчэ дайшоў сьвядомасьці, - але, як і кожын іншы народ у нашых часах, хутка ўжо збудзіцца і пачне свайго права на жыцьцё дапамінацца. Памагчы яму ў гэтым – то павіннасць тутэйшай інтэлігенціі, ня гледзячы на тое, што сама яна гаворыць іншым языком. Павіннасць і – скажу – рэальная, мудрая палітыка.

Іншы закід: на што ў гэтых цяжкіх часах, якіе цяпер мы перажываем, калі з-усюль грэзіць нам гэтулькі небяспек, пачынаць нацыональную барацьбу, - на што дражніць і ўвадзіць новы раздзел, каторы можэ быць карысны толькі "трэйцім"?

Гэты, на пагляд, моцны доказ сам сабой губляе моц сваю, калі напомнім аб нашым становішчы ў гэтай справе: бо мы якраз хочэмо гадзіць, а не дражніць, на што паказвае хоць бы мэта нашага прызыву да інтэлігенціі, - мы хочэмо будаваць будучыну на аснове праўды і справядлівасьці, а не на фальшу; бо будучына, аснованая на этнографічнай і гісторычнай непраўдзе, якая выяўляецца ў славах "тут была Польшча, тут быў польскі народ, і такім ён ёсць і павінен астацца ў будучыне", - не ўдзержыцца: яна разваліцца, збанкроціцца, як ужо не раз здаралася…

Толькі збудаваная на крэпкіх народна-нацыональных асновах гасударственая будучына дасць адпор усім унутрэным і замяжовым навальніцам і будзе трываць сталецьця. Для гэткай будучыны не жаль палажыць некаторые ахвяры, адрачыся розных вузкіх формул і мар. Бо марай ёсць думка, быццым вы здалееце апалячыць гэты многамільённы беларускі народ, быццым здалееце даць яму шчасьце, адмаўляючы права на жыццё, на стварэньне сваей асобнай нацыональнай дзержаўнасьці. Гэтаго вам не ўдалося дайсьці праз сталецьця, гэтаго не здалеў зрабіць расейскі ўрад і ніхто зрабіць не здалее, бо кожын народ ня толькі хочэ, але ў перэжываных намі часах можэ і мусіць стацца сам сабой. Пльщі проці гэтаго цячэньня можэ пажадаць толькі нецьвярозы палітык, ці засьлеплены “эндэк” (нацыяналіст).

Памянёная выжэй заява: “Тут – Польшча і т.д.”, - аснована вось на чым: што Вялікае Князьство Літоўскае (Літоўска-Беларускае) злучылося з Польскім Каралеўствам у адну “Рэчпосполітую” – Рэчпосполітую Польскую.

Гэтае слова “Польскую” і ўносіць непаразуменьне ў думкі шмат людзей: адны тлумачаць яго так, быццым яно азначае, што Літва “паддалася” Польшчы; другіе, хоць добра разумеюць, у чым тут справа, ды сьвядома баламуцяць людзей поўінтэлігентных і народные масы дзеля вядомай мэты.

Вось і трэба гэтую справу акуратна разабраць.

Вялікае Князьство Літоўскае злучылося некалі з Польскім Каралеўствам, маючы сперша толькі супольнаго монарха – Вялікаго Князя Літоўскаго, каторы стаўся такжэ Каралём Польскім, але пры гэтым абедзьве дзержавы захоўвалі блізка поўную незалежнасць адна ад аднэй. Толькі праз 200 гадоў дзержавы гэтые (Літва і Карона) на моцы Люблінскай Уніі (умовы) сваей ахвотай злучыліся “як вольные з вольнымі, роўные з роўнымі” ў адну “Рэчпосполітую” (такі ўрадовы тытул быў прыняты на Уніі для супольнай дзержавы) – коратка: “у Рэчпосполітую”, а не ў Рэчпосполітую Польскую, - на ясна ўстаноўленых варунках, - пры ўзаемным забеспячэньні поўнай аўтономіі для кожнай палавіны супольнай монархіі (асобнае войска, асобны скарб, асобная ўрадовая герархія, асобные суды, а супольны толькі сэйм і супольне выбіраны монарх, каторы меў тытул Караля Польскага і Вялікага Князя Літоўскага).

Вось, гэту-то Рэчпосполітую і пачалі пасьля называць Рэчпосполітай Польскай, бо трэба-ж было даць нейкі больш гаворучый прыметнік званьня гасударства. І зусім ясна, што з такім жэ самым правам дзержава гэта магла называцца Рэчпосполітай Літоўскай. Называлі-ж яе “Польскай” адно толькі затым, што каралеўскі тытул выдаваўся вышэйшым за тытул Вялікага Князя (хоць абедзьве дзержавы былі роўны па сілу і значэньню), дык што Польшча, вышэйшая культурна і лежучы бліжэй да заходу, надавала ўсяму гасударству зверхны польскі характэр. Аднак(,) гэта зусім не азначала нейкай праўна-дзержаўнай перэвагі Польшчы над Літвой, тым болей не значыло, быццым Літва і Беларусь абярнуліся ў Польшчу. Абедзьве злучэные дзержавы: Польшча і Вялікае Князьство Літоўскае – аставаліся тым, чым былі ад пачатку, значыць: двума асобнымі дзержаўнымі організмамі ў вядомай устаноўленай гасударственнай лучнасьці. Калі-ж у часы ўпадку Рэчыпосполітай шляхоцкіе дэпутаты ад абедзьвух злучэных дзержаў на дзельчых сэймах зацьвярдзілі раздзел супольнаго гасударства паміж суседзяў, адрываючы гэтак ад Кароны (Польшчы) Літву і Беларусь, дык і люблінская умова (унія) разваліласа сама сабой, утраціла сваю праўна-дзержаўную моц. Ад колішняй “Рэчыпосполітай” асталіся толькі складаўшыя яе некалі землі – з аднаго боку Польшча, з другога – Літва і Беларусь (даўнейшае В.Кн.Літоўскае).

Цікаўна адзначыць, што ядыным на першым дзельчым сэйме дэпутатам, каторы меў сьмеласць і сілу волі выступіць з цьвёрдым пратэстам проці раздзіраньня яго роднай Беларускай зямлі (пры першым раздзеле Масква забрала толькі часць Беларусі), быў праўдзівы патрыот і грамадзянін сваёй зямлі – Тадэуш Рэйтан.

У гэткім палажэньні справа датрывала да нашых дзён. І з усяго вышэй сказанага ясна, што цяперашняй Літвы і Беларусі, або даўнейшага Вялікага Княства Літоўскага[,] нельга называць Польшчай, як і аб Польшчы нельга гаварыць, што тамака ёсць Літва, - хоць бы часьці апалячэнай літоўскай і беларускай інтэлігенціі хацелося бачыць у нас Польшчу супроць гісторыі і супроць этнографіі масс.

Хто сягоньня гэтак кажэ, робіць абмылку фактычную і гісторычную: тут, у Літве і Беларусі, - Польшчы німа.

Мне давялося сустрэціцца ешчэ з адным закідам і сумлеваньнем: “Калі я прызнаю сябе за беларуса і пачну як беларус працаваць на грамадзскай ці палітычнай ніве, - дык буду прымушэн зрабіць шкоду польшчыне ў гэтым краю”.

Адкажу: шкоды тады, калі гэтае польшчыны сягае на непрылежныя ёй правы, захоплівае чужое, мае за(з)[х]ватные жаданьня. Каб жэ даць цьвёрды адпор усялякім з[а]хватным апэтытам, незалежне ад таго, чы іх выяўляюць палякі, чы літвіны, чы беларусы, - на гэта ня трэба быць ані выключна русінам, ані палякам, ані літвіном, а трэба быць проста сумленным чэлавекам- грамадзянінам (вылучана аўтарам.), каторы шануе як сваю, так і чужую нацыональнасць і стаіць на грунце справядлівасьці і этнографічнай праўды, - грамадзянінам-патрыотам, каторы злучае, а не раздзяляе, каторы кожнаму прызнае права да жыцьця, а ўселякую дэнацыоналізацію, уселякі захват, уселякую чыннасць у гэтым кірунку, скуль бы яна ні выйшла, лічыць за недапусьцімую, шкодную і благую, - за рэч, з якой трэба бароцца.

Стоючы на гэткім становішчы і падаўшы адны адным руку, усе грамадзяне нашага Краю – беларусы, літвіны, палякі і т.д. могуць мець поўную надзею, што, выкарыстаўшы памысную палітычную кан'юнктуру сучаснага момэнту, яны здалеюць адбудаваць сваю ўласную, некалі незалежную, вялікую, шчасьлівую бацькаўшчыну.

Вось жэ вы, паны “тутэйшыя” палякі, інтэлігенція краю, ксяндзы і абыватэлі, і ты, краёвая дэмократыя, каторая безпасрэдна выйшла з народу тутэйшаго і не ўтраціла ешчэ еднасьці з ім, - не саромцеся прыняць да свайго ведама очывістую праўду, - праўду тэрытарыяльную, а хутка пэўне ўжо і праўду палітычную: што вы – грамадзяне Літвы і Беларусі, яе сыны, - значыць: “літвіны” або “беларусы”.

Паварот да гэтаго адвечнаго самаазначэньня, перакручэнаго або загубленаго толькі з прычыны ненормальных адносін, у якіх мы пражылі больш за сто гадоў, - паварот, згодлівы з вашым паходжэньнем і традыціей, ня толькі ня будзе вас ганьбіць, а, наадварот, прынясе вам чэсць, бо звяжэ з народам, бо дасць вам аснову быту, бо вас узмацуе і падніме і падзяку і благаслаўленьне патомных пакаленьняў вам запэўніць.

Не саромцеся стануць пад штандарам Пагоні, каторы вы пакінулі, а народ сам у свае рукі бярэ і паднімае ў выш, як свой сымвол нацыональны, сымвол сваёй Бацькаўшчыны.

Стануць поплеч с людам-народам пад гэтым сымволам – чэсць і слава для вас!

(Гоман, № 91 ад 13 лістапада 1917 г.)

[1] Літоўскі Дзяржаўны гістарычны архіў (ЛДГА). Фонд 1135 (Таварыства сяброў навукі), воп. 22, ад.з. 2, 9.

[2] ЛДГА. Ф.1135, воп. 23, ад.з. 11, арк. 79.

[3] ЛДГА. Фонд 1135, воп. 4, ад.з. 32-38.

[4] [Abramowicz L.]. Litwa podczas wojny: zbiór dokumentów, uchwał, odezw i t.p. / Zebrał i do druku przygotował L.A. – Warszawa, 1918. – S. 130.

# "ЗА ВОЛЬНАСЦЬ І БОЛЬШ ЗАПЛАЦЯЦЬ..."

## Спрэчкі пра аграрныя рэформы ў ВКЛ у другой палове XVIII ст.

***Ірына КІТУРКА***
***(Горадня)***

Вядома, што ад узроўню эканамічнага развіцця кожнай краіны залежыць яе палітычная стабільнасць, дабрабыт насельніцтва, яе культурнае жыццё. Але таксама вядома, што палітычная сітуацыя, стан грамадскай думкі і культуры аказваюць значны, а часам нават вырашальны ўплыў на эканамічныя працэсы і пераўтварэнні. У другой палове XVIII ст. Беларусь стала месцам сустрэчы дзвюх культурных эпох, калі на змену старым уяўленням прыйшла ідэалогія новага часу – Асветніцтва, з характэрным для яго культам розуму і навукі. Менавіта ў гэты час частка патрыятычна настроенай палітычнай эліты Рэчы Паспалітай прыйшла да асэнсавання неабходнасці правядзення ў краіне рэформаў, у тым ліку і эканамічных.

Неабходна заўважыць, што для эканомікі папярэдні перыяд (другая палова XVII і пачатак XVIII ст.) быў, бадай, самы цяжкі. "Страчанае стагоддзе" – у сутнасці так можна ахарактарызаваць гэты час адносна гаспадарчай гісторыі Беларусі. Калі ў XVII–XVIII стст. у перадавых краінах Еўропы адбываўся працэс хуткага накаплення капіталу, а ў 60-я гг. XVIII ст. у Ангельшчыне пачаўся прамысловы пераварот, то ўлады Вялікага Княства Літоўскага двойчы мусілі падымаць з руінаў гаспадарку, разбураную войнамі ў другой паловы XVII ст. (казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг.; вайна Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай за беларускія і ўкраінскія землі 1654–1667 гг.) і пачатку XVIII ст. (Паўночная вайна 1700–1721 гг.). Працяглыя войны штучна перарвалі натуральны працэс эканамічнага жыцця, і, гаворачы пра гаспадарчае становішча Беларусі гэтага перыяду, лагічна ўжываць не слова "развіццё", а "аднаўленне" ці "адбудова". Толькі да сярэдзіны XVIII ст. гаспадарка Беларусі дасягнула даваеннага ўзроўню.

Другая палова XVIII ст. стала часам актывізацыі эканамічнага жыцця ў Беларусі. Гаспадарчы рост быў абумоўлены павелічэннем попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю як на беларускіх землях, так і на збожжавых рынках Еўропы; пэўным урэгуляваннем ўнутрыдзяржаўнага ладу, прыняццем законаў, якія абмяжоўвалі права вета па фінансавых справах, ліквідавалі мытныя пошліны, уводзілі адзіную сістэму мераў і вагі.

Спрыяць паляпшэнню эканамічнай сітуацыі на землях Вялікага Княства павінна было заснаванне, згодна з рашэннем канвакацыйнага сойму 1764 г., Эканамічнай Рады Літоўскага скарбу (Скарбовай камісіі). У тэксце соймавай канстытуцыі гаворцца аб тым, што галоўнай мэтай стварэння гэтага спецыяльнага дзяржаўнага органу было жаданне ўладаў "як найлепей назаўсёды арганізаваць парадак Літоўскага скарбу і памножыць ягоныя даходы праз увядзенне лепшага кіравання і гаспадарання на карысць Рэчы Паспалітай"[1].

***У склад Скарбовай камісіі, якую ўзначальваў вялікі падскарбі літоўскі, уваходзілі яшчэ два чалавекі з Сенату і сем асобаў шляхоцкага паходжання, якіх выбіралі на сойме. У абавязак Эканамічнай радзе Літоўскага скарбу ставілася вырашэнне большасці асноўных гаспадарчых пытанняў: кантроль за фінансамі, размеркаванне і збор падаткаў, ажыццяўленне судовых функцыяў па***

***фінансавых справах, прызначэнне скарбовых афіцыялістаў і зняцце з пасады тых, хто дрэнна выконваў свае абавязкі, нагляд за гандлем і ўвогуле за эканамічным становішчам у краіне[2]. Месцам паседжанняў Скарбовай камісіі ВКЛ быў прызначаны Гарадзенскі каралеўскі палац, дзе таксама месціўся скарбовы архіў.***

Паколькі ўся праца камісараў Скарбовай камісіі мусіла садзейнічаць павелічэнню прыбыткаў дзяржаўнага скарбу, то ў абавязак ім таксама ставіўся разгляд прапановаў па рэфармаванні дзяржаўных уладанняў. Фактычна улады запрашалі да дыскусіі ўсіх, хто меў якія-небудзь меркаванні наконт магчымасці паляпшэння вядзення гаспадаркі.

Аснову эканомікі Рэчы Паспалітай складала сельская гаспадарка, і адзін з першых праектаў, які трапіў на стол Скарбовай камісіі ўжо 5 сакавіка 1765 г., тычыўся менавіта аграрных пераўтварэнняў у Брэсцкай і Кобрынскай каралеўскіх эканоміях. Аўтарам праекту быў каморнік Віленскага ваяводства Людвік Кройц.

Людвік Кройц – асоба гэта вельмі цікавая, але таямнічая. Практычна немагчыма скласці сёння візітоўку гэтага чалавека, паколькі шмат якія факты яго біяграфіі застаюцца невядомымі. З пэўнасцю можна сказаць толькі тое, што Л.Кройц стаў прыкметнай асобай у Вялікім Княстве ў 1765 г., менавіта пасля прадстаўлення свайго праекту аб рэфармаванні эканоміяў. У гэтым жа годзе Л.Кройц, прызначаны генеральным мернічым ВКЛ, праводзіў рэвізію дзяржаўных уладанняў. Відаць, ён быў чалавекам здольным, кемлівым і дасведчаным у эканамічных пытаннях. У 1769 г. прапанаваў на разгляд Скарбовай камісіі цікавы мемарыял “Данясенне пра стан Шавельскай эканоміі”, у якім утрымліваліся некаторыя практычныя парады для павелічэння даходаў з яе. Вядома, што ў 1772 г. Кройц склаў дакладную мапу гэтай эканоміі, а ў 1773 г. ужо не жыў.

Праект Кройца адразу зацікавіў Скарбовую камісію, паколькі ў ім прапаноўвалася “без усялякага абцяжарвання падданых” амаль у два з паловай разы павялічыць даход з Брэсцкай і Кобрынскай эканоміяў (з 135 000 да 324 383 тынфаў). Са словаў самога Кройца, “фундаментам гэтага праекту” ёсць скасаванне паншчыны, ліквідацыя фальваркаў і замена ўсіх сялянскіх павіннасцяў агульным падвышаным чыншам[3].

Кройц палічыў сваім абавязкам даказаць, што прапанаванае ім увядзенне толькі грашовых выплатаў не з’яўляецца надзвычай цяжкім для падданых. Для гэтага ён падлічыў усе падаткі і павіннасці, якія выконвалі сяляне згодна з апошнім інвентаром 1742 г., улучна з паншчынай (па 15 грошаў за дзень), і ў выніку аказалася, што сума іх у 2 разы большая (50 тынфаў), чым прапаноўваў увесці Кройц (25–30 тынфаў), а рэальныя даходы эканоміяў – меншыя. Таму Л.Кройц зрабіў выснову, што скасаванне паншчыны найбольш мэтазгоднае як з гледзішча эфектыўнасці гаспадарання, так і стаўлення падданых да гэтага мерапрыемства.

Трэба адзначыць, што вакол праекта Кройца адразу разгарнулася сапраўдная інтрыга. У дыскусію ўступіў апошні арандатар гэтых эканоміяў граф Ежы Флемінг. Ён не толькі адчуў сябе абражаным словамі аўтара праекту, што “такога прыбытку пан граф Флемінг ніякімі спосабамі пры найлепшым гаспадарстве даць на зможа, а таму ад кантракту трэба адмовіцца”, -- але й інстынктыўна адчуў іх небяспечнымі для сябе.

На працягу 23 гадоў (з 1742 па 1765) Флемінг быў сталым арандатарам Берасцейскай і Кобрынскай эканоміяў. Паводле ўмоваў кантракту ён быў абавязаны ўносіць пэўныя грашовыя выплаты ў дзяржаўны скарб, перыядычна праводзіць рэвізію ўладанняў і “імкнуцца дапамагчы як мага большай колькасці падданых, не чакаючы за

гэта ніякай узнагароды". Такія стандартныя выразы утрымліваліся ў той час амаль у кожным кантракце на арэнду, але насамрэч арандатары – і Флемінг тут не вынятак – бачылі ў арэндзе толькі крыніцу звышпрыбытку.

Часовыя дзяржаўцы рэдка клапаціліся пра захаванасць і перспектывы гаспадарчага развіцця арыманых уладанняў, асабліва калі перадавалі іх у субарэнду іншым асобам. Часта яны парушалі "Ўставы" эканоміяў, павялічвалі сялянскія падаткі і павіннасці, але дакументальна гэта ніяк не фіксавалася.

Так, за 23 гады інвентар Берасцейскай і Кобрынскай эканоміяў складаўся толькі адзін раз – у 1742 г., пры заключэнні першага кантракту на арэнду, але відавочна, што гаспадарчы стан эканоміяў значна змяніўся. Таму Флемінг не быў зацікаўлены ў падтрымцы ўрадам прапановаў Л. Кройца.

Ужо 14 сакавіка 1765 г. граф Флемінг звярнуўся ў Скарбовую камісію з заявай, у якой спрабаваў пераканаць камісараў і караля ў тым, што рэалізацыя праекту віленскага каморніка немагчымая.

У адрозненне ад Л.Кройца, які выдатна аргументаваў свае прапановы фармальна (аперуючы дакладнымі лічбамі колькасць зямлі, памер падаткаў і агульную суму даходу), Е.Флемінг не прывёў фактычна ніводнага слушнага доваду супраць, а абмежаваўся толькі агульнымі заўвагамі, што ў эканоміях шмат пустога грунту, "а калі рабацізну скасаваць, то і той, які ўжываюць фальваркі, застанецца парожнім"[4]. Яшчэ граф Флемінг выказаў сваё "перажыванне" за сялян з нагоды таго, што яны вельмі "ўбогія" і не здолеюць выплочваць чынш. Ці не аналагічную аргументацыю ўжываюць і супрацiўцы скасавання калгаснай сістэмы?

Гэтыя заўвагі Л.Кройц не мог пакінуць без адказу. 21 сакавіка ён падаў Скарбовай камісіі яшчэ адзін дакумент, у якім не гэтулькі імкнуўся абараніць свой праект, колькі хацеў паказаць некампетэнтнасць і недасведчанасць у справах эканоміяў іх былога арандатара. Л.Кройц іранічна заўважаў, што Е.Флемінг прывёў звесткі як мінімум з інвентару 1742 г., але з таго часу ўжо больш за 20 гадоў мінула і стан у эканоміях значна змяніўся, а сяляне "за вольнасць" (у дадзеным выпадку – за свабоду ад паншчыны) і больш заплацяць[5]. Відочна, віленскі каморнік быў упэўнены ў поспеху свайго праекту, таму прапаноўваў правесці яго апрабацыю.

Такая рэфарматарская ініцыятыва не магла не звярнуць на сябе ўвагу ўлады. Ужо ў красавіку 1765 г. Людвік Кройц "за практычныя здольнасці" прызначаны Генеральным мернічым у сталовых добрах Вялікага Княства Літоўскага. А развіццё падзеяў і зацікаўленасць дзяржаўнай улады ў прадстаўленых прапановах падштурхнулі яго ўнесці ў траўні 1765 г. на разгляд Скарбовай камісіі другі праект, які на гэты раз тычыўся новаўвядзенняў у гарадах Брэсцкай і Кобрынскай эканоміяў.

З гледзішча Л.Кройца, неабходна было пабудаваць у Брэсце замкавы бровар і цагельню, а ў Кобрынскай эканоміі для ажыўлення гандлю заснаваць горад Станіславаў Каралеўскі з кірмашамі, таргамі, крамамі, гасцініцамі. Аднак пры гэтым ён чарговы раз падкрэсліў, што "толькі ўвядзенне новай эканомікі пры раздачы фальваркавых грунтаў на чынш можа прывесці да парадку ў эканоміях"[6] .

Такая актыўнасць Кройца яшчэ больш звяртала ўвагу на ягоныя праекты. У выніку Л.Кройц абяцаў павялічыць каралеўскі скарб амаль на 400 000 тынфаў. Гэта было вельмі прывабна, але сваё важкае слова мусіў сказаць чалавек, які спецыяльным

каралеўскім распараджэннем ад 8 сакавіка 1765 г. прызначаўся генеральным адміністратарам усіх сталовых эканоміяў у ВКЛ, – Антоні Тызенгаўз.

> ***Антоні Тызенгаўз нарадзіўся ў 1733 г. у мястэчку Наваельня Наваградскага павету. Паходзіў са старажытнага роду Тызенгаўзаў, які сваімі каранямі сягаў у XII ст. У палітычным жыцці ВКЛ пачаў адыгрываць прыкметную ролю з 1757 г., калі стаў горадзенскім падстарастам. Неардынарныя здольнасці і арганізатарскі талент А.Тызенгаўза хутка быў заўважаны, і ў 1761 г. шляхта Горадзенскага павету абрала яго паслом на Варшаўскі сойм. У 1763 г. ён стаў вялікім пісарам ВКЛ. Пасля абрання ў 1764 г. каралём Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, юнацкага сябра А.Тызенгаўза, апошні зрабіў галавакружную кар'еру — ад літоўскага канюшага (1764) да адначасовага сумяшчэння з 1765 г. пасадаў генеральнага адміністратара каралеўскіх сталовых эканоміяў у ВКЛ, літоўскага надворнага падскарбія, горадзенскага старасты і кіраўніка раялісцкай (каралеўскай) партыі ў ВКЛ. А.Тызенгаўз быў сапраўдным пераўтваральнікам Горадні. Дзякуючы ягоным наваўвядзенням у галіне культуры, адукацыі, будаўніцтва, горад ў 70-я гады XVIII ст. называлі "квітнеючай Галандыяй на Нёмане". У 1780 г. быў пазбаўлены ўсіх пасадаў. Памёр 31 сакавіка 1785 г.***

Камісары Скарбовай камісіі ўжо 16 сакавіка 1765 г. азнаёмілі А.Тызенгаўза з праектам Л.Кройца. Ён з цікавасцю сачыў за пісьмовай дыскусіяй паміж віленскім каморнікам і графам Е.Флемінгам, аднак, ягонае афіцыйнае рэзюмэ на гэты конт застаецца невядомым. Пры гэтым з ускосных фактаў, у прыватнасці з пісьма А.Тызенгаўза да караля ад 15 траўня 1765 г., становіцца зразумелым ягонае стаўленне да асноўнай ідэі Кройца – ачыншавання падданых: "Разбураць фальваркі і чыншаваць хлопаў – я ніколі не прытрымліваўся такога меркавання, асабліва ў Брэсцкай, Кобрынскай і Оліцкай эканоміях... А паколькі гэты праект паказвае толькі даход у гатовых грошах і не паказвае цяжкасцяў гаспадарання, то, беручы пад увагу стан краю і сялянаў, такі падыход лічу небяспечным"[7]. Хутчэй за ўсё, менавіта гэтая заўвага А.Тызенгаўза мела рашаючае значэнне. Больш за тое, пасля прызначэння яго 6 чэрвеня 1765 г. на пасаду надворнага падскарбія ВКЛ, Станіслаў Аўгуст уручыў яму ключы ад каралеўскае скарбніцы і фактычна надаў неабмежаваныя паўнамоцтвы ў каралеўскіх эканоміях. І лёс праекту Кройца быў прадвызначаны.

Узнікае пытанне: чаму А.Тызенгаўз не падтрымаў гаспадарчых прапановаў Л.Кройца? Чаму нават не пагадзіўся апрабаваць прапанаваны праект? Вывучаючы дзейнасць А.Тызенгаўза, атрымліваем відавочны адказ. Генеральны адміністратар каралеўскіх эканоміяў меў уласны план рэфармавання уладанняў. Менавіта ў гэты час у Еўропе ізноў рэзка ўзняўся попыт на збожжа, і генеральны адміністратар меў на мэце павелічэнне прыбыткаў каралеўскага скарбу шляхам аднаўлення ў эканоміях фальваркаў у якасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, асноўнай мэтай дзейнасці якіх станавіўся таварны характар вытворчасці збожжа. Як бачым, ягоны план кардынальна розніўся ад праекту Л.Кройца і грунтаваўся на супрацьлеглых прынцыпах – аднаўленні паншчыны, хоць і з паляпшэннем апрацоўкі зямлі і выкарыстаннем тагачаснае заходнееўрапейскае тэхнікі.

У эканоміях быў праведзены шэраг гаспадарчых мерапрыемстваў: перамер зямлі, рэарганізацыя і ўпарадкаванне сялянскага землекарыстання, заснаванне "камунальных магазінаў" – адмысловых збожжавых фондаў для сялянаў на выпадак агульнага

неўраджаю ці стыхійнага бедства, а таксама арганізацыя “камунальных касаў”, грошы з якіх ішлі на добраўпарадкаванне вёсак, утрыманне лекара, вясковага радзільнага дома і інш. Разам з тым, была ўведзена новая сістэма падаткаабкладання, згодна з якой сяляне з роўнага для ўсіх асноўнага надзелу ў ¼ частку валокі (5,34 га) абавязаны адпрацаваць 2 дні паншчыны ў тыдзень на фальваркавым ворыве. У дадатак падвышалася і колькасць дзён шарваркаў, гвалтаў, талокаў.

На першым часе даходы з эканоміяў ВКЛ сапраўды выраслі. Але калі Л.Кройц прапанаваў павялічыць прыбытак каралеўскага скарбу з Берасцейскай і Кобрынскай эканоміяў у 2,5 разы “без усялякага абцяжарвання падданых”, то А.Тызенгаўз дамогся такога выніку ў тым ліку і дзякуючы ўзмацненню павіннасцяў.

І паляцелі на імя караля сялянскія скаргі, у якіх вяскоўцы “з болем і стогнам” прасілі караля вярнуць ім “стан даўні чыншавы”. Але перапіска паміж А.Тызенгаўзам і Станіславам Аўгустам сведчыць, што кароль у пераважнай бальшыні выпадкаў не чытаў адрасаваных яму суплікаў, а перасылаў іх генеральнаму адміністратару з рэмаркай: “Прашу інфармаваць мяне, што я магу адказаць валашчанам, якія кожны дзень [суплікамі] мяне турбуюць”[8]. У выніку, Тызенгаўз разглядаў сялянскія скаргі на самога сябе. І ён адказваў сялянам у сваіх універсалах, што менавіта і вяртае “даўні стан”, які быў уведзены згодна з палажэннямі аграрнай рэформы яшчэ ў сярэдзіне XVI ст.

> ***Як распаўсюджаная форма гаспадарання фальваркі з’явіліся на землях Беларусі падчас правядзення валочнае памеры ў другой палове XVI ст. З валокі зямлі (21,36 га) вызначалася норма паншчыны ў памеры 2 дні на тыдзень. Аднак пасля ваенных знішчэнняў другой паловы XVII ст., калі колькасць насельніцтва зменшылася больш чым на 50 %, з мэтай хутчэйшага аднаўлення гаспадаркі сяляне каралеўскіх сталовых эканоміяў у ВКЛ былі пераведзены на чынш. Дзяржаўная ўлада зразумела, што ў тых складаных умовах выратаванне гаспадаркі можа прыйсці толькі праз адносную эканамічную свабоду падданых.***

Праўдападобна, у другой палове XVIII ст. адміністрацыя эканоміяў і сяляне ўкладвалі розны сэнс у паняцце “стан даўні”. Для першых гэта была адпрацовачная павіннасць, якая замацавалася на беларускіх землях у выніку валочнае памеры, сяляне ж разумелі пад “даўнінай” менавіта перавод на грашовую рэнту ў другой палове XVII – пачатку XVIII ст., г.зн. свабоду ад паншчыны.

Не можа быць, каб такі адукаваны і таленавіты чалавек, як А.Тызенгаўз не разумеў, што ўвядзенне паншчыны, прычым павялічанай нават у параўнанні з сярэдзінай XVI ст. (2 дні з цэлай валокі ў XVI ст. і 2 дні з чвэрці часткі валокі ў адпаведнасці з рэформай А.Тызенгаўза), можа выклікаць моцны супраціў сялянства. Але, хутчэй за ўсё, ён не бачыў іншага выйсця, паколькі ягоная рэфарматарская дзейнасць грунтавалася на “вялікім мануфактурным плане”.

Ужо ў той час развіццё эканомікі дзяржавы залежыла не толькі ад яе гаспадарчай і ваеннай моцы, але і ад узроўню адукаванасці краіны, яе агульнай культуры. Натуральна, што Тызенгаўз, які шмат ездзіў па Еўропе, добра гэта разумеў і, як дзяржаўны чалавек высокай адказнасці, імкнуўся вырашыць разам з эканамічнымі шэраг праблемаў сацыяльнага, навуковага і культурнага характару. Але стварэнне паводле плану А.Тызенгаўза адначасова больш за 20 мануфактураў патрабавала вялікіх

сродкаў на арганізацыю вытворчасці на іх: закупку абсталявання, сыравіны, плату замежным майстрам. Таму генеральны адміністратар вырашыў “зэканоміць” на выкарыстанні на мануфактурах у якасці асноўнай рабочай сілы дармавое працы каралеўскіх сялянаў, якія мусілі адпрацоўваць паншчыну. У мануфактурную вытворчасць укладваліся таксама грошы, атрыманыя ад продажу фальваркавага збожжа. У дадатак, сялянаў каралеўскіх эканоміяў забіралі ў Горадні, часта прымусова, для навучання ў школах будаўнікоў, муляраў, цесляроў і інш., каб потым працаваць на мануфактурах.

***Другая палова XVIII ст. была для Рэчы Паспалітай часам нараджэння капіталістычных дачыненняў, у аснове якіх ляжыць першапачатковае назапашванне капіталу. На тэрыторыі Беларусі, як і ўсёй Рэчы Паспалітай, на гэтым шляху існавала шмат перашкодаў, звязаных з грамадскай і палітычнай феадальнай структурай. Гэта вынікала з манаполіі шляхоцкай уласнасці на зямлю і прыгонніцтва сялянаў, якое стрымлівала адток рабочай сілы ў гарады. Пры такім раскладзе і існаванні нізкаякаснай тэхнікі немагчыма было думаць пра павелічэнне прадукцыйнасці вытворчасці.***

***Найбольшымі грашовымі сродкамі распараджаліся магнаты, якія часам маглі дазволіць сабе на ўласную рызыку нейкія эксперыменты з мэтай павелічэння сваіх прыбыткаў. Гэткія рэформы праводзіў Яўхім Храптовіч, які вызваліў сваіх сялянаў ад прыгоннай залежнасці, стварыў у сваіх маёнтках так званую “сялянскую рэспубліку” і, такім чынам, абгрунтоўваў магчымасць здзяйснення пашыранага ўзнаўлення шляхам надання сялянам пэўнай securedэканамічнай свабоды.***

***Але ў большасці сваёй шляхта ВКЛ не стала інвестарам прамысловасці, як гэта было ў Нідэрландах і Ангельшчыне, а менавіта “інвестыцыйная інтэрвенцыя” мае выключнае значэнне для працэсу эканамічнага ўздыму і выйсця са стагнацыі. Таму ў сваіх пачынаннях адміністратар каралеўскіх эканоміяў мог разлічваць толькі на дзяржаўныя пазыкі і крэдыты, а таксама на дармавую працу каралеўскіх сялянаў.***

Аднак патрыятычныя памкненні А.Тызенгаўза не вырашылі, а, наадварот, узмацнілі аграрную праблему ў сталовых эканоміях. У 1770 г. віцэ-адміністратар Брэсцкай эканоміі пан Ляскоўскі скардзіўся каралю на тое, што “ў сялянаў лепшыя землі пад фальваркі забралі, а іх на пяскі перавялі”. У адказ на гэта А.Тызенгаўз, як бы ў апраўданне, заўважыў: “... не я рэвізію ў эканоміях праводзіў, а пан Кройц... а з майго боку на такі ўціск насельніцтва загаду не было”[9].

У 1775 г. вялікі літоўскі гетман Міхал Агінскі даносіў каралю, што ва ўсіх літоўскіх эканоміях адбываецца разбурэнне сялянскіх хатаў і перасяленне некалькіх сем’яў да аднае хаты, каб менш плаціць падаткаў (падымнага). А гэта прыносіла шмат стратаў вайсковай касе Рэчы Паспалітай[10].

Крытычнай кропкі дасягнула гаспадарчае становішча ў сталовых эканоміях у 1777 г. Так, у Горадзенскай эканоміі, цэнтры эканамічных і культурных пераўтварэнняў А.Тызенгаўза, з 1765 г. па 1780 г. колькасць насельніцтва зменшылася прыкладна на 8 %. Разам з тым, нічога не вядома пра якія-небудзь пошасці ці іншыя здарэнні такога кшталту на тэрыторыі Горадзеншчыны ў гэты час. Напрыклад, у дакуменце пра стан

Скідальскага ключа гэтай эканоміі за 1777 г. насупраць значнай колькасці сялянскіх прозвішчаў адзначалася: “паншчыны эканамічнай не адпрацоўвае, пайшоў па хлеб”[11]. Сяляне ўцякалі з каралеўскіх уладанняў і наймаліся на працу ў прыватныя шляхоцкія маёнткі, дзе падаткаабкладанне было адчувальна меншае.

31 траўня 1777 г. А.Тызенгаўз выдаў універсал, паводле зместу і стылю напісання – хутчэй асабісты зварот генеральнага адміністратара да сялянства эканоміяў, чым дзяржаўны дакумент. На пачатку ўніверсалу А.Тызенгаўз заўважыў, што з часу панавання Станіслава Аўгуста ўсе намаганні соймаў скіроўваліся на тое, каб увесці ў каралеўскіх эканоміях ВКЛ лепшае ўпарадкаванне і лепшае гаспадарства, “паколькі парадак ёсць душа ўсіх рэчаў... ён заахвочвае валашчанаў да працы, бароніць ад ляноты, ажыўляе прамысловасць у гаспадарцы, ахоўвае ўласнасць кожнага, і сяляне становяцца больш здольнымі да выплаты скарбовых падаткаў”[12].

Далей А.Тызенгаўз нагадаў насельніцтву эканоміяў, што былыя арандатары дбалі не пра пратэкцыю і дапамогу для сялянаў, а толькі пра ўласныя выгады, пры іх кіраўніцтве заняпалі скарбовыя двары, корчмы, млыны; зараслі грунты; дарогі, масты і паромы сталі непрыдатныя для карыстання. А цяпер перамеры зямлі ўжо скончыліся, павіннасці вызначаны, парадак наведзены, засталося толькі спакойна жыць і працаваць.

Фразеалогія наступнага звароту генеральнага адміністратара да падданых эканоміяў ёсць зусім нечаканай і нетыповай: “Укаханыя сяляне (Kochane Толькі ўпартая ваша несвядомасць колькі разоў зрывала і не давала ходу маім стараннасцям, якія толькі для вашага дабра ўводзіліся. Найгоршыя даўнія звычаі (верагодна, чынш. – І.К.) былі для вас мілымі, а лепшыя мае навізны – прыкрымі”[13].

Складваецца ўражанне, што гэты ўніверсал А.Тызенгаўза адрасаваны не столькі сялянам, колькі шырокай грамадскасці з мэтай нагадаць пра створаны ім адміністрацыйны парадак у эканоміях, у параўнанні з папярэднім перыядам, і падкрэсліць пры гэтым адсутнасць уласнай выгады, а толькі клопат пра інтарэсы каралеўскага скарбу.

Аднак гэта не дапамагло. У дадатак, тавары, выпушчаныя на мануфактурах, не знаходзілі збыту, і гэта, разам з пагаршэннем эканамічнай сітуацыі ў эканоміях, адмоўна сказвалася на паступленнях у скарб. І ў 1777 г. высокі калісьці палітычны рэйтынг надворнага падскарбія пачаў імкліва падаць: у гэтым годзе А.Тызенгаўз быў адхілены ад кіраўніцтва каралеўскімі ўладаннямі, а ў 1780 г. пазбаўлены іншых дзяржаўных пасадаў.

То чые ж прапановы, Кройца ці Тызенгаўза, былі найбольш аптымальнымі для рэфармавання сельскай гаспадаркі Беларусі ў другой палове XVIII ст.? Усё такі чынш ці паншчына?

У 80-я г. XVIII ст. гэтая праблема дыскутавалася больш актыўна, нават на старонках прэсы (у “Газеце Варшаўскай”). Прыхільнікі паншчыны падмацоўвалі свае погляды немагчымасцю і недазволенасцю парушаць “даўнія звычаі”. Іх супраціўцы звярталі ўвагу на тое, што ўсе законы выдавалі “Кароль і Народ” (маецца на ўвазе народ палітычны, шляхта), а паколькі ўмовы жыцця змяніліся, то “Кароль і Народ” не толькі могуць, але і абавязаны ўдасканаліць правы і прывілеі[14].

Далейшае развіццё каралеўскіх эканоміяў у Беларусі паказвае, што адбылася пэўная пераарыентацыя дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да гэтага віду ўладанняў. У 1780 г. ліквідавана каля 25 дзён паншчыны ў год і розных дробных пабораў на суму ад 10 да 15 злотых з гаспадаркі, відавочна павялічылася колькасць чыншавых гаспадарак (за 4 гады на 5 %). Сялян сталовых эканоміяў пераводзлі на чынш цэлымі вёскамі і нават ключамі. Складзенае ў 1782 г. каралеўскім шамбелянам Томашам Адамам Урускім данясенне каралю наконт стану ў літоўскіх эканоміях сведчыць, што "зробленыя палёгкі і льготы далі магчымасць амаль усім падданым лепш брацца за гаспадарства і садзейнічалі таму, што шмат збеглых назад вярнуліся"[15]. Да таго ж, Урускі заўважыў, што неабходна як мага хутчэй зліквідаваць фальваркі, якія знаходзяцца на значнай адлегласці і для апрацоўкі якіх падданыя павінны некалькі міляў хадзіць. Раздача такіх фальваркавых грунтаў на чынш, згодна меркаванню Урускага, "была б карыснай для скарбу і павялічыла б аселасць, а значыць і чынш, што не саступала б даходам з фальварку"[16].

Відавочна, што ў час існавання традыцыйнага, даіндустрыяльнага грамадства, калі становішча аграрнага сектару ў значнай ступені вызначала агульны стан эканамічнага жыцця, рашаючы ўплыў на гаспадарчае развіццё мела палітыка ўлады ў дачыненні да сялянаў і землеўладальнікаў, а таксама яе ўплыў на збіранне падаткаў і размеркаванне прывілеяў. Змяненне ў 80-я г. XVIII ст. кірунку скарбовай гаспадарчай палітыкі ў бок паслаблення падаткова-павіннаснага абкладання, змяншэння паншчыны ці нават поўнага вызвалення ад яе сялянаў каралеўскіх сталовых эканоміяў у ВКЛ і такім чынам надання ім пэўнай эканамічнай свабоды сталася стымулам для развіцця іх гаспадарчай ініцыятывы і агульнага паляпшэння эканамічнай сітуацыі ў краіне.

Вернемся да падзеяў 1765 г. Тэарэтычна магчымасць падаць свае праекты на разгляд Скарбовай камісіі была ўва ўсіх, розныя зацікаўленыя асобы маглі прымаць удзел у іх абмеркаванні. Аднак канчатковае рашэнне на карысць тых ці іншых прапановаў залежала ад шмат якіх, пераважна суб'ектыўных фактараў, галоўнымі з якіх былі наяўнасць улады і магчымасць уплываць на караля. Надзелены шырокімі паўнамоцтвамі А.Тызенгаўз у 1765 г. адмовіўся правесці нават апрабацыю праекту Л.Кройца, аднак слушнасць рэфарматарскіх прапановаў віленскага каморніка даказана часам.

***Ірына КІТУРКА (Горадня)***
***i_kiturko@mail.ru***

[1] Volumina legum. – Petersburg, 1860. T. VII. – S. 75–78.
[2] Тамсама. С. 75.
[3] Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве (ГАСА), ф. Archiwum Kameralne (AK), спр. III/26, арк. 237.
[4] ГАСА, ф. АК, спр. III/27, арк. 127.
[5] Тамсама, арк. 133.
[6] Тамсама, ф. Archiwum Tyzenhauzów (AT), спр. D–1, арк. 245.
[7] Тамсама, ф. АК, спр. III/28, арк. 88.
[8] Похилевич Д. Аграрная реформа А. Тизенгауза и Шавельское восстание // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1958. – Таллин, 1959. – С. 287–288.
[9] ГАСА, ф. АК, спр. III/270, арк. 37 адв.
[10] Тамсама, спр.III/268, арк. 17.
[11] Тамсама, спр. III/166, арк. 13.
[12] Тамсама, ф. AT, спр. D–25, арк. 68.

[13] Тамсама.
[14] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) у Горадні, ф. 1663, воп. 1, спр. 415, арк.3.
[15] ГАСА, ф. АК, спр. ІІІ/68, арк. 5.
[16] Тамсама, спр. ІІІ/69, арк. 454.

# Арганізацыя найманых аддзелаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV—XVI стст.

*Юрась БОХАН*

Значная эпізадычнасць у выкарыстанні наёмных аддзелаў у Вялікім Княстве Літоўскім да канца XV ст. не дазваляе ў поўным аб'ёме разгледзеіць іх арганізацыю, выдзяленне структурных адзінак, кіраванне і вылучэнне катэгорыяў вяяроў у гэты перыяд. Можна толькі меркаваць, што арганізацыя баявых адзінак, якія паходзілі з еўрапейскіх краінаў і служылі за грошы, мала чым адрозніваласяя ад звыклай на іх радзіме.

Даследнікі вайсковае справы краінаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, адкуль, галоўным чынам, і вербаваліся ў першай палове XV ст. наёмнікі для патрэбаў Вялікага Княства, адзначаюць, што асноўнай арганізацыйна-тактычнай адзінкай тыповых рыцарскіх армій тут з'яўлялася харугва, якая выступала пад асобным сцягам і пад час бою шыхтавалася глыбокай, звужанай наперадзе калонай – клінам. "Галаву" кліна складалі цяжкаўзброеныя рыцары, забяспечаныя найбольш цягавітымі коньмі, максімальна поўным засцерагальным узбраеннем і дрэўкавай зброяй – капійнікі. Ззаду іх размяшчаліся больш лёгкія стральцы, асноўны баявы рыштунак якіх складала зброя далёкага бою – лук ці, што часцей, арбалет. Задачай капійнікаў было праломванне непрыяцельскіх шыхтоў пад прыкрыццём стральцоў, якія вялі агонь паверх галоваў пярэдніх лініяў. Пасля гэтага бітва распадалася на асобныя паядынкі з ужываннем зброі блізкага бою.

Найдрабнейшай арганізацыйнай адзінкай, якая і вызначала характар баявой пабудовы харугвы, з'яўлялася так званае "кап'ё", якое мусіла складацца з аднаго капійніка (даводцы аддзелу) і некалькіх, у ідэале двух стральцоў. На практыцы ж, аднак, колькасць стральцоў магла моцна вагацца. У польскім войску, напрыклад, на аднаго капійніка ў сярэднім прыпадала тры стральцы. Сустракаліся выпадкі прысутнасці ў "кап'і" толькі капійнікаў і нават толькі стральцоў[i]. Аналіз крыніцаў сведчыць, што прынамсі з канца XIV ст. падобная структура прысутнічала і ў войску Вялікага Княства Літоўскага. Можна меркаваць, што кардынальнай розніцы ў арганізацыі наёмных харугваў і харугваў паспалітага рушэння Вялікага Княства не існавала.

Больш акрэслена структура наёмных аддзелаў у войску ВКЛ выступае з канца XV ст. Яны фігуруюць у гэты час пад назвай "рота", што ў перакладзе з нямецкай мовы азначае "аршак", "аддзел". У лацінамоўных дакументах роты фіксуюцца пад тэрмінам comitiva[ii]. Як адзначалася, найманыя роты Вялікага Княства, асабліва на пачатковым этапе, у значнай ступені вербаваліся на тэрыторыі Польшчы. Таму структура польскіх ротаў і парадак іх найму маюць для разгляду акрэсленага пытання надзвычай важнае значэнне. Варта зацеміць, што структура польскіх ротаў сфармавалася ўжо ў канцы XV – пачатку XVI стст., і пратрывала як на каронных, так і на вялікакняскіх землях, з нязначнымі зменамі, да канца Рэчы Паспалітай. Неабходна таксама зазначыць, што апроч польскіх ротаў, у Вялікім княстве Літоўскім маглі несці службу і фармаванні з больш аддаленых краёў, якія, напэўна, вызначаліся адмысловай арганізацыяй. Нямецкая ландскнехцкая пяхота (peditibus) ў канцы XV ст. складала асабістую ахову вялікага князя Аляксандра, а ў 1501 г. іх замянілі швайцарцы[iii].

Першапачаткова сталай нормы ў колькасным складзе найманых аддзелаў, як пешых, так і конных, не існавала; яны маглі налічваць ад некалькіх да некалькіх соцень асобаў[iv]. Можна меркаваць, што ў падобным колькасным складзе траплялі яны і на землі Вялікага Княства Літоўскага. Прынамсі ў спісе ротмістраў, нанятых у 1480 г. для барацьбы з Маскоўскай дзяржавай, фігуруюць асобы, якія мелі ў сваім распараджэнні аддзелы ў 40, 43, 60, 88, 95, 102, 113, 116 і 318 коней[v].

На чале роты стаяў ротмістр, якому належала ініцыятыва ў яе фармаванні. Паступаючы на службу, ротмістры заключалі дамову з каралём, агаворваючы розныя акалічнасці й умовы службы (сума выплатаў, тэрмін атрымання грошай і г.д.) Ротмістры атрымоўвалі спецыяльны дакумент, у якім пазначалася плата за камбатанта, што вагалася ў залежнасці ад характару ягонага ўзбраення. Ротмістры пры фармаванні ротаў заключалі дамову са знаёмымі ці рэкамендаванымі ваярамі, якія называліся таварышамі (у лацінамоўных дакументах – socius). Таварышы быццам добраахвотна прызнавалі ўладу ротмістра і, у сваю чаргу, з'яўляліся малодшымі афіцэрамі, даводцамі сфармаваных атрадаў – “почтаў”, колькасны склад і характар узбраення якіх залежалі ад заможнасці кожнага канкрэтнага таварыша. Такая сістэма вярбоўкі “служэбных” дазваляла ротмістрам падабраць найбольш аптымальны склад баявых адзінак. Калі роты налічвалі колькасць ваяроў, недастатковую для стварэння паўнавартай баявой адзінкі, яны аб'ядноўваліся ў больш буйныя. У такіх выпадках яны ўзначальваліся адным з ротмістраў па дамоўленасці, а астатнія выступалі ў якасці таварышаў. Верагодна, такія асобы часам фігуруюць у крыніцах XVI ст. пад тэрмінам “паручнік”. Паручнікі выступалі таксама ў ролі намеснікаў ротмістраў і замяшчалі апошніх падчас іх адсутнасці[vi].

Як ужо адзначалася, арганізацыя найманых аддзелаў, якая склалася ў канцы XV ст., без асаблівых зменаў пратрывала да канца існавання Рэчы Паспалітай. У XVI ст. адбыліся толькі невялікія карэктывы ў арганізацыі ўмоваў найму. Па-ранейшаму ротмістры атрымоўвалі спецыяльныя дакументы на вярбоўку жаўнераў, якія называліся “лістамі прыпаведнымі”. Найстарэйшы ўзор “ліста прыпаведнага” датуецца 1514 г. У гэтых лістах пазначаліся колькасны склад ротаў, аплата за камбатанта, від узбраення, час і месца збору. Ротмістры дамаўляліся з таварышамі аб выстаўленні пэўнай колькасці ваяроў, вызначалі месца збору, адкуль ехалі на месца попісу. Таму роты XVI ст. выглядаюць больш аднароднымі як у сэнсе колькаснага складу, так і з гледзішча ўзбраення[vii]. Напрыклад, сярод ротаў, якім было заплочана ў 1514 г. за ўдзел у вайне з Маскоўскай дзяржавай, усе, апроч роты Януша Свярчоўскага, якая налічвала 30 коней, а таксама ротаў Цетрыца й Лушчоўскага, дзе мелася па 100 коней, налічвалі па 200 чалавек. Характэрна, што гэта тычылася і конных, і пешых ротаў[viii].

Нягледзячы на тое, што ротмістрам належала значная свабода ў фармаванні ротаў, яны не разглядаліся, у адрозненне ад іншых краёў Еўропы, як “прыватныя прадпрымальнікі”, што прапаноўвалі сфармаваныя са сваёй ініцыятывы войскі добраахвотна выбраным працадаўцам. Ротмістры выступалі хутчэй у якасці каралеўскіх афіцэраў, што дзейнічалі на падставе каралеўскага патэнту, якім з'яўляліся згаданыя “лісты прыпаведныя”[ix]. Статус службовых асобаў замацоўваўся прынясцем прысягі.

Захаваўся ўзор прысягі, якую мусілі прыносіць ротмістры, паступаючы на службу Вялікага Княства Літоўскага. Ён датуецца 1561 г. і гучыць наступным чынам: Я... прысегаю через имя Божъе его королевской млсти и великому князству Литовскому верне, цнотливе и зычливе на том ураде ротмистрова так на замку, яко и в полю – служить; небезпечности вшелякое стереч, и где быx о ней што ведал, ее не таить, але

его королевской мл̃сти и речи посполитой панам радам великого князства Литовского ознаймовати; а пильне врадови моему ротмистровскому и сторожы, мне поручоной, досить чинити, так около варт обороны замку, яко в захованью зуполна роты завжды служебных, мне поручоных; и теж на местцу и в тягнени заховаться без обтяженья подданых его кор. мл̃сти.

Так ми, Боже, помогай, и тая светая Евангелия[x]

Варта, нарэшце, адзначыць, што ініцыятыва збірання ротаў магла належаць не толькі ротмістрам. Прынамсі ў XVI ст. у Вялікім княстве Літоўскім назіраюцца выпадкі, калі наёмныя аддзелы фармаваліся вялікакняскімі адміністратарамі (напрыклад старастамі) і служылі пад іх камандай. Да спецыфічнага найму можна залічыць і практыку выстаўлення ў складзе паспалітага рушэння звышнарматыўных почтаў "на ласку гаспадарскую", якая з'яўляецца, фактычна, толькі больш разгорнутай мабілізацыяй у рамках таго ж самага феадальнага апалчэння.

Унутраная структура конных ротаў канца XV ст. мала чым рознілася ад харугваў папярэдняга перыяду. Найдрабнейшай арганізацыйнай адзінкай у іх з'яўляўся почат, які сягае сваімі каранямі ранейшага "кап'я". Па-ранейшаму кавалерыя дзялілася на цяжкаўзброеных капійнікаў і лёгкіх стральцоў, прычым існавала тэндэнцыя да забеспячэння шараговых камбатантаў (пахолкаў, якія маглі называцца таксама чэляддзю) стрэльчым узбраеннем, тады як даводцы почтаў-коп'яў (таварышы) выступалі часцей у цяжкім, капійнічым варыянце. Існавала градацыя і ў характары коней, ужываных цяжкой ці лёгкай кавалерыяй. Выдзяляліся коні "капійнічыя" й "стрэльчыя"; абедзве гэтыя катэгорыі дзяліліся на падкатэгорыі – добрыя, сярэднія, роўныя і г.д. Як і ў папярэднія часы, задачай капійнікаў было праломванне непрыяцельскіх шыхтоў, тады як стральцы падтрымлівалі іх залпамі са зброі далёкага бою, а таксама пераследавалі разбітага ворага. Можна было напаткаць і чыста стрэльчыя почты. У шарагу почтаў апроч таварыша-капійніка меўся яшчэ адзін капійнік, што ўзмацняла ўдарную моц аддзела. Увогуле ў залежнасці ад прапорцыі капійнікаў і стральцоў роты падзяляліся на капійнічыя і стрэльчыя. У апошніх суадносіны капійнікаў і стральцоў была не менш як 1:4, тады як у капійнічых ротах на аднаго капійніка ў сярэднім прыпадала 2 стральцы. Апроч пахолкаў, у склад почтаў маглі ўваходзіць так званыя "пахаляты" – асобы, наогул не забяспечаныя ўзбраеннем. Функцыяй пахалятаў было трыманне запаснога каня для таварыша і іншая абслуга (напрыклад, нашэнне ягонага кап'я)[xi]. Нягледзячы на паступовае змяншэнне ролі цяжкаўзброеных капійнікаў на працягу XVI ст., яны прысутнічалі ў наёмным войску нават у другой яго палове. Так, са 150 кавалерыстаў роты Станіслава Лесьнёўскага, "папісанай" у 1561 г. у Бярэсці, налічвалася ажно 52 капійнікі, што складала больш за 1/3 усіх камбатантаў[xii].

Пры прыёме таварышаў на службу праводзіўся попіс іх почтаў з апісаннем коней, іх масці, характэрных асаблівасцяў, а таксама з указаннем узбраення, якое мелася ў распараджэнні кожнага ваяра. На жаль, апісання цэльных ротаў, якія неслі службу ў ВКЛ у канцы XV ст., не захавалася. Аднак попісы асобных почтаў паказваюць, што мясцовая спецыфіка ў арганізацыі наёмнікаў праяўлялася тут у нязначнай ступені. Напрыклад, у 1498 г. у Львове быў папісаны васьміконны почат князя Міхала Глінскага, які ў тым самым годзе ўзгадваецца сярод дваранаў вялікага князя Аляксандра. Сам таварыш выехаў на капійнічым кані ў зброі (даспеху), без указання наступальнага ўзбраення, і меў яшчэ запаснога капійнічага каня. 6 пахолкаў Глінскага былі забяспечаны зброямі і арбалетамі і выехалі на стрэльчых конях, за выключэннем аднаго камбатанта, які, падобна даводцы атрада, меў каня капійнічага[xiii]. Ганс

Калькрайтар, які паступіў на службу да Аляксандра ў Мельніку 28 верасня 1501 г., меў почат у 4 "кані". Самі коні былі стрэльчыя, прычым запасныя коні адсутнічалі. Усе ваяры былі забяспечаныя "зброямі стрэльчымі", гэта значыць паўдаспехамі; трое з іх былі ўзброеныя арбалетамі, адзін – "дрэўцам" (капʼём)[xiv]. Пэўная спецыфіка назіралася ў структуры почтаў Турака і Яна Бучацкага, ваяводзіча падольскага, якія таксама былі сярод дваранаў Аляксандра ў 1498 г. У почце Турака (Turek) налічвалася ў 1498 г. дванаццаць "коней". Сам таварыш выехаў на кані капійнічым, быў забяспечаны зброяй капійнічай і, напэўна, капʼём. Цікава, што ў почце меліся ажно тры запасныя "добрыя" капійнічыя кані "пад пахолкамі". Шэсць шараговых камбатантаў выехалі на стрэльчых конях, у стрэльчых даспехах і мелі, як можна меркаваць, зброю далёкага бою. Яшчэ адной асаблівасцю згаданага почта зʼяўлялася прысутнасць двух татараў, узбраенне якіх акрэслена ў нетрадыцыйнай манеры як sabwya szelam[xv]. Са структурай почта Турака ў значнай ступені пераклікаецца апісанне аддзела Яна, ваяводзіча падольскага за 1499 г. Ён налічваў 13 "коней". Два ваяры, уключаючы самога таварыша, мелі "добрых" капійнічых коней і капійнічыя зброі, прычым Ян меў таксама запаснога каня. Восем камбатантаў "папісаліся" на добрых стрэльчых конях і ў стрэльчых зброях. Апроч таго, у почце, як і ў аддзеле Турака, знаходзіліся два вершнікі, узброеныя па-татарску[xvi]. Не выключана, што татары, неўласцівыя польскім почтам, выконвалі тут якія-небудзь дапаможныя, напрыклад, разведвальныя функцыі.

На пачатку XVI ст. сярод наёмнікаў фіксуецца новы від кавалерыі, які быў сфармаваны ў Венгрыі – гусары, альбо "рацы". Гусары зʼяўляліся лёгкім варыянтам капійнікаў, былі забяспечаныя капʼём спецыфічнай канструкцыі, шчытом характэрнай трапецыяпадобнай формы і шабляй. Гэты від кавалерыі добра зарэкамендаваў сябе ў барацьбе з туркамі. Ва ўмовах неабходнасці весці баявыя дзеянні з лёгкай татарскай і маскоўскай кавалерыяй ён быў прыняты ў Польшчы і ВКЛ, і ў далейшым аказаў вялізарны ўплыў на развіццё вайсковай справы ў гэтых краінах. Ужо ў роце Якуба Сецыгнёўскага, папісанай у 1501 г. у Мельніку, фіксуецца значная колькасць "рацаў", хаця прысутнічалі тут і ваяры ў традыцыйным, капійнічым узбраенні[xvii]. Мацей Стрыйкоўскі таксама пад 1501 г. адзначае, што нямала "рацаў" служыла па-гусарску за літоўскія грошы[xviii]. У 1502 г. у Кракаве было нанята 13 гусарскіх почтаў, якія складалі харугву, што налічвала каля 90 коней. Плату атрымалі наступныя таварышы, пераважна венгры: Андрых – 40 флорынаў, Каспер Чакель – 40 фл., Баляш Герэш – 25 фл., Індрых – 17 фл., Харват Юрга з братамі Дымітрам і Надбалашам – 10 фл., Венцлаў Любіч – 40 фл., Люка – 20 фл., Міхал – 40 фл., Анджых Мніхоўскі – 100 фл., Каспер Чакель – 40 фл., Міхаэль – 30 фл., Люкас – 25 фл., дэ Кіндрыш – 25 фл.[xix]. Да сярэдзіны XVI ст. у Вялікім Княстве зʼяўляюцца ўласныя роты, якія фігуруюць як "гусарскія", хоць камплект іх узбраення істотна адрозніваўся ад мадэлі, характэрнай для класічных венгерскіх гусараў ранейшага часу. Так, ваяры выкарыстоўвалі разнастайнае засцерагальнае ўзбраенне – панцыры, "зброі бляхавыя", шлемы розных тыпаў, побач з шабляй шырока ўжываліся мячы і корды, асобныя камбатанты маглі не мець шчыта.

Гусары таксама належалі да капійнічай кавалерыі, хоць і да аблегчанага яе варыянта. Асаблівасцю гусарскіх ротаў была перавага ў іх ваяроў, забяспечаных дрэўкавай зброяй, а не стральцоў. Прыкладам гусарскай роты другой паловы XVI ст. можа служыць рота Філона Сымонавіча Кміты Чарнабыльскага, папісаная ў 1567 г. Апроч ротмістра, у склад роты, што налічвала 152 вершнікі, ўваходзілі паручнік, які вывеў уласны почат, "кгермек с хоруговью", "бубеніца з бубны", 10 "служэбнікаў", 25 таварышаў і шараговых пахолкаў. Уласна гусарскае ўзбраенне мелі толькі пахолкі і "гермек" [збраяносец – Ю.Б.], а камандны склад належаў да стральцоў ці нават меў толькі клінковую зброю. "Бубеніца" не меў узбраення зусім. Усе камбатанты роты, не

выключаючы пахолкаў, пералічаныя ў рэестры пайменна. Гэта было не характэрна для попісу каронных конных ротаў, у тым ліку і ліцвінскіх аддзелаў на польскай службе, дзе называліся імёны толькі таварышаў. Магчыма, падобная акалічнасць звязаная з асаблівасцямі камплектавання роты Кміты Чарнабыльскага, калі таварышы складалі свае роты не з уласных падданых, з якімі неслі службу і ў паспалітым рушэнні, а з найманых жаўнераў, у тым ліку і замежнага паходжання[xx].

У XVI ст. у войску Вялікага Княства Літоўскага фіксуюцца і іншыя ўнармаваныя віды кавалерыі, з якіх асобна варта адзначыць казакоў. Казацкая кавалерыя сягае сваімі каранямі ў XV ст., калі гарадскі плебс і збеглыя сяляне, што засялялі абшары нізавой Украіны, імкнучыся знайсці паратунак ад татарскае пагрозы, пачалі групавацца ў ватагі пад даводствам "атаманаў". Выдатна знаёмыя з мясцовасцю і спосабам вядзення вайны сваіх праціўнікаў, гэты люд выпрацоўваў вайсковую традыцыю, максімальна прыдатную для барацьбы з татарамі. Ад татараў была запазычана і назва казак, што азначае "свабодны, незалежны чалавек", але разам з тым авантурыст і разбойнік. Паступова фармавалася агрэсіўная баявая сіла, здольная не толькі супрацьстаяць драпежніцкім татарскім нападам, але і здзяйсняць напады ў адказ.

Спробы прыцягнуць казакоў да вайсковае службы назіраюцца ўжо ў канцы XV – пачатку XVI ст., калі старасты ўкраінскіх замкаў імкнуліся вербаваць казацкія аддзелы на ўласную службу. У 1503 г. ваявода Кіеўскі Дымітр Пуцячыч меў у сваім распараджэнні казакоў, якія служылі ў Кіеве ("Казакі князя Дымітра") і Чаркасах ("Шчурава рота"). Найважнейшая роля ў арганізацыі казацкіх почтаў на службе Вялікага княства Літоўскага належыць Астафею Дашкевічу, які ў 1508 г. становіцца старастам канёўскім, а ў 1514 г. – старастам чаркаскім, а таксама Андрэю Неміровічу, намесніку чаркаскаму з 1511 г. і ваяводу кіеўскаму з 1514 г. У 1521–1524 гг., праўдападобна з ініцыятывы Дашкевіча ці Неміровіча, узнік праект (часткова ўжо рэалізаваны на практыцы): рэгістрацыі нізавых казакоў і прыёму іх на гаспадарскую службу. Праект быў адхілены з-за недахопу фінансавых сродкаў, аднак практыка вярбоўкі казакоў для вайсковай службы працягвалася і далей[xxi].

Практыка засведчыла перспектыўнасць казацкай вайсковай манеры, што спрыяла яе шырокаму распаўсюджанню. Асноўнай зброяй казакоў быў лук, які з цягам часу мог дапаўняцца кароткадрэўкавым капʼём – рагацінай. Такім чынам, казакі маглі выступаць не толькі як стрэльчая, але і як універсальная кавалерыя, што значна падвышала яе баявыя якасці. Паступова назва казак стала абазначаць ваяра не толькі ўласна з поўдня Украіны, але і кожнага, забяспечанага адпаведным вайсковым рыштункам. Прыклад арганізацыі казацкіх почтаў дае рэестр гусарскай роты Філона Кміты Чарнабыльскага за 1567 г., да якой быў далучаны аддзел казакоў у 48 чалавек. Яны мелі звыклую таварыскую структуру, аднак, у адрозненне ад гусарскіх і капійніча-стрэльчых почтаў, асаблівай розніцы ва ўзбраенні таварышаў і пахолкаў не назіралася – усе камбатанты забяспечваліся панцырамі, прылбіцамі ці шышакамі, сагайдакамі, рагацінамі і шаблямі; некаторыя дадаткова мелі яшчэ і сякеркі[xxii].

Нягледзячы на распаўсюджанне ў XVI ст. новых катэгорый ваяроў, кавалерыйскія роты былі па-ранейшаму прадстаўленыя двума відамі – у залежнасці ад дамінавання ў іх ваяроў, забяспечаных дрэўкавай зброяй ці зброяй далёкага бою. Крыху іншая сітуацыя назіралася ў польскіх пешых ротах, якія, адрозна ад пяхоты бальшыні тагачасных еўрапейскіх армій, мелі відавочна стрэльчы характар. Гэта тлумачыцца тым, што на абшарах Польшчы і ВКЛ асноўнае значэнне мела кавалерыя, тады як пяхоце адводзілася другарадная, дапаможная роля. Мела польская пяхота спецыфіку і

ў сваёй структуры. Да канца XV ст. пешыя роты, падобна ротам кавалерыйскім, дзяліліся на почты, колькасны склад якіх мог вагацца ад некалькіх да двух дзесяткаў чалавек. Почты ўзначальваліся таварышамі, а шараговыя камбатанты называліся чэляддзю. У залежнасці ад комплекса наступальнага і засцерагальнага ўзбраення ў польскай пяхоце вылучаліся дзве катэгорыі ваяроў – павезнікі, узброеныя вялікімі шчытамі-павезамі і стральцы, забяспечаныя арбалетамі ці, што радзей, ручніцамі. Падчас бою павезнікі размяшчаліся наперадзе, па баках і ззаду баявога парадку, складаючы прыкрыццё для стральцоў, што стралялі паверх іх галоў. Апроч павезнікаў і стральцоў, пры ротах знаходзіліся камбатанты са сцяжкамі-прапорцамі – апазнавальнымі знакамі, а таксама некалькі вершнікаў на капійнічых альбо стрэльчых конях і з адпаведным комплексам узбраення. Іх колькасць не ўнармоўвалася і магла быць самай рознай[xxiii]. Падобная ж сітуацыя назіралася і ў польскіх ротах, што неслі службу на землях Вялікага княства Літоўскага, што ілюструе рэестр шарагу пешых ротаў, фіксаваных у 1503 г. у Вільні, Полацку, Віцебску, Барысаве і г.д.[xxiv].

Рэестр найманых пешых ротаў, што служылі ў Вялікім Княстве Літоўскім у 1503 г.

| Рота | Пешыя | Конныя | Заплочана (у флорынах) |
|---|---|---|---|
| Жэбрыдоўскі | 200 | 4 | 306 |
| Корбер Матыяс | 100 | 2 | 173 |
| Ляхета | 70 | 2 | 108 |
| Хынэк Марцін | 50 | 1 | 56 фл. 11 гр. |
| Крэмпскі Ян | 80 | 2 | 123 |
| Сокул Славіцкі Ян | 200 | 6 | 309 |
| пан Чэрнін | 64 | 36 | 200 |
| Чэрны і Вітанскі | 89 | 2 | 182 |
| Дрэвасчыцкі Ян | 213 | 4 | 434 |
| Хынэк Мікалай | 266 | 6 | 544 |
| Калюш Ян | 344 | 27 | 742 |
| Каня Альберт | 282 | 31 | 626 |
| Каспер і Крыкоўскі | 98 | 4 | 204 |
| Козел і Крыўвоўскі | 7 | 4 | 18 |
| Крысторскі Пётр | 160 | 4 | 328 |
| Кульгавы Шымэк | 382 | 16 | 796 |
| Марцы і Патола | 212 | 6 | 436 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Матушка | 224 | 6 | 460 |
| Мынцар Ян | 251 | 3 | 508 |
| Аламунецкі Ян | 121 | 3 | 248 |
| Рапата | 171 | 4 | 350 |
| Сальва Станіслаў | 105 | 3 | 216 |
| Счавіньскі Ян | 140 | 3 | 286 |
| Скала Ян | 222 | 6 | 456 |
| Стэрнішча Стэфан | 88 | 3 | 182 |
| Шалёны Пётр | 106 | 4 | 220 |
| Камічоўскі Януш | 200 | 4 | 816 |
| Кавалёўскі Ян | 100 | 2 | 408 |
| Павіньскі Адам | 100 | 2 | 408 |

Яшчэ ў пачатку XVI ст. колькасць “коней” пры пешых ротах не нармавалася. Пры ротах, якія ўдзельнічалі ў кампаніі 1514 г. і налічвалі па 200 драбаў, магло знаходзіцца па 3 альбо па 5 “коней”[xxv]. Аднак ужо ў гэты час пазначылася відавочная тэндэнцыя да большай упарадкаванасці структуры ротаў. “Лісты прыпаведныя” прадугледжвалі 1 каня на 50 драбаў. На тую самую колькасць пехацінцаў мусіў прыпадаць адзін прапорац. У якасці аптымальнай колькасці камбатантаў у почце быў прызнаны дзесятак, на чале якога стаяў таварыш – дзесятнік. У рэальнасці, аднак, сустракаліся некамплектныя дзесяткі, што адмоўна адбівалася на глыбіні шыхту, бо колькасць драбаў у кожным дзесятку мусіла адпавядаць колькасці шэрагаў.

Пэўныя навацыі назіраліся і ў выдзяленні катэгорыяў драбаў. З канца XV ст. у складзе дзесяткаў з’яўляюцца капійнікі ў поўных капійнічых даспехах, забяспечаныя дрэўкавай зброяй. У часы панавання апошніх Ягелонаў у наёмнай пяхоце як Кароны, так і Літвы фіксуюцца 3 віды ротаў. (Зрэшты, невядома, ці тычылася гэта замежнай пяхоты, найманай па-за межамі Польшчы, напрыклад, нямецкай ці швайцарскай). Першы від прадугледжваў наяўнасць капійнікаў, павезнікаў і стральцоў, прычым капійнікі з павезнікамі размяшчаліся наперадзе шыхту. Задачай капійнікаў было актыўнае стрымліванне атакуючага праціўніка, тады як павезнікі, як і ў папярэднія часы, стваралі ахову для ваяроў, забяспечаных зброяй далёкага бою. Асартымент апошняй таксама паступова змяняўся і ў 20-х гг. XVI ст. ручніцы канчаткова выцеснілі арбалеты. Прынцып вядзення агню з ручніцаў у складзе баявога шыхтавання роты адрозніваўся ад ранейшага, калі асноўнай зброяй з’яўляўся арбалет. Стральба цяпер вялася спачатку апошнім шарагам, прычым пярэднія станавіліся на калена, пасля перадапошнім, пасля трэцім ззаду і г.д.[xxvi].

У якасці прыкладу капійніча-павезніцка-стрэльчых ротаў можна прывесці роту Веляглоўскага, якая знаходзілася ў 1552 г. у складзе сіл, што прыкрывалі аднаўленне Брацлаўскага замку на Падоллі. Дзесяткі роты Веляглоўскага складаліся з капійнікаў у капійнічых зброях з ашчэпамі і мячамі, павезнікаў з павезамі, “мыскамі” (верагодна

наплечнікамі), капалінамі, часам мячамі, а таксама стральцоў з ручніцамі (зрэдку аркабузамі) і мячамі. Колькасны склад дзесяткаў не быў аднолькавы, аднак кожны з іх ўключаў 1 капійніка і 1 павезніка, а рэшту складалі стральцы[xxvii].

Спецыфікай другой мадэлі пешых ротаў з’яўлялася тое, што пры наяўнасці ўласна капійнікаў, павезнікаў і стральцоў, па два стральцы кожнага дзесятку, якія ўваходзілі ў заднія лініі шыхту, былі дадаткова забяспечаныя дрэўкавай зброяй. Аналагічную структуру мелі роты Пятра Брандыса і Роха Бяляўскага, што прыйшлі з Польшчы да Тыкоціна ў 1562 г.[xxviii]. На 150 драбаў роты Пятра Брандыса прыпадала 3 “прапорцы” і столькі ж “коней”. У кожным дзесятку было па 1 капійніку ў зброі капійнічай з ошчапам і мячом і 1 павезніку з павезай, у той час як астатнія былі стральцамі, узброенымі ручніцамі і мячамі, прычым па два стральцы мелі дадаткова яшчэ і пікі – “спісы”. У роце Роха Бяляўскага таксама налічвалася 150 драбаў. Характар узбраення камбатантаў быў прыблізна такі ж самы, як у роце Брандыса, але замест ошчапаў маглі ўжывацца алебарды, а замест ручніцаў – аркабузы. Спецыфіку меў толькі дзесятак самога ротмістра, які ў рэальнасці налічваў 9 чалавек. Апроч Бяляўскага, які меў “зброю капійнічую” і алебарду, тут знаходзіліўся павезнік, 2 стральцы, 2 стральцы са спісамі і тры камбатанты з прапорцамі.

Трэцяя мадэль пешых ротаў прадугледжвала наяўнасць толькі капійнікаў і стральцоў: павезнікі адсутнічалі. Прыкладам трэцяй мадэлі з’яўляюцца дзве роты, што “ляжалі” у 1552 г. у Чаркасах[xxix]. Там при замку Черкаском ротмистр Петр Розбиский указал роту свою, з которою ново там притягнул, сто драбов, личачи, з бубны, з прапоры, з зброями – в десятку каждом по два копийники в зброях, з корды а з алябартами або з ощепы, а по шести стрельцов з ручницы, з мечи. І далей - староста теж указал другий почот драбов же давнейших, которые под его моцью служили, шестьдесят их збройно, личачи в десятку каждом по два копийники в зброях, з ощепы, з корды, а по осми стрельцов з ручницами, з мечи.

Капійніча-стрэльчую структуру мела таксама ў 1577 г. кіеўская рота Каспера Стузіньскага, яая налічвала 200 чалавек[xxx]. На момант складання рэестру Кіеў належаў ужо Кароне Польскай, аднак гэтая рота знаходзілася ў Кіеве яшчэ ў 1562 г., і з таго часу яе структура наўрад ці магла кардынальна змяніцца[xxxi]. Рота, як падаецца, складалася з драбнейшых ротаў (40 драбаў самога Стузіньскага, 20 драбаў паручніка Валентыя Каміньскага і г.д.) Пры роце меліся 4 “кані”, а ў аддзеле ротмістра – 2 “бубны”. У кожным дзесятку роты знаходзіліся па 2 капійнікі, уключаючы таварыша, у “зброях капійнічых”, з мячамі, спісамі, алебардамі ці шэфелінамі. Рэшту складалі стральцы з ручніцамі і мячамі. На ўзбраенні як капійнікаў, так і стральцоў маглі ўзгадвацца таксама прылбіцы, замест якіх часам фігуруюць шышакі.

Дзяржава, як асноўны карыстальнік паслугамі “служэбных”, звяртала пільную ўвагу на выкананне патрабаванняў да ўзбраення, арганізацыі і ўвогуле баяздольнасці найманых ротаў. У XVI ст., калі гэтага патрабавалі абставіны, яны маглі аб’ядноўвацца ў буйнейшыя тактычныя адзінкі. У той жа час велічыня драбнейшых аддзелаў у складзе ротаў строга рэгламентавалася. Прычым калі ў пяхоце змяншэнне колькаснага складу дзесяткаў выклікала, па адзначаных вышэй прычынах, адмоўную рэакцыю, то ў кавалерыі наадварот, склалася тэндэнцыя да абмежавання колькасці пахолкаў. Так, у “артыкулах, якія маюць быць апавяданыя пры раздаванні грошай ротмістрам і даваным на цэдулах” за 1557 г. падрабязна апісваліся патрабаванні да якасці коней і характару ўзбраення (забаранялася, напрыклад, цяжкаўзброеным кавалерыстам мець кальчужныя панцыры замест пласцінавых даспехаў і шаблі замест мячоў), а таксама адзначалася недапушчальнасць павелічэння почтаў за кошт пахолкаў, што змяншала б

колькасць найбольш выпрабаваных ваяроў – таварышаў. У гэты час за аптымальную лічбу камбатантаў у конным почце прымалася 4–8 чалавек, а за верхнюю мяжу прымалася лічба ў 10 ваяроў[xxxii]. Такім чынам пазначылася тэндэнцыя да ўнармавання колькаснага складу пешых і конных аддзелаў.

**Юрась БОХАН**


[i] Nadolski A. Ogólna charakterystyka // Polska technika wojskowa do 1500 roku. Z dziejów nauki i techniki. T.1. Warszawa, 1994. S.192–196; Nadolski A. Podsumowanie // Uzbrojenie w Polsce średniowiecznej 1350–1450. Ldz, 1990. S.425-427; Nadolski A. Grunwald. Problemy wybrane. Olsztyn, 1990. S.49-50.

[ii] Górski K. Historia jazdy polskiej. Kraków, 1895. S.4–5.

[iii] Pietkiewicz K. Dwór Litewski wielkiego Księcia Aleksandra Jagiełłonczyka. S.93.

[iv] Там жа. S.4–5; Górski K. Historia piechoty polskiej. Krakow, 1893. S.6.

[v] Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Ksiestwa Litewskiego za Jagełłonów. T.I. 1377 – 1499. Warszawa, 1930. S.335.

[vi] Górski K. Historia jazdy polskiej. S.4–14; Górski K. Historia piechoty polskiej. S.6.

[vii] Górski K. Historia jazdy polskiej. S.28–29; Górski K. Historia piechoty polskiej. S.7.

[viii] Акты литовско-русского государства (с предисловием М.В. Довнар-Запольского). Вып. 1. Москва, 1899. С.155–156.

[ix] Nadolski A. Ogólna charakterystyka. S.196.

[x] Малиновский И. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого Княжества Литовского // Известия императорского томского университета. Кн.21. Томск, 1902. С.84.

[xi] Górski K. Historia jazdy polskiej. S.6—13; Nadolski A. Ogólna charakterystyka. S.196.

[xii] Semkowicz Wł. Popis wojska polskiego z lat 1561 – 1564 i wyobrazone w nim pietna konskie // Wiadomości numizmatyczno-archeologiczne. T.XII – R.1928 i 1929. Kraków, 1930. S.108.

[xiii] Archiwum Glówny Akt Dawnych w Warszawie, Konsygnacja dawnych akt wojskowych, dz.85, nr.3. K.108.

[xiv] Pietkiewicz K. Dwór Litewski wielkiego Księcia Aleksandra Jagiełłonczyka (1492 – 1506). S.78.

[xv] Archiwum Główny Akt Dawnych w Warszawie, Konsygnacja dawnych akt wojskowych, dz.85, nr.3. K.36–37.

[xvi] Там жа, K.116.

[xvii] Górski K. Historia jazdy polskiej. S.288.

[xviii] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Zmudzka i wszystkiej Rusi. T.II. Warszawa, 1846. S.318.

[xix] Pietkiewicz K. Dwór Litewski wielkiego Księcia Aleksandra Jagiełłonczyka. S.102.

[xx] Археографический сборник документов, относящихся к истории северо-западной Руси. Т.III. Вильна, 1867. С.214–222.

[xxi] Plewczyński M. Ludzie Wschodu w wojsku ostatnich Jagełłonów. Warszawa, 1995. S.47–52.

[xxii] Археологический сборник документов, относящихся к истории северо-западной Руси. Т.III. С.222–224.

[xxiii] Górski K. Historia piechoty polskiej. S.7–10.

[xxiv] Pietkiewicz K. Dwór Litewski wielkiego Ksiecia Aleksandra Jagiełłonczyka. S.103—104.

[xxv] Акты литовско-русского государства. Вып. 1. С.155–156.

[xxvi] Górski K. Historia piechoty polskiej. S.10–14.

[xxvii] Там жа. S.226–227.

[xxviii] Там жа. S.228–229.

[xxix] Архив Юго-Западной России. Ч.VII. Т.1. Киев, 1886. С.90.

[xxx] Górski K. Historia piechoty polskiej. S.231–232.

[xxxi] Архив Юго-Западной России. Ч.VIII. Т.5. Киев, 1907. С. 472.

[xxxii] Górski K. Historia jazdy polskiej. S.30, 319.

# Над дахамі Віцебска
## *Рамесныя цэхі Беларусі вачыма Марка Шагала*

***Захар ШЫБЕКА***

***(Менск)***

***Вы ніколі не задумваліся, чаму людзі на карцінах сусветна вядомага мастака Марка Шагала (1887—1985), нашага земляка, лятаюць над дахамі? Вядома, гэта алегорыя палёту душы, яе спробы ўзняцца над шэрай штодзённасцю. Але такое тлумачэнне наўрад ці можна лічыць поўным. Матэрыялы фонду Віцебскай рамеснай управы, што захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (ф. 2505), даюць падставу і для больш “матэрыялістычнай” ці “празаічнай” інтэрпрэтацыі Шагалавых карцін. Зрэшты, месца для ідэалізму ў кожным разе застаецца. Можа, гэта Божы дар дазваляе ў звычайных зямных з’явах бачыць узнёслае?***

У 1893 г. у рамеснай вытворчасці Віцебска быў заняты 2191 чалавек.. ¾ рамеснікаў складалі гэбраі. Пятая частка віцебскіх гэбраяў жыла рамёствамі. Магчыма, не самымі *HiTech*-заняткамі, якія можна было ўявіць нават тады, але ж спажыўцам яны прыносілі задавальненне... Традыцыйнае рамяство жыве ў іншым маштабе часу, чым высокія тэхналогіі, — але хто сказаў, што яно не мае права на існаванне? У 1898 г., тады ж, калі ў горадзе з’явілася электрычнасць і быў пушчаны трамвай, віцебскія рамесныя майстры якраз засвоілі вытворчасць парасонаў. Яны былі таннейшыя за прывезеныя, а таму хутка ўвайшлі ў штодзённы ўжытак гараджанаў. Можа, таму на ранніх (і не толькі) малюнках Шагала так часта сустракаюцца парасоны. Ён любіў вяртацца да навінаў свайго маленства.

У Віцебску ў пачатку XIX ст. было каля 8 тысячаў дамоў. У параўнанні з хрысціянамі гэбрайскія рамеснікі Віцебска мелі менш уласных дамоў. Дынамічны характар жыцця не спрыяў гэтаму. У пошуках заробкаў гэбраі часта мянялі месца жыхарства, пераязджалі з кірмашу на кірмаш, вандравалі па вёсках. Яны не былі так моцна прывязанымі да “роднага кута”, як беларускія сяляне. Архетып спрадвечнага гэбрайскага вандроўніка, відаць, доўга не даваў спакою і Марку Шагалу.

Маленства будучага маэстра прайшло сярод гэбрайскіх рамеснікаў Віцебска. А яны, як ні парадаксальна, не заўсёды хадзілі па зямлі. 8 тысячаў дамоў, а комінаў яшчэ больш. Усе гэтыя коміны трэба было рэгулярна чысціць камінарам, а дахі крыць і рамантаваць страхарам. Не выключана, што тыя “дахавыя людзі”, якія займаліся крыху загадкавай, крыху рамантычнай працай, падказалі мастаку яго “паветраныя” сюжэты. Камінары і страхары, што праводзілі ледзь не палову жыцця на дахах, нібыта “лёталі” ў небе. У кожным разе так магло падацца уразліваму, схільнаму да фантазіяў маленькаму Марку. Ён мог бачыць лятаючых людзей штодзень.

Рамеснікі Віцебска, як і іншых беларускіх гарадоў, аб’ядноўваліся ў цэхі. Цэхі ўзніклі ў Беларусі яшчэ ў XV ст., услед за ўвядзеннем магдэбургскага права. Але вытворчая неабходнасць у іх у часы дзяцінства Марка Шагала даўно мінула з пашырэннем выкарыстання машын і паравога рухавіка, і ўрэшце, з татальнай рацыяналізацыяй і

аўтаматызацыяй усяго тэхналагічнага працэсу. У Францыі цэхавы лад быў скасаваны ў канцы XVIII ст., у Германіі — у сярэдзіне XIX. Толькі ў Расеі цэхі дажылі да таго часу, калі Генры Форд запусціў першы канвеер. Так доўга яны ўтрымаліся перадусім таму, што выконвалі функцыю фіскальных і паліцэйскіх органаў у дачыненні рамеснікаў (найперш да гэбрайскіх), якія часам бунтавалі і ўнікалі падаткаў. Ды гэбраі і самі трымаліся за цэхавую арганізацыю, асабліва на ўсходзе Беларусі. Толькі годнасць цэхавага майстра дазваляла гэбраю-рамесніку працаваць па-за межамі гэбрайскае рысы аселасці. Самы блізкі да абедзвюх імперскіх сталіцаў з буйных гарадоў заходніх губерніяў, Віцебск быў натуральным "плацдармам" гэтай ціхай гэбрайскай экспансіі ў Расею.

У працах савецкіх гісторыкаў замацавалася традыцыя паказу цэхавай арганізацыі толькі з негатыўнага боку, нібыта яна ўяўляла сабой нейкую недарэчнасць, параджэнне феадальнага дэспатызму. У савецкай мастацкай літаратуры пераважае вобраз рамесных вучняў — маленькіх пакутнікаў. Але насамрэч ці ўсё было так адназначна?

Да пэўнага моманту цэхі, таксама як магдэбургскае права і мястэчкі, лучылі нас з цывілізаваным Захадам і розніла ад Маскоўскай дзяржавы, дзе цэхі заснаваў толькі Пётр I у 1722 г. Цэхі былі часткай карпаратыўнага феадальнага грамадства, дзе эканамічны прагрэс мог трымацца толькі на павышэнні арганізаванасці працы. Рыцары ваявалі, святары маліліся Богу, сяляне і рамеснікі працавалі, а купцы забяспечвалі ўзаемаабмен прадуктамі дзейнасці ўсёй супольнасці. Цэхі ў гэтай сістэме займаліся арганізацыяй вытворчасці прыладаў працы і прадметаў побыту. Яны наладжвалі прафесійную адукацыю, рэгламентавалі вытворчасць і рынак збыту, гарантавалі якасць вырабаў, займаліся дабрачыннасцю, а пры ўзнікненні знешняй небяспекі абавязваліся са зброяй, выпраўленай уласным коштам, абараняць сцены роднага гораду.

Вучняў сапраўды прымушалі празмерна працаваць, строга каралі, нярэдка ўжывалі брутальны гвалт. Хлопчыкі часта ўцякалі ад майстраў-дэспатаў куды вочы глядзяць. Аднак, у рэшце рэшт, той, хто вытрымліваў, станавіўся адмысловым майстрам, а хто ўцякаў, заставаўся недавукам, "партачом". Разумеючы гэта, бацькі ставіліся да пакарання іх дзяцей цярпліва. Рамеснікі заўжды здабывалі кавалак хлеба праз вялікае напружанне сілы. Культ працы сярод іх быў самым пачэсным. Гэты культ і Марка Шагала зрабіў сусветна вядомым майстрам.

У ВКЛ цэхі непасрэдна апелявалі да вялікага князя, ад якога імкнуліся атрымаць пацверджанне сваіх статутаў. Паводле Канстытуцыі 3 траўня 1791 г. прадстаўнікі гарадоў (фактычна менавіта цэхавай старэйшчыны) нарэшце атрымалі прадстаўніцтва ў сойме Рэчы Паспалітай. Але падзелы гвалтоўна перапынілі працэс палітычнай і эканамічнай эмансіпацыі "трэцяга саслоўя", які паспяхова прайшоў на Захадзе. У Беларусі канца XIX — пачатку XX ст. цэхі выкарыстоўваліся, пераважна каб рэгуляваць дачыненні дзяржавы з гэбрайскай грамадой, былі, у сутнасці, інструментам дыскрымінацыі гэбраяў. Зрэшты, і ў новых умовах рамеснікі вучыліся выкарыстоўваць цэхі дзеля абароны сваіх інтарэсаў, як бы паўтараючы шматвяковую гісторыю барацьбы заходнеўрапейскіх гараджанаў супраць сваіх сеньёраў. Назіралася паступовая трансфармацыя цэхаў у сучасныя прафсаюзы. Яны выступалі, калі трэба, і касамі ўзаемадапамогі, і страйкавымі камітэтамі. Рознаэтнічны склад рамеснікаў мог быць перашкодай дзеля паразумення, але да 1895 г. цэхі ў Віцебску строга падзяляліся на іудзейскія і хрысціянскія. У 1890 г. з 27 цэхаў гораду 17 былі гэбрайскімі, а 10 хрысціянскімі. У 1898 г. застаўся 21 цэх: 7 хрысціянска-гэбрайскіх, 5 хрысціянскіх і 9 гэбрайскіх. Сярэднявечная традыцыя падзелу цэхаў паводле нацыянальна-

канфесійнага складу ў канцы XIX ст. захавоўвалася толькі ў Віцебску і Веліжы. Трываласць іудзейскіх цэхаў толькі спрыяла росту нацыянальнай кансалідацыі гэбраяў. Здаецца, не будзе перабольшаннем сказаць, што падоўжанае жыццё рамесніцкіх цэхаў умацавала нацыянальную сведамасць Шагала і, урэшце, дала сілы для пераадольвання касмапалітычнага супрэматызму. Нацыянальным гэбрайскім мастаком Марка Шагала зрабіў “стары добры” цэхавы Віцебск.

Быў час, калі і ў жыцці этнічных беларусаў цэх адыгрываў значную ролю. Магілёўскія шаблі і пальчаткі майстроў-хрысціянаў некалі ішлі на экспарт у заходнееўрапейскія краіны. Асобныя цэхі, напрыклад ювелірныя (злотніцкія), былі нагэтулькі эканамічна магутнымі, што фундавалі мастацтва, кнігавыданне праваслаўных брацтваў. Але ў другой палове XVII ст. беларускія цэхі занепадаюць. Падчас жахлівай вайны 1654—1667 гг. з Маскоўскай дзяржавай значная колькасць беларускіх рамеснікаў трапіла ў палон. Расселеныя ў Маскве, яны ўтварылі цэлае гарадское прадмесце — Мяшчанскую слабаду. І так было ў шмат якіх расейскіх гарадах. Маскоўскія захопнікі бралі ў палон не іудзеяў, а хрысціянаў з разлікам, што іх працей асіміляваць. Пасля маскоўскае навалы беларускае рамяство так і не змагло адрадзіцца. А ў гарадах Беларусі дамінаванне атрымалі гэбрайскія рамеснікі. Хрысціянскія цэхі ў нейкай ступені баранілі беларусаў ад канкурэнцыі з боку больш зваротлівых гэбраяў, але, з пашырэннем рынкавых дачыненняў, гэта не дапамагала. Перамагаў спрытнейшы.

Былі сярод спрытнейшых і прадстаўнікі іншых народаў. У склад кандытарскага цэха прабіваліся турэцкія падданыя. З гэбрайскімі кандытарамі ў Віцебску паспяхова канкурыравалі Кадыр Эфендзі і ягоны сын Махмуд Эфендзі-Муфці-Аглы. Яны былі лепшымі сябрамі віцебскай дзятвы. Магчыма, у “Канстанцінопальскай” булачнай (традыцыйная назва, пашыраная і ў іншых беларускіх гарадах) бываў і тагачасны гадаванец віцебскага хедэра Марк Шагал.

Калі будучаму майстру было 15 гадоў, цэхавая арганізацыя ў Віцебску і ўвогуле гарадоў Беларусі знікла. Паводле царскага ўказу 1902 г. усе цэхі на тэрыторыі Расейскай імперыі ліквідаваліся, а іхная маёмасць перадавалася органам гарадскога кіравання. У перыяд індустрыялізацыі гэта было непазбежнасцю. Функцыі цэхаў бралі на сябе вытворчыя фірмы, прафсаюзы, дабрачынныя і крэдытныя таварыствы, творчыя саюзы, прафесійныя навучальныя ўстановы і іншыя грамадскія і дзяржаўныя арганізацыі. Праўда, нельга сказаць, што мы ад знікнення цэхаў нічога не страцілі.

Былая структурызаванасць грамадства знікла, не пакінуўшы нам інстытутаў-пераемнікаў. Сучасная грамадзянская супольнасць і разгалінаваны *трэці сектар* Захаду сваімі каранямі сягае сярэднявечнай цэхавай арганізацыі. У нас жа захаванню такой пераемнасці не спрыяў ані царызм, ані бальшавізм, ані фальшывае разуменне “нацыянальнага”, зведзенага да статычнага ўзнаўлення стэрэатыпаў думак і паводзінаў ніжэйшых пластоў прыгоннага (пазней калгаснага) сялянства. У значнай ступені з гэтай прычыны наша сучаснае насельніцтва мала нагадвае цывілізаванае грамадства. Бракуе пачуцця салідарнасці, належнасці да пэўнай прафесіі, карпарацыі, гарадской камуны, сямейнай традыцыі — у выніку адсутнічае і грамадзянская пазіцыя.

Амаль не відаць у нашых музеях шыльдаў рамесных майстэрняў, прыгожых атэстатаў на годнасць рамесных майстраў, цэхавых харугваў, пячатак, гербаў, званочкаў, срэбных уладных знакаў рамесных старшыняў і шмат чаго іншага. Рэдка можна ўбачыць сучасныя версіі такой атрыбутыкі ў нашых грамадскіх аб’яднаннях і камерцыйных фірмах. А здарылася так у значнай ступені таму, што гэты пласт

культуры не быў своечасова і дастаткова вывучаны, асэнсаваны і эстэтызаваны — і, як вынік, не ўведзены ў “другасны абарот”, не выкарыстоўваецца сучаснымі беларускімі вытворцамі як крыніца натхнення, камерцыйнай вобразнасці, прамысловай эстэтыкі.

Слабая канкурэнтаздольнасць нашых тавараў тлумачыцца, апроч іншага, і стратай памяці пра рамесныя цэхі, пра цэлы пласт гарадское культуры, апеты Пэнам ды Шагалам. Гэтую памяць трэба ўзнаўляць. Толькі тады будзем усведамляць еўрапейскае паходжанне нашай беларускай спадчыны і лепш разумець талент Марка Шагала — сымбалю нашае далучанасці да сусветнае гарадское цывілізацыі.

***Захар ШЫБЕКА (Менск)***
**zachar@urbis.lingvo.minsk.by**

# Пад патранатам Святога Мікалая
# Віцебскія цэхі ў дарасейскі перыяд.

***Анатоль ЦІТОЎ***
***(Менск)***

Бурлівая гісторыя Віцебска, блізкасць яго да дзяржаўнае мяжы не маглі спрыяць захаванасці архіўных дакументаў. Наяўнасць рамесных брацтваў у горадзе фіксуецца даволі позна — галоўным чынам у першай палове XVIII ст. Гэта, праўда, не выключае магчымасці існавання рамесных і купецкіх аб'яднанняў у больш раннія часы.

**1. АБ'ЯДНАНЫ МЫДЛЯРСКА—КУРНІКОЎСКА—ФАРБАВАЛЬНА—КАНВІСАРСКІ ЦЭХ.**

Першае наданне яму статуту дакументальна фіксуецца 20 сакавіка 1676 г. Адпаведна з ім, быў створаны цэх мыдляроў і крамнікаў. Усе майстры, што далучыліся да гэтага брацтва, мусілі даць "на залажэнне" скрынкі, сродкі з якой ішлі на агульныя патрэбы, па 20 злотых. Цэх меў свае харугву, бубен і "усялякую армату", з якімі братчыкі, разам з другімі цэхамі ўдзельнічалі ва урачыстасці на свята Божага цела. Наступнае зацвяржэнне цэха, ў якім аб'ядналася ўжо не дзве, а больш спецыяльнасцяў, адбылося "ў годзе 1738 месяца снежня 12 дня". Тады ж мела месца і паўторнае наданне статуту. Ён налічваў 14 артыкулаў, якія прадпісвалі "на новае лета рускае" (паводле праваслаўнага календара –А.Ц.) абіраць чатырох старэйшых пасродку людзей добрых, аселых. З іх двое ставіліся захавальнікамі ключоў ад цэхавай скрынкі. Рамеснікі выконвалі "цэхавую павіннасць" у брацкай царкве Св.Мікалая, "ў рынку". Па прыкладу іншых цэхаў братчыкі мелі сваю харугву і "паводле магчымасці" вайсковы рыштунак. Разам з іншымі цэхамі яны ўдзельнічалі ва ўрачыстай працэсіі пад час свята Божага цела .

**2.АБ'ЯДНАНЫ ПЕКАРСКА — АЛЕЙНІЦКА — РЫБАЦКА — ЛІНЯРСКА — (ВЯРОВАЧНА) — ВОСКАБОЙНІЧА — СВЕЧНІКОЎСКА — ПЕРАКУПНІЦКА — КРУПНІЦКА – МАЛЕЎНІЦКА — ТКАЦКА — КРУХМАЛЬНІКОЎСКА — ШАПАВАЛЬНЫ ЦЭХ.**

Яго статут зацвержаны "у годзе 1738 месяцы снежні 12 дня". Дакумент налічваў 14 артыкулаў, якія прадпісвалі "на новы год рускі" абіраць чатырох старэйшых, з якіх двум перадавалі на захаванне ключы ад цэхавай скрынкі. Братчыкі выконвалі "цэхавую павіннасць" у царкве Св. Мікалая, "ў рынку". І гэтыя рамеснікі мелі сваю харугву, мусілі "паводле магчымасці" мець вайсковы рыштунак і разам з іншымі цэхамі прымаць ўдзел ва ўрачыстасці на Божае цела .

**3. АБ'ЯДНАНЫ РЭЗЧЫЦКА – СТАЛЯРСКА — СТЭЛЬМАХОЎСКА—ЦЯСЕЛЬСКА — БАНДАРСКА --- ШКЛЯРСКА -- СІТНІКОЎСКІ ЦЭХ.**

Прывілей на стварэнне цэху атрыманы "ў годзе 1738 месяца снежня 12 дня" ад караля Аўгуста III. Паводле дакуманту, рамеснікі абіралі чатырох старэйшых "на новае лета рускае". Братчыкі спраўлялі агульнае набажэнства і мелі "цэхавую павіннасць" у царкве Св.Мікалая, "ў рынку лежачай". Старэйшым рамёстваў, якія ўваходзілі ў цэх, і ўсяму цэху увогуле дозвалялася "мець харугву (як агульную, так і асобную, для кожнае спецыяльнасці) [...] на аздобу места [...] рыштунак (узбраенне—А.Ц.) ведлуг магчымасці"

і пад час фэсту Божага цела, на загад магістрата ўдзельнічаць ва ўрачыстай працэсіі. Дакумант унесены ў ратушныя актавыя кнігі “ў годзе 1760 месяца чэрвеня 17 дня”.

**4. АБ’ЯДНАНЫ САЛАДОЎНІЧА—ПІВАВАРНА—ВІНАКУРНЫ ЦЭХ.**

Створаны па прашэнню мяшчанаў. Статут атрымаў “у годзе 1738 месяца снежня 12 дня”. Ён налічваў 14 артыкулаў, якія загадвалі “на новае лета рускае” абіраць чатырох старшых. З іх двое атрымоўвалі пасаду захавальнікаў ключоў ад цэхавай скрынкі. Братчыкі выконвалі “цэхавую павіннасць” у царкве Св.Мікалая, “ў рынку”. На ўзор іншых цэхаў рамеснікі мелі сваю харугву і ім дазвалялася, нават прадпісвалася “паводле магчымасці” мець вайсковы рыштунак. Разам з іншымі цэхамі яны прымалі ўдзел ва ўрачыстасці на Божае цела.

**5. КУПЕЦКІ ЦЭХ.**

Стыхійная кансалідацыя віцебскіх мяшчанаў супраць канкурэнтаў адбывалася ўжо ў сярэдзіне XVI ст., калі жаловали (скардзіліся) бурмистры райцы и всё поспольство, каралю праз свайго ваяводу кн. Збаражскага, аб тым што «купцы приежаючие до того места Витебского» гандлююць паміж сабой. Ад гэтага віцяблянам великая шкода деет. Сваім лістом году 1559 месяца верасня 20 дня кароль пастанавіў, што забараняецца прыезжым купцам з иншими торговати только з местичи витебские. Наданне прывілею на стварэнне “Купецкай ізбы” (брацтва) адбылася ў годзе 1738 месяца снежня 12 дня. У статуце налічвалася 14 артыкулаў, ён пачынаўся са скаргі мясцовых мяшчанаў і купцоў, якія “ў купецтве і гандлях не маюць парадку”, паколькі “прыезжыя людзі, аселыя ў розных юрыдыках у месце і на прадмесцях і за местам” захапілі ўсялякі гандаль “вольны, водны і партовы”. У сувязі з гэтымі абставінамі віцебскія купцы і мяшчане “прыйшлі да вялікага ўбоства і згубы”. Адпаведна з апошнім статутам, ніхто ня меў права гандлю ў Віцебску, покуль не “ўпішацца” да “Купецкай ізбы” і не прыме прысягу. Парушальнік губляў свой тавар: палова ішла на прыбытак дзяржаўнаму скарбу, другая – Купецкай ізбе. Брацтва было ўладкавана наступным чынам – генеральная сходка адбывалася на дзень Св.Мікалая, калі абіралі шасцярых старэйшых купцоў, якія ўзначальвалі цэх на працягу трох гадоў (і, на ўсялякі выпадак, аднаго “рэзервовага”, калі нехта з абраных датэрмінова па аб’ектыўных ці суб’ектыўных прычынах страціць свае паўнамоцтвы). Купецкія сходкі праводзіліся штоквартальна і пачыналіся а восьмай гадзіне раніцы. Таго, хто праігнараваў гэтае мерапрыемства, чакаў штраф у 24 грошы. Старшыні мусілі абавязкова мець свае нарады, якія праводзіліся “па справах купецкіх” двойчы на тыдзень – па аўторках і чацвергах а дзевятай гадзіне. Той, хто не з’явіўся на такую нараду, мусіў заплаціць штраф у шэсць грошай, а хто б асмеліўся на гэты час, без слушнай прычыны, з’ехаць з места, плаціў дзве капы грошай. Артыкул 12 статуту агаворваў, што “для спраў пры скрыні купецкай [трэба мець – А.Ц.] агульную пячатку купецкую з выявай герба – Св. Мікалая, для пячатавання тавараў, калі госць з госцем гандляваў... і ў іншых купецкіх справах...” .

**6.РЭЗНІЦКІ ЦЭХ** — статут пакуль не знойдзены. Ускосныя звесткі дазваляюць меркаваць, што ён існаваў ужо ў 1700 годзе. Так ў справе паміж віцебскімі рэзнікамі і тутэйшымі манахамі бернардынамі, фігуруюць, пісьмовыя абавязкі братчыкаў (ад гэтага году) пастаўляць сала для лампады Св.Антонія ў Бернардынскім саборы, якое яны не выконвалі. Рамеснікі давялі ў судзе, што гэты дакумент не з’яўляецца праўдзівым і сфальшаваны манахамі. Праўда, нідзе ў справе яны не заяўляюць, што цэх ў гэты час яшчэ не існаваў. Мясцовы магістрат ў 1776 г. падтрымаў ў гэтай справе братчыкаў і вынес дэкрэт на іхнюю карысць. Ў другім дакуменце, ад году 1771 сакавіка 16 дня, рэзніцкія цэхмістры Дзімітры Бык і Амельян Лерка выступаюць

супраць канкурэнтаў – віцяблянаў, якія “куплялі быдла, з яго мяса салілі і прадавалі, а з таго салення і продажу падаткі не плацілі”. Нават шляхетныя Пётра і Казімір Дыманы “ў кадках пасаліўшы мяса хацелі сплаўляць яго ў Рыгу”.

***Анатоль ЦІТОЎ***
***(Менск)***

# ДЗЕ МАЛІЛІСЯ ВІЦЕБСКІЯ МАЙСТРЫ?

## лакалізацыя царквы св. Мікалая, “ў рынку лежачай”.



*Ўвядзенская (Мікольская?) царква на “чарцяжы Віцебска” 1664 году.*

Пра тое, што ў сярэднявечным Віцебску, апроч шырока вядомай Уваскрасенскай-Рынкавай царквы існавала яшчэ адна царква, якая магла таксама лакалізавацца “у рынку” і мець дачыненне да цэхавых арганізацыяў, вядома паводле “чарцяжа Віцебска” 1664 году. Гэта была драўляная Ўвядзенская царква, якая месцілася на поўнач ад ратушы[1]. Ці не мела гэтая царква другую назву, у гонар Св.Мікалая? Прыклад падвоенай назвы храмаў – не адзінкавы для Віцебска, дзе існавала, напрыклад, Сімяонаўская царква, вядомая таксама як Багаяўленская.

У 1775 г. Увядзенская царква была разабраная пад час генеральнай перабудовы Рынкавай плошчы[2]. (Паводле іншых крыніцаў, яна згарэла ў канцы XVIII ст.) У 1798 годзе па фундацыі віцебскіх купцоў Фамы і Марыі Глінскіх за Віцьбай, на Кстоўскай гары, была пабудаваная новая невялічкая мураваная царква ў гонар Св.Мікалая, куды і былі перанесеныя ўсе рэгаліі, а таксама пераведзеныя парафіяне былой Увядзенскай царквы, і ўжо яна ў Новым часе патранавала цэхавыя арганізацыі гораду. Як сцвярджае А.М.Семянтоўскі, ў сярэдзіне XIX ст. ў царкве меўся старажытны абраз Св.Тройцы, які належаў шавецкаму цэху [3]. Семянтоўскі жа згадвае, што другой назвай Мікольскай-Завіцьбенскай царквы была Ўвядзенская. Яшчэ раней, у пераліку ўніяцкіх цэркваў Віцебскага дэканату за 1805 г. Мікольская царква фігуруе як Wowedenska, z muru[4]. Аднак з вышэйпададзеных фактаў мы ведаем, што ранейшая Ўвядзенская царква была драўлянай і ў гэты час ужо не існавала.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што патранальнай царквой для віцебскіх цэхаў у XVII – XVIII ст. была Ўвядзенская-Мікольская “у рынку”, а ў канцы XVIII – XIX ст. Мікольская- Ўвядзенская на Завіцьбенскай слабадзе.

**Ігар ЦІШКІН (Віцебск)**


[1] Чарняўская Т.І. Архітэктура Віцебска. Мн., 1980. С.16.
[2] Кулагін А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі. Мн, 2001. С. 232.
[3] Сементовский А.М. Витебск. Статистический очерк // Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год. СПб, 1865.
[4] ЦДГА РФ у Пецярбургу. Ф.823, воп.3, спр.1289, арк.227.

# НОВЫЯ КНІГІ

***CASTRUM, URBIS ET BELLUM. Зборнік навуковых прац, прысвечанных памяці прафесара Міхася Ткачова. Баранавічы, 2002. – 422 с. Наклад 500 асобнікаў.***

Гэты навуковы зборнік, пад рэдакцыя к.г.н. Генадзя Семенчука і к.г.н. Андрэя Мяцельскага, аб'яднаў спецыялістаў па сярэднявечнай і навачаснай гісторыі, археалогіі і культуры Беларусі і суседніх краінаў — Польшчы, Літвы і Латвіі. Ён прысвечаны памяці праф. Міхася Ткачова, якому сёлета споўнілася б 60 гадоў, але мы адзначаем 10 гадавіны яго смерці. Менавіта кола навуковых праблемаў, якімі займаўся М.Ткачоў, вызначыла тэматыку прадстаўленых артыкулаў. Гэта — ваенная гісторыя, генезіс гарадоў і замкаў, гарадская і замкавая культура Беларусі і суседніх краінаў ад X да XIX стст. У зборніку змешчана поўная бібліяграфія прац прафесара М.Ткачова і ягоны раней нідзе не друкаваны артыкул пра Чачэрск.

У зборніку чытач знойдзе тэксты пра гатычныя строі жыхарства Беларусі, інфармацыйна-выведную службу ў ВКЛ у сярэднявеччы, структуру войска ВКЛ у другой палове XIУ—XV стст., раннюю павезу (форму шчыта), гісторыю ментальнасці беларускага мяшчанства ў XVI—XVII стст. (на прыкладзе Магілёва), мястэчкі Крычаўскага староства, род муляра Горадзенскага замку канца XVI ст. Антонія дэ Кгрыпа, стаўленне насельніцтва Полаччыны да палітыкі дзяржаўнай улады пад час Інфлянцкай вайны, уплывы нямецкай готыкі на архітэктуру Беларусі, удзел Мацея Стрыйкоўскага ў Інфлянцкай вайне. Археалагічны блок прадстаўлены артыкуламі пра раннесярэднявечныя матэрыялы з раскопкаў Мікольскага селішча, Ніжні замак ў Віцебску, невядомы помнік беларускага Рэнесансу з Віцебску, замак Белы Ковель у Смалянах, генезіс і функцыянальнае прызначэнне раннесярэднявечных умацаваных паселішчаў Беларусі. Таксама цікавымі падаюцца кантраверсыйныя артыкулы літоўскіх гісторыкаў і археолагаў пра адмаўленне сталічнасці Навагрудка ў пачатковай гісторыі ВКЛ і лакалізацыю Міндоўгавага замку Варута на гарадзішчы Шаймінішкеляй.

Навуковы зборнік “Castrum, Urbis et Bellum” можна набыць у г.Мінску ў кнігарні “Акадэмкніга”, у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі ў аддзеле сярэднявечнай археалогіі, у сядзібах БНФ і ТБМ; у г. Горадні на кафедры археалогіі і этналогіі Горадзенскага дзяржаўнага універсітэту імя Янкі Купалы. У Магілёве – на кафедры археалогіі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэту імя Аркадзя Куляшова.

У канцы неабходна прызнаць, што па вялікай недарэчнасці і віне навуковых радактараў у назве зборніка атрымалася прыкрая памылка: слова “urbis“ павінна было гучаць, як “urbs“. Усім чытачам і аўтарам прыносім свае прабачэнні.

***Г. С., А. М.***

## "*Краіна Беларусь: ілюстраваная гісторыя*".

Новая, у чымсьці сенсацыйная, 320-старонкавая кніга прадстаўляе папулярную версію гісторыі нашай краіны ад глыбокай старажытнасці да 1918 г. У кнізе, надрукаванай у славацкай друкарні Neografia, больш за 1800 ілюстрацый, з іх амаль палова каляровыя, - у тым ліку летапісныя мініятуры, сярэднявечныя гравюры, рэдкія фотаздымкі - многія з якіх дагэтуль невядомыя не толькі паспалітаму чытачу, але і прафесійным гісторыкам.

Гэта найбольш радыкальная спроба пашырыць візуальную прастору беларускай гісторыі, і, кажучы шырэй, беларускай культуры ці не за ўсю амаль 500-гадовую гісторыю нашага кнігадрукавання. Дагэтуль найлепшым выданнем падобнага кшталту была "Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі" выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя". Але колькасць працы па выяўленню і сістэматызацыі каштоўнага ілюстратыўнага матэрыялу, пошуку форм яго падачы, выдаткаваная творчым калектывам (аўтар тэксту - Уладзімір Арлоў, мастак Зміцер Герасімовіч, кансультант па падборы ілюстрацый – Алесь Белы. рэдактар тэксту – Зміцер Санько), укладзеная ў гэты праект, у шмат разоў перавышае ўсе папярэднія аналагі. Дагэтуль мы маглі толькі марыць пра такое даступнае, пераканаўчае, цікавае асвятленне айчыннай гісторыі – а значыць, і пра шырокую, на ўзроўні "паспалітага" чалавека вядомасць хаця б асноўных вех і персаналій гэтай гісторыі, без чаго немагчымая самаідэнтыфікацыя чалавека як належнага да культуры незалежнай еўрапейскай краіны.

Праца над гэтым праектам ішла больш за 2 гады і зазнала шмат цяжкасцяў. У цывілізаваных краінах гістарычныя выявы, патрэбныя для кніг такога кшталту не толькі падрабязна апісаныя і каталагізаваныя, але і сабраныя ў даступныя як даследчыкам, так і выдаўцам навуковых і папулярных выданняў графічныя зборы (picture libraries). Менавіта гэта робіць на Захадзе параўнаўча лёгкай справай выданне маляўнічых і інфарматыўных кніг для шырокага чытача (так званых fact books) па розных перыядах і аспектах гісторыі -- кнігі выдавецтваў Dorling Kindersley, Usborne Publishing, Tessloff Verlag і інш. "Замак", "Вікінгі", "Рымляне", "Гісторыя сярэдніх вякоў", "Крыжакі" і г.д. – з'яўляюцца ў рускім перакладзе адна за адной і, між іншым, карыстаюцца шырокай папулярнасцю і на нашым рынку. Не з'яўляецца праблемай і пошук "таліновых" кансультантаў з шырокім позіркам не толькі на сваю спецыфічную тэматыку, але і на сумежныя гістарычныя дысцыпліны – археолагаў, нумізматаў, мастацтвазнаўцаў, картографаў, спецыялістаў па гісторыі розных аспектаў матэрыяльнай культуры і г.д. Карацей, звычайна такія кнігі – плён добра скаардынаванай працы вялікіх аўтарскіх калектываў. У сённяшняй Беларусі такая зладжаная праца лепшых даследчыкаў з шэрагу розных прычынаў амаль немагчымая. Хочацца спадзявацца – пакуль што. Таму новая кніга, зробленая амаль на чыстым энтузіязме, заслугоўвае ўвагі і пашаны чытача. Нельга не сказаць добрага слова і ў адрас англійскай фірмы Angloproject Corporation Limited, чыё шчодрае фундатарства дапамагло забяспечыць друк кнігі на недаступным пакуль што ў нашай краіне паліграфічным узроўні.

Новая кніга ставіць пытанне: ці не надыходзіць пара паруліцца аб якасна новай арганізацыі нашай іканаграфічнай спадчыны? Ці магчымае ў сённяшняй Беларусі існаванне выдавецтва, якое б спецыялізавалася на выпуску падобных кніг – прывабных, змястоўных, непалітызаваных, добра ілюстраваных fact books? Уявім сабе выкананыя ў такім стылі кнігі "Нашы грошы", "Наша шляхта", "Нашы карты", "Наша мова". Шмат кніг такога кшталту, якія асвятляюць розныя аспекты польскай культуры, выдала ўжо ў серыі A to Polska właśnie ўроцлаўскае Wydawnictwo Dolnośląskie – многія з

іх змяшчаюць багата “беларускага” матэрыялу. Ці не надыходіць час і нам “замахвацца” на праекты такога прафесійнага і эстэтычнага ўзроўню – каб адказаць нарэшце сабе на пытанне: а чым уласна ёсць Краіна Беларусь?

***М. К.***